КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 37 (213) ◂ 15 кастрычніка ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ДЗЕЛЯ ЯДНАННЯ БЕЛАРУСАЎ
Стар. 6

**TABULA RASA ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ**

Куранят падлічваюць увосень. Гэты прынцып справядлівы і ў палітыцы. Верасnёўскае апытанне НІСЭПД прадставіла нам такую магчымасць
Стар. 4

**ТУАРЭГ — ГЭТА НЕ «ФОЛЬКСВАГЕН»**

Сяргей Банько, напэўна, адзіны беларус, які апошнім часам быў у гасцях у туарэгаў — народу пустыні Сахара
Стар. 29

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**
Стар. 9–24

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**«ВАЎКІ»: УЦЁКІ З БЕЛАРУСКАЙ ЗОНЫ**

Артыкул Андрэя Расінскага

ГЕАПАЛІТЫКА

# ВЯРТАЙСЯ, МЫ ЎСЁ ДАРУЕМ

*Аксана КОЛБ*

**На брыфінг у Сяргея Нарышкіна, кіраўніка Адміністрацыі расійскага прэзідэнта, прыехалі 25 прадстаўнікоў дзяржаўных і незалежных СМІ Беларусі і Расіі. На працягу крыху больш гадзіны чыноўнік распавядаў пра сутнасць расійска-беларускіх адносін і, наколькі мог, адказваў на пытанні журналістаў.**




Напярэдадні незалежныя журналісты спадзяваліся хаця б на якую-небудзь кардынальную заяву з боку расійскага кіраўніцтва. Накшталт таго, што Расія больш не будзе падтрымліваць злачынны рэжым, выбары не прызнае, калі зноў пераможа Лукашэнка, і ўвогуле, разлічвае ўбачыць новы твар на вяршыні беларускай палітыкі. Сенсацыі не адбылося.

Большую частку свайго выступу Сяргей Нарышкін прысвяціў плюсам беларуска-расійскага супрацоўніцтва. Маўляў, і тавараразварот павялічыўся да 25 мільярдаў долараў, і доля Расіі ў беларускім экспарце складае ад 70 да 90 працэнтаў, і вельмі плённым ёсць супрацоўніцтва ў ваенна-тэхнічнай і гуманітарнай сферах. А яшчэ — Беларусь застаецца для Расіі «самым надзейным і верным партнёрам-саюзнікам», і Расія вельмі спадзяецца на паглыбленне інтэграцыйных працэсаў.

«Мы бясконца шануем супрацоўніцтва з Беларуссю... Важна, каб гэтае супрацоўніцтва мела ўзаемавыгадны партнёрскі і раўнапраўны характар. Мы ўпэўненыя, што такое супрацоўніцтва адпавядае інтарэсам як Расіі і Беларусі, так і інтарэсам насельніцтва нашых краін», — сказаў у прамове Нарышкін. «Менавіта таму нам балюча канстатаваць, што з Мінска апошнім часам гучаць беспадстаўныя папрокі і прэтэнзіі на адрас Расіі. А з пачаткам перадвыбарчай кампаніі ў Беларусі, на жаль, яны нават узмацніліся», — падкрэсліў кіраўнік адміністрацыі Мядзведзева.

Карацей, пра ўсё гэта можна было напісаць яшчэ напярэдадні прыезду ў Маскву. Узнікае пытанне: навошта гэта сустрэча? Зразумела, не ў адказ на прэс-канферэнцыю А. Лукашэнкі для расійскіх журналістаў. І не для таго, каб данесці да беларускіх і расійскіх выбаршчыкаў, што расійскае кіраўніцтва не здраджвае агульным інтарэсам. Тым больш, што тэлекамер на сустрэчы не было (дарэмна адключалі расійскія тэлеканалы), і шырока гэты брыфінг нідзе не асвятляўся.

Дык нашто? Ускосна адказ на гэта пытанне і агучаны Нарышкіным. Справа ў тым, што бліжэйшым часам асабіста Мядзведзеў з Лукашэнкам сустракацца не збіраецца. Але пасля ўсіх заяў і абвінавачванняў і пагаршэння ўзаемаадносін, пазіцыю расійскага кіраўніцтва трэба было неяк да Лукашэнкі данесці. Вось і данеслі.

А пазіцыя гэта вельмі простая. Па-першае, «выбары — унутраная справа Беларусі», і Расія не будзе ў гэта ўмешвацца, хаця ёй і не ўсё роўна, «які выбар зробіць беларускі народ». Але адносіны да вынікаў гэтых выбараў будуць вызначацца «ступенню адпаведнасці выбараў і выбарчай кампаніі нормам перш за ўсё беларускага заканадаўства і агульнапрынятым міжнародным дэмакратычным нормам».

Па-другое, нягледзячы на ўсю негатыўную рыторыку беларускага прэзідэнта, расійскае кіраўніцтва гатовае да далейшага плённага супрацоўніцтва. Для гэта трэба ўсяго толькі «ўсведамленне беларускім кіраўніцтвам няслушнасці тых крокаў па дыскрэдытацыі беларуска-расійскіх адносін... згубнасці той палітыкі ў адносінах да Расіі»... «І калі гэта ўсведамленне адбудзецца і на словах, і на справе», кантакты будуць працягвацца. Аднак расійскае кіраўніцтва не выключае кантактаў з прадстаўнікамі беларускай апазіцыі. Цытую: «З любой апазіцыяй трэба лічыцца... Кантакты з беларускай апазіцыяй магчымыя».

Па-трэцяе, такое непаразуменне ў палітычнай сферы можа вельмі негатыўна адбіцца на эканамічным супрацоўніцтве паміж Расіяй і Беларуссю.

І нарэшце, Мытны саюз — вельмі выгодны для Беларусі. Крытыка ў яго адрас можа гучаць толькі з вуснаў «альбо непрафесіяналаў, альбо палітыканаў».

Што тычыцца пытання адносін расійскага кіраўніцтва да гучных спраў зніклых палітыкаў, то, нягледзячы на тое, што «іх як грамадзян гэта пытанне заўсёды цікавіла», ініцыяваць уласнае расследаванне па фактах, агучаных у фільмах «Хросны Бацька», расійскае кіраўніцтва не будзе. Дарэчы, пра фільмы, аказваецца іх з'яўленне — вынік перапоўненай чары цярпення журналістаў канала НТВ. Хто б сумняваўся.

Вось, бадай, і ўсё асноўнае, што хацеў сказаць Дзмітрый Мядзведзеў Аляксандру Лукашэнку, а заадно і беларускай апазіцыі, і ўсім тым, хто зноў спадзяваўся на тое, што Расія нарэшце паглядзіць на сітуацыю ў Беларусі з іншага боку. Не гэтым разам.

Расіі яшчэ патрэбна Беларусь з Аляксандрам Лукашэнкам. Хаця б таму, што такая Беларусь пакуль пасуе інтарэсам Расіі, такая Беларусь ёсць аргумент у геапалітычнай гульні Расійскай Федэрацыі з Еўрапейскім саюзам і ЗША. Такая Беларусь патрабуе ўсё больш не ўлічаных фінансавых сродкаў, з дапамогай якіх рэжым можна кантраляваць. Расія пакуль не ўбачыла альтэрнатывы — таго кандыдата, які б быў не толькі больш прадказальны, але і адпавядаў бы яе імперскім амбіцыям.

КАНТРОЛЬ

# КАРУПЦЫЯ ЦІ СПОСАБ ВЫЖЫВАННЯ?

**Усе правераныя Камітэтам дзяржкантролю ўстановы адукацыі завысілі кошт і аб'ёмы выкананых рамонтных работ. Як паведамляе прэс-служба КДК, аб'екты Мінадукацыі правераныя на эфектыўнае і мэтавае расходаванне бюджэтных сродкаў, выдзеленых на рэканструкцыю, капітальны і бягучы рамонт.**

Праверка прайшла ў пяці вышэйшых навучальных установах, падведамасных міністэрству, трох аддзелах адукацыі, ва ўпраўленні адукацыі адміністрацыі Заводскага раёна Мінска, КУП «УКБ адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска», а таксама чатырох навучальных установах, якія забяспечваюць атрыманне прафесійнай адукацыі. Устаноўлена, што ва ўмовах неналежнага кантролю заказчыкаў (устаноў адукацыі) падраднымі арганізацыямі на 345,4 мільёна рублёў завышаны кошт будаўніча-мантажных і рамонтна-будаўнічых работ па бягучым і капітальным рамонтах усіх правераных аб'ектаў устаноў адукацыі.

Акрамя таго, устаноўлена, што асобныя будаўнічыя арганізацыі выконвалі аддзелачныя работы без наяўнасці сертыфікатаў адпаведнасці. Некаторымі ўстановамі адукацыі выдзеленыя бюджэтныя сродкі расходаваліся на закупку айчынных матэрыялаў у пасрэднікаў замест набыцця іх непасрэдна ў вытворцаў.

Таксама выяўлены шматлікія парушэнні ўстановамі адукацыі заканадаўства, якое рэгламентуе парадак правядзення таргоў па выбары падрадчыка для выканання рамонтна-будаўнічых работ, а таксама парадак распараджэння дзяржаўнай уласнасцю.

Падчас абследаванняў маёмасці ўстаноў адукацыі выяўлены не прынятыя да бухгалтарскага ўліку аб'екты асноўных сродкаў на 1,7 мільярда рублёў.

Усяго праверкай устаноўлены завышэнні аб'ёмаў і кошту выкананых рамонтна-будаўнічых работ на 498,4 мільёна рублёў, нямэтавае і неэфектыўнае выкарыстанне 1 мільярда рублёў бюджэтных сродкаў, залішняе выкарыстанне бюджэтных сродкаў на 8,5 мільёна рублёў. У выніку праверкі прадухілена незаконнае расходаванне бюджэтных сродкаў на 895,6 мільёна рублёў.

Інфармацыя наконт праверкі з утрыманнем канкрэтных высноў і прапаноў накіравана ў Савет міністраў, паведаміла прэс-служба.

**БелаПАН**

ФЭСТ

# ІВЯНЕЦ СКЛІКАЕ ТАЛЕНТЫ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Заснавальнікам адмысловага фэсту вырашыў вызначыцца Івянец. 16 кастрычніка тут стартуе «Творчы кірмаш», які ставіць на мэце амбітную задачу па выяўленні беларускіх народных талентаў.**

Ладзяць мерапрыемства кандытарская кампанія «Івкон» і Музей традыцыйнай культуры. А яго ўдзельнікамі стануць майстры не толькі з Мінскай вобласці, але і іншых мясцін Беларусі.

Арганізатары маюць намер збіраць людзей, якія ўжо выявіліся як творцы ў нейкім жанры. А далей заахвоціць іншых здатных асобаў далучыцца да фэсту. «Раскрыць у кожным, хто трапіць у гэту атмасферу, нейкую здатнасць і абудзіць памкненне да творчасці, — акрэсліла намеры вядучы спецыяліст па этнаграфіі кампаніі «Івкон» Антаніна Хатэнка. — Неабавязкова ў нейкім відзе мастацтва, які ёсць агульнапрызнаным. У пякарстве, у кухарстве, у апавяданні казак, баек, прымавак. Ва ўспамінах сябе беларусамі».

Мерапрыемства будзе адбывацца на сядзібе Пятра Драгунцава, апошняга пана, які быў у Івянцы да 1939 года. Зараз гэта філія Музея традыцыйнай культуры, які знаходзіцца ў Івянцы. Майстар-класы пакажуць рамеснікі і лозапляценця, і саломапляцення, і рэзьбавання па дрэве, і кавалі. А сам кірмаш збудаваны ў выглядзе тэматычных мікракірмашыкаў. Іх будзе васямнаццаць.

Прынамсі кірмашык кухарства прызначаны ініцыяваць даследаванне забытай беларускай кухні. І прапаноўваць частаванне тым, што ёсць у ёй адметным. Прэзентацыя кнігі «Наша страва» Алеся Белага таксама адбудзецца з адпаведным смакаваннем. Дэманстрацыю сваіх талентаў будуць ладзіць і гаспадары аграсядзібаў.

Юныя мастакі з каледжу імя Ахрэмчыка прыедуць маляваць фрэскі для Івянца. На аснове легенд і паданняў яны будуць рабіць вялікае палатно, каб падарыць мястэчку. Іншыя маладзёны прадэманструюць свае таленты ў гранні на жалейках і дудах.

Спартовыя гульні адбудуцца на кірмашыку дужасці. Мінікірмаш новых ідэй — для тых, хто носіць іх у сабе і не ведае, куды падзець. Будзе і кірмашык этнічнай старызны, скарбашукальнікаў, смехатворчы кірмашык. На вясельным кірмашыку адпаведны абрад пройдзе сапраўдная пара, якая ў гэты дзень бярэ шлюб. А запрошаныя на свята архівісты дапамогуць усім зацікаўленым у даследаванні іх радаводу.

Прыемным сюрпрызам для наведнікаў стане дэгустацыя цукерак. Прычым адмысловая, як гэта мае быць па прынятых канонах. Толькі так можна ацаніць каштоўнасныя рэчывы ў цукерцы. Да прыкладу, не толькі смакуеш салодкае, але перабіваеш смак аліўкамі ці салёнымі гуркамі або лімонам.

Адметнай падзеяй стане для Івянца асвячэнне 16 кастрычніка капліцы побач з сядзібай. Дагэтуль капліца была разбураная, і яе аднаўленне адбылося за кошт сродкаў «Івкона». А ў івянецкім Доме культуры ў гэты дзень ладзіцца традыцыйнае рэгіянальнае свята «Саламяны павук». І там народныя майстры будуць плесці з саломы менавіта гэтых істот.

Што да «Творчага кірмашу», то арганізатары збіраюцца зрабіць яго штогадовым і менавіта восеньскім. «Але калі казаць пра статус самога фэсту, то мы хочам яго пашыраць і зрабіць Налібоцкім кірмашом, — адзначыла Антаніна Хатэнка. — Ахапіць усе рэгіёны, якія прылягаюць да Налібоцкай пушчы: а гэта ўжо некалькі абласцей. Наогул, увесь кірмаш скіроўваецца на тое, каб дастаць з генетычнай памяці тое, кім мы ёсць. І, можа быць, на гэтай аснове з'яднацца».

Цікава, што інтэрнэт-публіка ўжо абмеркавала на форумах івянецкі праект і вынесла свой ухвальны вердыкт: нарэшце з'явіўся супрацоўнік «Дажынкам».

ВЫСТАВА

# ПАКРОЎСКІ КІРМАШ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**У мінскім Палацы мастацтва распачалася 7-я духоўна-асветніцкая выстава «Пакроўскі кірмаш». На ёй можна набыць неймаверныя рэчы і трапіць на самыя разнастайныя культурныя мерапрыемствы.**

Арганізатары выставы-кірмашу — Беларуская праваслаўная царква і выставачнае прадпрыемства «Экспафорум». «Пакроўскі кірмаш» звязаны са святам Пакроваў Багародзіцы, — распавяла супрацоўніца сінадальнага паломніцкага аддзела БПЦ Наталля Закрэўская. — І ўключае ў сябе вялікую колькасць стэндаў удзельнікаў. Але самае галоўнае, што тут праходзяць духоўна-асветніцкія праграмы. Гэта могуць быць і глыбокія духоўныя праграмы, і больш лёгкія для ўспрыняцця. Але ўсё гэта вельмі захапляе і аб'ядноўвае людзей».

Свае экспазіцыі дэманструюць каля 100 удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Ерусаліма і Грэцыі. Манастыры, царкоўныя прыходы, выдавецтвы і майстэрні прапануюць вялікі выбар духоўнай літаратуры, ікон, аўдыё- і відэапрадукцыі, сувеніраў і пачастункаў. На выставе можна знайсці літаральна ўсё — ад валёнак, арэнбургскіх пуховых хустак, вырабаў з лазы і срэбра да лекавых траў, гаючых мазей, поснага шакаладу і тульскіх пернікаў. А ад беларускіх пернікаў і вачэй нельга адвесці. Каляровыя, у выглядзе мілых звяркоў і цацак, яны адразу спыняюць наведнікаў. А вырабляюць гэтыя цуд у храме Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Прылукі. Усе гэтыя рэчы можна набыць, а таксама пакаштаваць кулінарныя вырабы і стравы манастырскай кухні. Праводзяцца падчас выставы і майстар-класы — пляценне з лазы і шыццё з абрэзкаў.




У канферэнц-залі праходзяць сустрэчы са святарамі, насельнікамі манастыроў, іканапісцамі, артыстамі, тэле- і радыёвядучымі, урачамі, пісьменнікамі і паэтамі. Адбываюцца круглыя сталы і семінары, паказы фільмаў, прэзентацыі кніг і паломніцкіх маршрутаў, выступаюць хоры і музыкі. Асобныя праграмы прысвечаныя дзецям. Штодзень з 14 да 17 гадзінаў можна адмыслова сустрэцца са святаром, каб параіцца і задаць хвалюючыя пытанні. На выставе адбываецца і збор сродкаў для дзяцей-сірот і інвалідаў, а таксама на будаўніцтва храма ў Лошыцы.

Удзельнікі адзначаюць, што кірмашы здаўна ладзіліся нашымі продкамі. «На кірмашы заўсёды людзі збіраліся з розных куткоў, — сказала Наталля Закрэўская. — І заўсёды гэта былі сустрэчы. Таму можна сказаць, што «Пакроўскі кірмаш» пад покрывам прасвятой Багародзіцы — гэта месца сустрэч. І шматлікія прадстаўнікі манастыроў з усяго свету сюды прыязджаюць. І людзі тут сустракаюцца паміж сабой — тыя ж мінчане, госці з Расіі і з Украіны. І яны знаходзяць адзін аднаго. І нават можа быць знаходзяць свой шлях і да Бога».

У суботу, 16 кастрычніка, а 12-й гадзіне ладзіць сваю прэзентацыю Грузія. На ёй выступяць прадстаўнікі амбасады гэтай краіны, адбудзецца канцэрт і знаёмства наведнікаў з грузінскімі святынямі.

Падрабязную інфармацыю пра выставу і мерапрыемствы можна атрымаць на сайтах www.pravoslav-expo.by і www.sobor.by (ці па тэл. (017) 273 72 98; 299 82 99). Уваход на «Пакроўскі кірмаш» (вул. Казлова, 3) для ўсіх вольны.

МАЛЫ БІЗНЕС

# НАСУПЕРАК УСЯМУ

**Колькасць малых прадпрыемстваў у Беларусі ў студзені-жніўні 2010 года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася на 7 293, ці на 9,5%, паведаміла прэс-служба Міністэрства эканомікі.**

На 1 верасня знаходзіліся на ўліку 83 674 суб'екты малога прадпрымальніцтва і юрыдычныя асобы. У параўнанні з пачаткам года іх колькасць павялічылася на 5039, ці на 6,4%. Колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў на 1 верасня 2010 года склала 231 741.

У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць ІП узрасла на 13 483 (6,2%), у параўнанні з пачаткам года — на 12 136 (5,5%).

Удзельная вага паступлення ў плацяжоў у бюджэт ад суб'ектаў малога прадпрымальніцтва за студзень-жнівень 2010 года склала 20%, у тым ліку ад юрыдычных асоб — 17,4%, ад індывідуальных прадпрымальнікаў — 2,6%.

**Паводле БелаПАН**

ФАКТ

# ЖЫЦЦЁ СТАНЕ САЛОДКІМ

Ірына БЯГАНКІНА

**У гарадскім пасёлку Круглае Магілёўскай вобласці працягваецца будаўніцтва прадпрыемства па вытворчасці кандытарскіх вырабаў.**

Плануецца, што яно пачне працаваць ужо ў сакавіку 2011 года.

Уласнікам прадпрыемства будзе з'яўляцца сумеснае беларуска-расійскае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Прайд-юніён». Зараз будаўніцтва аб'екта ідзе хуткімі тэмпамі, асобныя пабудовы знаходзяцца на стадыі завяршэння. У выніку павінен атрымацца невялікі комплекс з кандытарскім цэхам, адміністрацыйнымі будынкамі, гаражом і сталовай. Будзе ў прадпрыемства і свая крама.

Кандытарскі цэх плануе выпускаць да 1000 кілаграмаў прадукцыі на дзень. Тарты, пірожныя, рулеты — такі асартымент прадукцыі высокай якасці будуць рабіць у Круглым. Прадукцыю плануюць рэалізоўваць у Беларусі, а частку адпраўляць на экспарт у суседнюю Расію.

У невялікім райцэнтры Круглае, дзе пражывае ўсяго сем з паловай тысяч чалавек, з'явіцца каля 70 новых працоўных месцаў, і мясцовым жыхарам будзе лягчэй знайсці хоць якую-небудзь працу.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПЕРШЫ ПАЙШОЎ!




Photo.ByMedia.Net

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Першы, які пайшоў на прэзідэнта, гэта, канешне, Аляксандр Лукашэнка. За яго новае вылучэнне на прэзідэнта за пяць дзён, калі верыць ягоным паплечнікам, сабрана ўжо 600 тысяч подпісаў. Але першы з апанентаў Лукашэнкі, які сабраў сто тысяч подпісаў за сваё вылучэнне кандыдатам у прэзідэнты, стаў Уладзімер Някляеў.**

Як паведаміла прэс-сакратар Някляева Юлія Рымашэўская, колькасць сабраных подпісаў на раніцу 13 кастрычніка склала 101 312. Збор подпісаў у падтрымку Уладзіміра Някляева будзе працягнуты, заявіла яна.

Што ж, кампанія «Гавары праўду!» і яе актывісты недарма елі свой хлеб. Для іх не прайшлі бессэнсоўна зборы подпісаў за вырашэнне мясцовых праблемаў, за вуліцы Васіля Быкава ў Мінску і ў Гродне, за вылучэнне Някляева дэлегатам на Усебеларускі народны сход. Відавочна, што для кампаніі Някляева збор подпісаў — справа звыклая і звычайная. Хлопцы і дзяўчаты ўжо спрактыкавана сабралі за два тыдні сто тысяч подпісаў грамадзян. Што не можа не ўражваць — кампанія «Гавары праўду!» споўнілася толькі 9 месяцаў!

Між тым, «сталыя» апазіцыйныя партыі і прэтэндэнты ў кандыдаты пакуль што адстаюць ад Някляева. За прэтэндэнта на прэзідэнцтва ад Партыі БНФ Рыгора Кастусёва на 11 кастрычніка было сабрана больш за 45 тысяч подпісаў. За Віталя Рымашэўскага сабрана каля 50 тысяч подпісаў. За Яраслава Раманчука сабрана больш за 70 тысяч подпісаў. Мікалай Статкевіч заявіў, што ў ягоную падтрымку сабрана 45–50 тысяч подпісаў. Але Статкевіч пакінуў выстаўленне пікетаў па зборы подпісаў на апошні тыдзень. У штабах Андрэя Саннікава і Алеся Міхалевіча лічбы пакуль не паведамляюць.

Відавочна, што Някляеў стаўся пэўным лідэрам перадвыбарчай гонкі сярод апазіцыянераў. Але яго могуць напаткаць сур'ёзныя непрыемнасці. 12 кастрычніка Гаспадарчы суд Мінска задаволіў іск Мінгарвыканкама аб пазбаўленні дзяржаўнай рэгістрацыі даследча-асветнай установы «Рух наперад», дырэктарам якой з'яўляецца прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта Беларусі Уладзімір Някляеў. Тым самым Някляева пазбавілі легальнай «крышы», і зараз «Гавары праўду!» можна абвесціць «незарэгістраванай арганізацыяй».

Але гэта не вельмі моцны ўдар. На думку экспертаў, у сувязі з ліквідацыяй «Руху наперад» праблем ва Уладзіміра Някляева як прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта ўзнікнуць не павінна.

Справа ў тым, што пры падачы дакументаў на рэгістрацыю сваёй ініцыятыўнай групы Някляеў у якасці месца працы ўказаў менавіта гэту ўстанову. Аднак, як патлумачыў БелаПАН эксперт у галіне выбарчага заканадаўства юрыст Сяргей Альфер, «адмова ў рэгістрацыі можа адбыцца толькі па прычыне падачы заведама непраўдзівых звестак». Някляеў ж «заведама непраўдзівых звестак» у ЦВК не падаваў — ён указаў дакладныя звесткі на той момант, калі падаваў дакументы на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы. «Акрамя таго, ліквідацыя ўстановы — працэс дастаткова доўгі, і да яго заканчэння Някляеў застаецца дырэктарам «Руху наперад», — дадаў юрыст.

Між іншым, і Цэнтрвыбаркам незадаволены кампаніяй Някляева. «Да нас паступае вельмі шмат зваротаў практычна з усіх рэгіёнаў Беларусі ад грамадзян, якія знаходзяць у сваіх паштовых скрынях друкаваную прадукцыю пра Някляева, выраблену за мяжой», — сказаў сакратар ЦВК Мікалай Лазавік. Ён нагадаў, што агітацыя ў перыяд збору подпісаў забаронена. «Парушэнне заканадаўства ініцыятыўнай групай Някляева відавочнае. Нашы дастаткова ясныя намёкі, што распаўсюджваць агітацыйную прадукцыю нельга, пачутыя не былі», — сказаў ён.

Паводле слоў сакратара ЦВК, за дачасную агітацыю ініцыятыўная група можа быць папярэджана, а ў выпадку паўторнага парушэння заканадаўства — адменена яе рэгістрацыя.

Тым часам не спяць у шапку і іншыя прэтэндэнты на прэзідэнта. Яраслаў Раманчук днямі наведаў Польшчу, дзе меў сустрэчы на высокім узроўні. Ён сустрэўся з міністрам замежных спраў Польшчы Радаславам Сікорскім, старшынёй сената Богданам Барусевічам, кіраўніком парламенцкага камітэта па міжнародных справах Анджэем Халіцкім.

Па выніках сустрэчы Раманчук паведаміў, што прыехаць у Беларусь для назірання за выбарамі плануе вялікая польская дэлегацыя, у якую ўвойдуць члены сената, сойму, а таксама актывісты НДА. «І Сікорскі, і Барусевіч, і Халіцкі сказалі, што калі ў выбарчых камісіях не будзе прадстаўнікоў зарэгістраваных дэмакратычных кандыдатаў, не будзе падліку галасоў, не будзе нармальнай сітуацыі з назіраннем, то падстаў для таго, каб лічыць выбары дэмакратычнымі, у Еўрасаюза таксама не будзе», — заявіў палітык.

Акрамя таго, ён атрымаў завярэнні ў тым, што «праграма Каліноўскага», падтрымка «Белсата» і радыё «Рацыя» польскім урадам будзе працягнутая. Таксама будуць працягнутыя і санкцыі ў адносінах беларускіх чыноўнікаў.

А пакуль прэтэндэнты ў прэзідэнты клапоцяцца пра выбары, беларускія парламентары вырашылі паклапаціцца пра маральнае аблічча беларускай моладзі. 12 кастрычніка на прэс-канферэнцыі ў Мінску старшыня камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Здановіч заявіў пра небяспеку для беларускай моладзі заходняга ладу мыслення.

На думку Здановіча, для сучаснай Беларусі, якая знаходзіцца на стыку ўсходняй і заходняй цывілізацый, сёння важны выбар уласных каштоўнасцяў. «Асноўнай праблемай у сферы выхавання моладзі з'яўляецца тое, што пад уздзеяннем еўрапейскіх каштоўнасцяў на першае месца выходзіць прагматызм, жаданне пры найменшых намаганнях атрымаць як мага больш», — сказаў ён.

«Знешне прывабная ідэя пабудовы дзяржавы на еўрапейскіх каштоўнасцях тоіць у сабе небяспеку страты нацыянальных каранёў», — падкрэсліў Здановіч.

Цікава, чамусьці тая ж Польшча, Літва, Германія, Чэхія з уступленнем у Еўрапейскі саюз не крычаць пра «страту нацыянальных каранёў». Прыкладам, днямі ў Беларусі праходзяць канцэрты польскага танцавальнага калектыву «Мазовішэ». Нават у Беларусі праходзяць нацыянальныя дні краінаў Еўрасаюза.

І чаму жаданне «пры найменшых намаганнях атрымаць як мага больш» з'яўляецца заганным? Што, лепш было б, каб пры «найбольшых намаганнях, атрымлівалі б менш»? Дык тады Здановічу не месца ў парламенце. Хай пойдзе шпалы разгружаць.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МІХАСЬ БАШУРА



У Мінску пачаўся разгляд судовай справы пісьменніка і актывіста грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!» Міхася Башуры. Яго затрымалі яшчэ ў жніўні па абвінавачванню па артыкуле 380 Крымінальнага кодэкса (падробка, выраб, выкарыстанне або збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў), прычым адразу па дзвюх частках гэтага артыкула: часткі першай — падробка дакументаў у мэтах выкарыстання самім выканаўцам і часткі другой — тыя ж дзеянні, здзейсненыя групай асобаў па папярэдняй змове. Быццам бы Башура падрабіў даведку аб прыбытках, каб яго жонка атрымала крэдыт на будаўніцтва кватэры. Башура сваёй віны не прызнае. «Ён сам і абарона адпрэчваюць абвінавачванні ў наўмыснай падробцы даведкі. Мы лічым, што мела месца звычайная памылка: Башура памыліўся ў падліку сваіх прыбыткаў, і гэта так. Разбіраючы справу, мы ўбачылі, што Міхась завысіў свае прыбыткі, але пры атрыманні крэдыту яму было б выгадна, каб прыбыткі былі больш нізкія, а не высокія», — цытуе словы адваката Тамары Сідарэнкі БелаПАН.

Цяпер Міхась Башура знаходзіцца ў следчым ізалятары №1 горада Мінска. Вызвалення Башуры запатрабаваў Саюз беларускіх пісьменнікаў, сябрам якога ён з'яўляецца. Каардынацыйная рада прадпрымальнікаў Мінска заявіла, што лічыць арышт Башуры палітычна матываваным бо ўвесну гэтага года ён вылучаўся ў якасці кандыдата ў дэпутаты Мінскага гарадскога савета ад прадпрымальніцкага блока, а пасля стаў актыўным удзельнікам кампаніі «Гавары праўду!» пад кіраўніцтвам прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта Беларусі Уладзіміра Някляева.

### МІХАІЛ МАРЫНІЧ



Photo.ByMedia.Net

Камітэт ААН па правах чалавека прызнаў былога міністра і кандыдата ў прэзідэнты Міхаіла Марыніча ахвярай палітычных рэпрэсій. Улады Беларусі абавязалі забяспечыць пацярпеламу рэабілітацыю, аплаціць яго лячэнне і выплаціць кампенсацыю за маральныя і фізічныя пакуты. Камітэт ААН палічыў рашэнне суда, які ў снежні 2004 года прызнаў Марыніча вінаватым у крадзяжы аргтэхнікі ў амбасадзе ЗША і прысудзіў яго да пяці гадоў пазбаўлення волі, несправядлівым і вынесеным пад ціскам звонку. Акрамя таго, выяўлена, што падчас следства апазіцыянера катавалі, «выбіваючы» патрэбныя сведчанні. У турме ў Марыніча здарыўся інсульт.

На момант прыходу да ўлады Аляксандра Лукашэнкі Марыніч займаў высокую пасаду беларускага пасла ў Чэхіі. Аднак Лукашэнка вырашыў вярнуць дыпламата ў родную краіну, прызначыўшы яго міністрам знешнеэканамічных сувязяў. У 1999 годзе Марыніч зноў стаў прадстаўляць дыпламатычныя інтарэсы Мінска на тэрыторыі Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі.

У 2001 годзе пасол вырашыў пакінуць сваю пасаду і напісаў заяву аб адстаўцы, абвясціўшы пра сыход у вялікую палітыку. Марыніч спрабаваў балатавацца на выбарах прэзідэнта, аднак ЦВК адмовіў яму ў рэгістрацыі. Пасля гэтага палітык, які пайшоў у апазіцыю да дзеючай у Беларусі ўлады, узначаліў міжнародную грамадскую арганізацыю «Беларуская асацыяцыя «Дзелавая ініцыятыва», удзельнічаў у стварэнні блока «За новую Беларусь», які пасля стаў грамадскім фондам, зарэгістраваным у Маскве.

### ВОЛЬГА ГАВАРЦОВА



Вольга Гаварцова (45-е месца ў парным рэйтынгу) і Цзя-Жун Чжуан з Тайваня (42) сталі пераможцамі тэніснага турніру ў Пекіне з прызавым фондам 4,5 мільёна долараў ЗША. Беларуска-тайскі дуэт перамог аргенцінку Гізелу Дулько і італьянку Флавію Пенета з лікам 7:6 (7:2), 1:6, 7:6 (10:7).

Для 22-гадовай беларускай тэнісісткі гэта пяты фінал у парным разрадзе турніраў WTA і чацвёрты тытул.

У панядзелак у аўстрыйскім Лінцы стартаваў турнір Generali Ladies Linz, але Вольга Гаварцова з яго знялася з прычыны інфекцыі дыхальных шляхоў. Месца беларускай тэнісісткі ў асноўнай сетцы спаборніцтваў заняла lucky loser Сарана Кірсця з Румыніі, паведамляе афіцыйны сайт WTA.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# TABULA RASA ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ

Сяргей НІКАЛЮК

**Куранят падлічваюць увосень. Гэты прынцып справядлівы і ў палітыцы. Вераснёўскае апытанне НІСЭПД прадставіла нам такую магчымасць.**




Але пачну я не з рэйтынгаў, а з таго, што звычайна застаецца па-за полем зроку беларускіх экспертаў. Я пачну з грамадства. Да выбараў ужо рукой падаць, і мне здаецца, што самы час згадаць пра беларускае грамадства. Як яно там? Ужо прачнулася і пачало вывучаць праграмы кандыдатаў або ўсё яшчэ занятае сваімі паўсядзённымі клопатамі?

У апошнія месяцы на людзей абрынулася дастаткова супярэчлівая інфармацыя. Грэчка падаражэла, а бульба, насуперак шматгадовай традыцыі, адмовілася ўвосень таннець. Пенсіі прыкметна выраслі, чаго не скажаш пра зарплаты. Уключыш тэлевізар — а там чарговая беларуска-расійская «вайна».

## Бульба супраць тэлевізара

І беларусы разгубіліся. Колькасць тых, хто адчуў паляпшэнне свайго матэрыяльнага становішча, за апошнія тры месяцы вырасла з 14% да 19% (галоўным чынам за кошт узроставай групы старэй за 60 гадоў). Але адначасова з 20% да 24% павялічылася колькасць суайчыннікаў, чыё матэрыяльнае становішча пагоршылася. Адбылася палярызацыя ў ацэнках. Адразу і не ўзгадаеш, калі такі эфект назіраўся раней.

У веры ў перспектыву «беларускай эканамічнай мадэлі» — свае праблемы. З аднаго боку, колькасць грамадзян, якія мяркуюць, што сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі ў найбліжэйшыя гады палепшыцца, практычна не змянілася. Было 25% — стала 26%. А вось песімістаў прыкметна пабольшала. Было 14% — стала 20%.

У ацэнках свайго матэрыяльнага становішча беларусы ідуць «ад жыцця». Гэта натуральна. Зірнуў на цэннікі, пералічыў грошы ў кашальку — і ўзрадаваўся або заплакаў. А вось ацаніць сярэднетэрміновую перспектыву развіцця сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне і палітычны курс, якім рухаецца карабель з ганарлівай назвай «Беларусь», шараговаму працаўніку складана. «Сваё» рашэнне ён прымае пад уздзеяннем «сваіх» СМІ. Для адных беларусаў «сваімі» з'яўляюцца СМІ дзяржаўныя, для іншых — незалежныя.

За апошнія тры месяцы колькасць прыхільнікаў курсу трохі падрасла (з 50% да 51%), а апанентаў — знізілася (з 34% да 32%). Змены, як бачыце, малаістотныя, у межах трох працэнтаў хібнасці. Але тут важны сам факт, што ва ўмовах інфармацыйнай «вайны» з Расіяй афіцыйны палітычны курс не зведаў рэвізіі грамадскай думкі.

А што ж з рэйтынгам адзінага палітыка (АП) краіны? У чэрвені ў параўнанні з сакавіком ён падрос на 4%, дасягнуўшы нядрэнных для пачатку выбарчай кампаніі 46 працэнтаў. Але вераснёўскае апытанне прынесла нечаканасць: замест далейшага росту адбылося паніжэнне да 39%. Спрэчка паміж тэлевізійнай выявай і бульбай (дробным оптам па паўдолара за кілаграм), мяркуючы па ўсім, вырашылася на карысць бульбы.

## Палітык міжволі

39% — гэта адкрыты рэйтынг. Пры яго вызначэнні спіс палітыкаў не акрэсліваецца. Калі ж такі спіс прапанаваць, то мы атрымаем закрыты рэйтынг, які, як правіла, вышэй за адкрыты. У чэрвені ў АП ён склаў 44% (як і ў чэрвені 2006 года). Зрэшты, і колькасць грамадзян, што ні пры якіх акалічнасцях не згодныя галасаваць за АП, не змянілася (34%). Для кагосьці гэта плюс, для кагосьці — мінус. Усё залежыць ад палітычных густаў, але структура беларускага электарату стабільная, і гэта медыцынскі факт.

У канцы жніўня АП правёў нараду, на якой, звяртаючыся да прэм'ер-міністра Сідорскага, нагадаў базавы прынцып беларускай уладнай мадэлі: «Я политик, я должен думать о людях, а вы должны думать об экономике и финансах. У вас людей нет. Забудьте! В экономике люди не стоят за деньгами и за тракторами. Вы голый экономист. Вы должны приходить с министром финансов ко мне и бороться за каждый рубль, за каждую копейку. И это я должен говорить, что там за ними стоят люди».

Наогул, займацца эканомікай — гэта не гайкі круціць, а ладзіць адносіны з людзьмі. Але гэта да слова. Жнівеньская нарада спарадзіла безліч каментараў. Іх агульны сэнс перадае наступная цытата: «Прэзідэнт Беларусі пачаў падрыхтоўку да выбараў з пазбаўлення ад сваіх памочнікаў — тых, хто часта з'яўляецца на экранах тэлевізараў».

А зараз ад сцвярджэння, узятага са столі, звернемся да фактаў. У верасні адкрыты рэйтынг Сідорскага склаў 4,4%. Раней ён ніколі не вырываўся з трохпрацэнтнага статыстычнага гета (сярод апазіцыянераў, якія зарэгістравалі ініцыятыўныя групы, самы высокі адкрыты рэйтынг у Някляева — 1,1%). Што да закрытага рэйтынгу, то ён у «голага эканаміста» падняўся да непрыстойных 13,2% (у Някляева — 5,1%).

Як такое магло здарыцца? Вазьму на сябе адвагу выказаць здагадку, што да росту рэйтынгу Сідорскага крытыка з боку АП дачынення не мае. Не мае да гэтага дачынення і сам прэм'ер-міністр. Нічога, што выходзіла б за рамкі звыклай руціны, ён не зрабіў. Уся справа ў грамадстве, дакладней, у трывозе, якая ахапіла яго. Гэтая трывога і знізіла рэйтынг АП. Тым самым шостае пачуццё «савецкіх беларусаў» — пачуццё ўпэўненасці ў заўтрашнім дні — апынулася пад пагрозай. Рост рэйтынгу Сідорскага — следства своеасаблівага псіхалагічнага кампенсавання перад пачаткам выбараў.

Звярніце ўвагу: патрэба кампенсавання не прывяла да росту рэйтынгаў апазіцыйных палітыкаў. Такое назіралася і раней. Ад структуры беларускага электарату нікуды не падзецца. У кожнай яго часткі не толькі свае СМІ, але і свае палітыкі. Але ў аўтарытарнай часткі электарату — палітык адзін, а ў дэмакратычнай — іх шмат. Гэта адна з прычын нізкіх рэйтынгаў апошніх. Але калі падкараціць спіс, уключыўшы ў бюлетэнь для галасавання аднаго або двух прадстаўнікоў апазіцыі, — падчас усенароднага галасавання яны атрымаюць каля 30%. І так было ўжо тройчы.

## А як там у вожыкаў?

Нацыянальныя асаблівасці бываюць не толькі ў рыбалкі і палявання. Галоўная асаблівасць беларускай паліталогіі мне бачыцца ў своеасаблівым поглядзе на грамадства. Па большай частцы погляд гэты не заўважае грамадства наогул. Таму палітычныя працэсы зводзяцца да супрацьстаяння ўлады і апазіцыі, а таксама назіраецца гіпертрафаваная ўвага да міжпартыйных «разборак». І сапраўды, гэта ж так цікава, як там у вожыкаў усё адбываецца! Аўтару гэтых радкоў пашчасціла назіраць гэты інтрыгоўны працэс па тэлеканале «Enamel planet». Не хаваю свайго расчаравання — ніякай камасутры. Усё як ва ўсіх.

Але на гэтым своеасаблівасць беларускай паліталогіі не заканчваецца. Ёсць такое паняцце — tabula rasa («белая дошка» або «чысты ліст»). Яго ўпершыню выкарыстаў Арыстоцель, параўноўваючы свядомасць маленькага дзіцяці з пакрытай воскам дошчачкай для пісьма. Разгладзіўшы на ёй воск, можна было сцерці напісаны раней тэкст, зрабіць яе чыстай і выкарыстаць зноў.

Вось такой tabula rasa ўяўляецца шматлікім палітолагам і палітыкам беларускае грамадства. Адсюль пастаянныя заклікі «змагацца за большасць», «выйсці з апазіцыйнага гета» і інш. На гэтай жа «тэарэтычнай базе» грунтуецца падвышаная ўвага да электаральных рэйтынгаў. Народ, мяркуюць, ад пэўнага персанажа стаміўся (або вось-вось стоміцца), што дазволіць «сцерці напісаны раней тэкст» любові да аўтарытарнага лідэра і на чыстым лісце грамадскай думкі напісаць нешта вельмі дэмакратычнае і праеўрапейскае.

Такога кшталту надзеі падсілкоўваюцца і легкадумным тлумачэннем вынікаў сацапытанняў. У прыватнасці, сацыёлагі НІСЭПД у сваіх справаздачах увесь час падкрэсліваюць, што змены грамадскай думкі, якія імі фіксуюцца, — рэакцыя на інфармацыю, генераваную СМІ і чуткамі. Але калі гэта сапраўды так, то падзел грамадства на прыхільнікаў і апанентаў улады ёсць прамы вынік прапаганды. У рамках такога кшталту ўяўленняў беларусы падзяляюцца на тых, хто ведае Праўду, і на тых, хто яшчэ не паспеў яе зразумець. Да апошніх неабходна гэту самую Праўду данесці.

## Свая Праўда

Безумоўна, грамадская думка як інстытут (у заходнім разуменні) у Беларусі не сфармавалася, але магчымасці прапаганды абмежаваныя базавымі каштоўнасцямі і ўстаноўкамі расколатага беларускага грамадства.

Большасць прыхільнікаў АП з'яўляюцца носьбітамі сінкрэтычнай свядомасці. У рамках такой свядомасці няма месца для падзелу ўладаў. Адсюль вынікае ўспрыманне дзяржавы як патрыярхальнай сям'і, а яе кіраўніка як бацькі. Звернемся да афіцыйнай біяграфіі: «А.Р. Лукашэнка даражыць падтрымкай людзей і ганарыцца тым, што ў народзе яго называюць "бацькам" — так заўсёды звалі ў нас людзей аўтарытэтных, якія мужна баранілі інтарэсы сям'і і абшчыны...»

Для людзей з сінкрэтычнай свядомасцю распад СССР ператварыўся ў «величайшую катастрофу XXI века». Нічога дзіўнага ў гэтым няма: для іх любое ўскладненне жыцця выклікае дыскамфорт. У свой час гэта выдатна зразумелі бальшавікі, што спакусілі сялянскую імперыю сінкрэтычным царствам (камунізмам), у якім будзе сцёртая мяжа паміж горадам і вёскай, разумовай і фізічнай працай, знікне любая сацыяльная няроўнасць і г.д. Даць такім суб'ектам волю — і яны б сцерлі фізіялагічную мяжу паміж мужчынамі і жанчынамі.

Да гэтага часу шматлікія беларусы ўспрымаюць пасярэднікаў выключна як спекулянтаў. Іх паслухаць, дык селянін павінен сам гандляваць на рынку. Але так думаюць не толькі пенсіянеры. Прывяду фрагмент Паслання–2010: «Как только цены становились выгодными для так называемых спекулянтов и мошенников, здесь скупались товары по дешевке, а туда вывозились и продавались… У нас сахар сколько стоит? У нас где-то было до недавнего времени 500 долларов тонна, по-моему, а там 1000... Вы понимаете, что это такое? Тонну купил здесь, туда подальше завез и продал».

Звярніце ўвагу, спекулянт — гэта заўсёды прыватнік, іншымі словамі, чалавек, які пераследуе не агульнанародныя (сінкрэтычныя), а асабістыя мэты. Але калі дзяржава імкнецца прадаць «па добрых коштах» сельгаспрадукцыю або салярку, вырабленую з бяспошлінай нафты, то гэта не спекуляцыя, а ўменне гандляваць.

Прафесійным носьбітам Праўды неабходна памятаць: Праўда — у кожнага свая. Нічога новага ў гэтым няма. Вось толькі на Захадзе розніца паміж праўдамі левых і правых невялікая, а ў нас, ва ўмовах сацыякультурнага расколу грамадства, праўды прыхільнікаў і апанентаў АП падзяляе бездань, і падчас агітацыйных кампаній яе не пераадолець.

ВЫБАРЫ

# СВАЕ СІЛЫ СУПРАЦЬ ЧУЖЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Вольга ХВОІН

**У краінах з развітой сферай публічнай палітыкі рэдкія выбары абыходзяцца без прымянення паліттэхналогій. Іх інструменты і метады дазваляюць перакласці лакальныя, індывідуальныя мэты палітыка на мову агульнадзяржаўных задач, знайсці сімпатыі ў выбарцаў, дарогу да свядомага і падсвядомага грамадзян. Але ў Беларусі публічнай палітыкі няма. Ці, калі быць дакладным, ёсць публічная палітыка адной фігуры.**




У час прэзідэнцкай выбарчай кампаніі метады, якімі карыстаюцца палітыкі, выклікаюць цікаўнасць і ўвагу. Паспрабуем разабрацца, ці выкарыстоўваюцца патэнцыйнымі кандыдатамі адмысловыя стратэгіі і тактыкі, або ўсё пускаецца на самацёк, і камунікацыі ладзяцца па прынцыпу «як Бог на душу пакладзе».

Бягучая электаральная кампанія багатая на кандыдатаў. Але ці не палова з іх — людзі далёкія ад палітычнага працэсу. Адпаведна, шукаць там прафесійныя прыёмы і тэхналогіі — марнаванне часу. Ды і сярод быццам бы сталых палітыкаў праца ў сферы піяру, стварэння пазнавальнага вобразу больш падобная на гульні ў пясочніцы, чым сур'ёзную дзейнасць.

У якасці эталону ўзгадаем пасяховую кампанію дзейснага прэзідэнта ЗША Барака Абамы. Яго каманда спрацавала на пявевах часу і сучасных тэхналогіях. І не навобмацак, а з сур'ёзным разлікам і паслядоўнасцю. Цікава, што на вынік Абамы працавала каманда рэкламістаў, людзі, якія працуюць у сферы камунікацый, паказалі, што іх досвед і веды можна прымяняць у любой сферы, а не толькі ў продажы мыйных сродкаў, абутку, кавы. Персаналізацыя кандыдата, яго набліжэнне да кожнага грамадзяніна і асабісты ўнёсак у перамогу — вось кіты, на якіх стаяла кампанія. Эфектыўным інструментам камунікацыі стаў інтэрнэт. Апроч таго, быў створаны грамадскі фонд дапамогі Бараку Абаму, праз які атрымалася сабраць сотні тысяч долараў на кампанію.

У Беларусі няма сярэдняга класу, і, адпаведна, далёка не кожны гатовы ахвяраваць на дзейнасць палітыкаў, тым больш, што яны ў СМІ (апроч Аляксандра Лукашэнкі, натуральна) выстаўляюцца як хціві людзі і дармаеды. Але ніхто з кандыдатаў нават не паспрабаваў выкарыстаць такі прыём. Хаця зразумела, што калі чалавек ахвяруе нават адну тысячу рублёў кандыдату N, то наўрад ці ён пасля ад гэтага кандыдата адмовіцца.

Што тычыцца выкарыстання сацыяльных сетак, то першыя асцярожныя крокі спрабуе рабіць лідэр кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў. Фэйсбук, Твіттэр, ВКонтакце — там можна знайсці старонкі патэнцыйнага кандыдата, прачытаць апошнія навіны «з палёў». Яго кампанія вытрыманая ў агульнай стылістыцы, ідзе апеляцыя да папулярных на постсавецкай прасторы сацыяльных ідэй, плюс дапаўняецца скандальнымі вобразамі — то забітага коціка, то «Міс грудзі Беларусі». Але зваротных актыўных дзеянняў не так многа, хаця ў сталіцы інтэрнэтам карыстаецца ці не ўся моладзь, а гэтак жа і сталыя асобы з ліку офісных работнікаў, кіраўнікоў.

Таксама свае старонкі ў сацыяльных сетках маюць іншыя кандыдаты ад апазіцыі, але там жыццё хіба што толькі цепліцца.

Прывесці кампанію агульнага назоўніка спрабуе і Яраслаў Раманчук, як у знешнім афармленні, так і ў сваім напаўненні. Але бракуе яркасці. Кандыдат ад партыі БНФ Рыгор Кастусёў хіба што скарае сваёй непасрэднасцю і прастатой душэўнай. На пытанне, хто займаецца яго іміджам і ці будуць кансультацыі з паліттэхнолагамі, спадар Рыгор акінуў залю, дзе былі людзі з моладзі БНФ, і запэўніў, што партыя абыдзецца сваімі сіламі. Але ні яркага запамінальнага вобразу, ні талковага прэс-сакратара (што не апошні фактар для добрай прэзідэнцкай кампаніі) «свае сілы» Рыгору Кастусёву так і не знайшлі. Увогуле, апазіцыя запамінальная тым, што цэласныя вобразы ў ёй — справа рэдкая. Прычыны і ў напаўмаргінальным стане, і ў гадах пазасістэмнага існавання (ад 1996 года), і ў адносінах палітыкаў да справы, якую яны робяць.

Дзейсны кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад асноў свайго вобразу «бацькі» беларусаў не адыходзіць. Застаюцца актуальнымі выказванні пра гаспадарлівасць, надзейнасць і ворага. Толькі раней выкрываў злодзея Шушкевіча з цвікамі, цяпер расійскае кіраўніцтва, што здрадзіла славянскаму сяброўству. У арсенале застаецца і сацыяльны інструментарый: заробкі бюджэтнікам, пенсіі. Але пры гэтым не ўлічваецца, што час змяняецца, а разам з ім — і патрабаванні. Падобна, што гэты фактар застаецца па-за ўвагай тэхнолагаў Лукашэнкі, а сама кампанія спускаецца на падкантрольны самацёк: нічога экстраардынарнага не здзяйсняецца, але не значыць, што надышла анархія. Стратэгія маскі ліберала.

Палітолаг Уладзімір Мацкевіч гаворыць, што тэхналогіі ўваходзілі ў палітычны працэс Беларусі марудна. «У гэтых выбарах кампанія Уладзіміра Някляева цалкам пабудаваная на паліттэхналогіях. Самой палітыкі там значна менш. Праглядаецца ўплыў тэхналогій у Яраслава Раманчука, Андрэя Саннікава. Трэба разумець, што роля паліттэхнолагаў абмежаваная і амбівалентная. Раскрутка кампаніі «Гавары праўду!» і Някляева цягам гэтага года паказалі эфектыўнасць тэхналогій. Але адсутнасць палітычнага працэсу немагчыма выправіць нават самымі дасканалымі, крэатыўнымі тэхналогіямі. То бок паліттэхналогіі — гэта толькі дадатковы інструмент, замяніць кандыдатаў, партыі, палітыку яны не могуць».

Адначасова Уладзімір Мацкевіч апелюе да праблем, якія можа прынесці неабачлівае выкарыстанне паслуг чужых паліттэхнолагаў. «Яшчэ ў 2002 годзе я меў магчымасць сутыкнуцца з маскоўскімі паліттэхнолагамі, якія працавалі на парламенцкіх выбарах ва Украіне. І пабачыў агідныя бакі гэтай дзейнасці — не толькі пазітыў, поспех, але і маніпуляцыі. Тады я і мае калегі далі сабе слова не дапускаць чужых паліттэхнолагаў у нашу краіну, калі мы можам гэта зрабіць самі. Маскоўскія паліттэхнолагі шырока карыстаюцца «чорным» піярам, злоўжываюць чалавечымі недахопамі, слабасцямі. Мяркую, што гэта звязана са станам расійскай палітыкі, калі грошы і адміністрацыйны рэсурс улады цалкам забіваюць грамадскую думку. Палітыка робіцца не сацыяльнымі групамі, партыямі, а групоўкамі напаўкрымінальнага характару, якія цалкам засяроджаныя на сваіх эгаістычных мэтах і імітуюць палітычны працэс. Гэтаму можа супрацьстаяць толькі развіццё сацыяльных інстытутаў», — гаворыць Мацкевіч.

Эксперт з задавальненнем заначае, што беларуская грамадства хоць і не ў поўнай меры, але здольнае змагацца з хібамі палітычных гульняў. «Я думаю, што наша грамадства больш цывілізаванае, чым у Расіі, і нават калі б нехта захацеў скарыстацца брыдкімі тэхналогіямі была б адпаведная рэакцыя на гэта. Мне падабаецца, як наша супольнасць успрымае расійскія тэхналогіі — з асцярогай, недаверліва, імкнецца сачыць, каб кампанія «Гавары праўду!» цалкам не скацілася ў маніпуляванне», — зазначае эксперт.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ПРА ПІВА З КОЗАМІ

**25 верасня, ці не ў апошнюю цёплую суботу, перада мной узніклі пытанні. Трэба было аплаціць рахункі за электрычнасць, за тэлефон, за газ. Тэрмінова, бо ў панядзелак ні пошта, ні філіялы «Беларусбанка» ў сельскай мясцовасці не працуюць.**

Каб не прывязваць сябе да электрычкі, вырашыў пешкі схадзіць у Забалоцце. Усяго нейкія тры кіламетры, надвор'е цудоўнае, вандроўка прыемная. Пакрочыў. Але лепш бы паехаў у Смалявічы. Бо высветлілася, што пошта не працуе, аддзяленне банка таксама, бо там ідуць нейкія рамонтныя работы.

Вось і чухай патыліцу. Вылаяўся пра сябе і падаўся ў прыватную крамку, якая месціцца побач з сельсаветам. Пакуль прыглядаўся і прыцэньваўся, у памяшканне зайшлі маладая дзяўчына і жанчына сталага ўзросту. Мусіць, дачка і маці. Пытаюцца ў прадавачкі, ці прымае яна для разліку крэдытныя карткі. На жаль, не. Але гандлярка параіла праехаць два з паловай кіламетры да пасёлка Арджанікідзе, дзе ёсць і банкамат, і аддзяленне «Беларусбанка».

Жанчыны крутануліся на адной назе, я за імі. Прабачыўся, папрасіў падвезці, бо я таксама прыйшоў у банк, а ён зачынены. У адказ пачуў, што яны нікога не падвозяць: прынцыпы ў іх такія. Я знікавеў. Каб жа прасіў пра дапамогу якога алігарха ці поп-зорку. А тут дзве простыя кабеціны на добра «патрыманай» легкавушцы выказваюць такому ж простаму чалавеку такую пагарду. Вось папрасі ў іх у спякотны дзень шклянку вады, далібог, з поўнага вядра не наліюць. Ад нечаканасці я, мусіць, аж рот адкрыў. Але ж потым вылажыў ім чыстую праўду. Сказаў, што ні старая, ні маладая не ў маім гусце. Што мяне не трэба «падкідваць», а прасіў я іх падвезці да Смалявіч. Да таго ж за грошы.

Куды там, ускочылі ў аўто, газанулі, аж ад нечаканасці нейкі прыблудны сабака забрахаў.



Не, калі прыходзіш ва ўстанову і цябе замест «аднаго вакна» пасылаюць у мноства дзвярэй, не так крыўдуеш. Чыноўнікі ж паўсюль аднолькавыя і глядзяць на простага чалавека як салдат на вош. Можа, не было б так крыўдна, каб галасаваў на дарозе.

Што рабіць, вярнуўся ў краму, загаварыў з прадавачкай. Сказаў, што банкіры маглі б свой рамонт зрабіць і ў свой выходны, у панядзелак, каб не марнаваць дарэмна час кліентаў. Але навошта тое ім? Людзі ж нікому не пажаляцца. А калі нават пачнуць скардзіцца, то і ўправа знойдзецца. Ім і крэдыты патрэбны, і іншае. А далей — ланцужок, паслуга за паслугу, ты мне — я табе. Вось і ўзнікае дружная хеўра адзін аднаму абавязаных, адзін з адным павязаных. Усім астатнім, можа, і дрэнна, але толькі не ім.

Але гэта былі не ўсе дзівосы на дзень. Бо калі я расказаў гандлярцы, як цудоўна для мяне дзень пачынаўся, і што з гэтага выйшла, тая ўдакладніла. Аказваецца, не рамонт робяць «банкіры», а ўсталёўваюць сабе кандыцыянер. Як у той байцы, толькі наадварот. Спякотнае лета адмучыліся ў духаце, а напярэдадні зімы, якая, па прагнозах сіноптыкаў, абяцае быць анамальна халоднай, ладзяць кандыцыянер. Рацыянальна гэта ўсё патлумачыць немагчыма. «Тут і не людзі нават, а сістэма вінаватая», — філасофскі заўважае гандлярка.

Не, мусіць, і людзі, бо якія яны — такая і сістэма. «Банкіры», што не думаюць ні пра інтарэсы сваіх кліентаў, ні пра прыбыткі свайго банка. Мауляў, куды народ падзенецца, усе камунальныя ды іншыя плацяжы на вёсцы праходзяць толькі праз «Беларусбанк». Яны тут — дачнікі, якія ў адчуваць сябе сталічнымі «штучкамі» і трымаюцца сярод вяскоўцаў з непрыхаваным нахабствам.

Карацей, ад агіднага марнатраўства часу знерваваўся і сасмяг. Вырашыў папіць піва. Здабыць яго не праблема, бо прадаюць піва аж у чатырох крамах на маленькім пятачку. Але праблемай аказалася, дзе піва выпіць. Зразумела, мясцовыя могуць і дома, а такія вось выпадковыя вандроўнікі, як я, дзе? А нідзе. Няма спецыяльна абсталяванага месца для распіцця піва, як гэта належыць па спецыяльнаму ўрадаваму распараджэнню.

Дзе хочаш, там і пі, толькі не трапляйся на вочы міліцыянтам. Так было, колькі сябе памятаю. Так і засталося. Толькі штрафы зараз касмічныя. Але ж, гляджу, на стадыёне козы пасуцца. Гэта ж таксама забаронена. Ім можна, а мне... Вырашыў папіць піва ў сімпатычнай кампаніі. Добра, што не патрапіўся.

ЮБІЛЕЙ

# ДЗЕЛЯ ЯДНАННЯ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ

**Два дзесяцігоддзі МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» працуе дзеля яднання беларусаў, што жывуцьпаза межамі Беларусі і на Бацькаўшчыне. Арганізацыя зведала прыхільнасць і няласку ўладаў, але выстаяла і цяпер знаходзіцца ў ліку даволі паспяховых структур, што працуюць на ніве беларушчыны. Летась «Бацькаўшчына» змяніла сваё кіраўніцтва і пад патранажам Алены Макоўскай і Ніны Шыдлоўскай стала больш сучаснай, цікавай людзям. Пра дасягненні Згуртавання беларусаў свету, сучасны стан беларускай дыяспары са старшынёй Рады Нінай Шыдлоўскай разважаляла Вольга Хвоін.**



Радзім Гарэцкі і Вітаўт Кіпель падчас Трэцяга з'езду беларусаў свету, ліпень 2001 г.



Ніна Шыдлоўская



Алена Макоўская

***— Летась адбыўся Пяты з'езд «Бацькаўшчыны». Апроч сябраў арганізацыі ў яго працы актыўна ўдзельнічалі і прадстаўнікі дзяржаўных органаў. Узгадвалі, што беларуская дыяспара пазбаўленая ўвагі дзяржавы. Ці нешта змянілася за гэты год?***

— Гаварыць, што дзяржава ўвогуле не працавала ўвесь гэты час з беларусамі замежжа, нельга. Іншая справа, што супрацоўніцтва мела кропкавы характар, найперш па эканамічных пытаннях. Не было сістэмнага падыходу, разумення таго, што з беларусамі замежжа трэба працаваць незалежна ад іх палітычнай арыентацыі. Яднаючы на нацыянальнай, культурнай ніве, як тое робіць «Бацькаўшчына», хоць гэта і нясціпла гучыць, можна знаходзіць людзей па ўсім свеце, прыцягваць іх да супрацы. Пэўныя зрухі ў супрацоўніцтве з чыноўнікамі з'явіліся, але мы не цешымся ілюзіямі, што ў гэтым кірунку будзе росквіт, усё стане ідэальна. Дзяржаўная бюракратычная машына нязграбная, ёй патрэбны час. У супрацоўніцтве з дыяспарай мусіць быць задзейнічаны цэлы шэраг міністэрстваў і ведамстваў, і тут ёсць праблема: практычна няма спецыялістаў па дыяспары, няма ведаў і разумення працэсаў, што адбываліся і адбываюцца ў асяродках беларусаў, якія жывуць за мяжой.

Галоўным дасягненнем у стасунках з дзяржавай ёсць аднаўленне працы па закону «Аб беларусах замежжа». Былі сустрэчы працоўных груп, ужо прагавораныя назва, мова, тэрміналогія. Практычнае напаўненне закона будзе абмяркоўвацца падчас наступных сустрэчаў. Думаю, калі праца пойдзе ў такім тэмпе, то наступнай восенню мы ўжо атрымаем гатовы законапраект. Важны момант: нарэшце прыйшло ўсведамленне таго, што за ўзор для беларускага закона трэба браць заканадаўства ўнітарных краінаў. Ад пачатку бралася заканадаўства Расіі, але гэта федэрацыя, і адносіны з прадстаўнікамі нацыянальнасцяў там будуюцца па-іншаму.

Кропкава, але ўсё ж адбылася дапамога дзяржавы беларускім школам за мяжой. Няма інстытута беларускай дыяспары, і дзяржслужбоўцы не валодаюць сітуацыяй. Ад нас яны даведаліся, што ёсць сур'ёзныя праблемы з беларускім школьніцтвам за мяжой, і ад імя Адміністрацыі прэзідэнта ці не ўпершыню была дапамога рыжскай беларускай школе, асобныя класы ў Польшчы атрымалі ў верасні падарункі.

Міністэрствам культуры рыхтуецца праграма «Беларусы ў свеце», мы будзем уносіць свае прапановы. То бок пайшлі зрухі, але дэфіцыт спецыялістаў у дзяржструктурах па дыяспары ускладнае гэты працэс.

***— Але ці ёсць запатрабаванасць у такіх кантактах з боку беларусаў замежжа?***

— На кожным з'ездзе беларусаў свету, незалежна ад сімпатый да палітычных працэсаў унутры Беларусі, выказваюцца пажаданні, каб была падтрымка з боку дзяржавы, бо ідзе асіміляцыя беларусаў за мяжой. У суполках беларускай дыяспары слабая перaемнасць. Хваля пасляваеннай эміграцыі была моцнай, уплывовай. Яны стварылі беларускія асяродкі. Потым былі хвалі эканамічнай эміграцыі, і гэтыя людзі шукаюць партнёраў не паводле прынцыпу нацыянальнасці, а паводле эканамічнай мэтазгоднасці. Слабая самаідэнтыфікацыя ўнутры Беларусі ўплывае на тое, што, з'язджаючы з краіны, людзі часта ці асімілююцца ў краіне пражывання, ці далучаюцца да тых дыяспар, якія найперш гатовыя аказаць ім эканамічную падтрымку.

***— Наколькі актыўныя беларусы ў сумежных краінах?***

— На этнічных землях людзі найбольш імкнуцца трымацца сувязяў з Беларуссю. На Віленшчыне, Беласточчыне повязь з нашай краінай ці не наймацнейшая, бо гэтыя беларусы не пакідалі сваю зямлю. Таму і культурніцкае, і грамадскае жыццё ў асяродку беларусаў Польшчы, Літвы не спыняецца. Праўда, ёсць праблема: тыя ж палякі не зацікаўленыя ва ўмацаванні нацыянальных асяродкаў, і гэта натуральна для любой дзяржавы. Таму, не маючы запатрабаванасці з боку беларускай дзяржавы, этнічныя беларусы Польшчы змяняюць свой статус. Перадапошні перапіс паказаў каля 300 тысяч беларусаў на тэрыторыі Польшчы, а падчас апошняга беларусамі запісалася менш за 50 тысяч чалавек. Няма іміджавай матывацыі, культурніцкіх, эканамічных сувязяў з Беларуссю.

***— Вы ўвесь час вяртаецеся да таго, што ў самой краіне, метраполіі ў людзей ёсць праблемы ў самаідэнтыфікацыі. Як вы ацэньваеце гэтыя працэсы?***

— Ёсць пэўная стагнацыя, бо ўсё ж вырасла пакаленне дзяцей, якія вучыліся па ўсечаных падручніках. Прагалы ў адукацыі, абазнанасці ў беларускай тэматыцы моцна адчуваюцца. Але цікаўнасць да беларускай мовы, культуры ёсць. Мінулай восенню мы праводзілі сацыялагічнае апытанне. Выявілася, што, напрыклад, сучасных беларускіх музыкаў мала хто ведае. Называюць імёны яшчэ з БССРаўскіх часоў. Эстрада, якая прапануецца праз дзяржаўныя СМІ, саступае расійскай, таму яна нецікавая беларусам. А сучасныя гурты і выканаўцы, што трымаюцца беларускага вектару, застаюцца малавядомыя. Дарэчы менавіта з мэтай павышэння нацыянальнай самаідэнтыфікацыі «Бацькаўшчына» ініцыявала правядзенне грамадскай культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі!».

***— Чаму вы вырашылі займацца справамі беларускай дыяспары?***

— Кожны з нас у «Бацькаўшчыну» прыйшоў па-свойму. Сваю дзейнасць я пачынала ў палітычным полі, але прыйшло ўсведамленне, што палітычныя сілы вырашаюць толькі кароткатэрміновыя задачы. А ў падмурку няма агульных каштоўнасцяў, і гэта адна з прычынаў паразы. Гэтай працай ніхто доўгатэрмінова не займаўся. Пасля знаёмства з такімі асобамі, як Радзім Гарэцкі, Генадзь Бураўкін, я знайшла тое, што мне бліжэй. Магчыма, гэта праца больш руцінная, але, на маю думку, і больш глабальная.

***— Цяпер ідзе перадвыбарчая кампанія. Калі ўздымаецца пытанне пра магчымую жанчыну-прэзідэнта Беларусі, то называюць вас і Алену Макоўскую. Гатовыя былі б змяніць сферу дзейнасці?***

— Я мяркую, што цяпер я на сваім месцы. Усяму свой час, і кожнаму — свае задачы. Хаця ніхто не ведае да канца свайго жыццёвага шляху. Цяпер я на сваім месцы і прыношу карысць сваёй дзейнасцю. А далей час пакажа.

## Каментар

**Радзім Гарэцкі, акадэмік, прэзідэнт МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» ў 1993–2001 гадах, адзін з заснавальнікаў МГА «ЗБС «Бацькаўшчына»**

Працэсы перабудовы 1980-х гадоў мінулага стагоддзя выклікалі ўздым нацыянальнага адраджэння. 10 верасня 1990 года адбылася Устаноўчая канферэнцыя па арганізацыі ЗБС «Бацькаўшчына» — міжнароднай грамадскай культурна-асветніцкай супольнасці беларусаў, галоўнай мэтай якой з'яўляецца нацыянальнае адраджэнне Беларусі, яе мовы, культуры, адукацыі, гісторыі, стварэнне незалежнай дэмакратычнай дзяржавы. Першым прэзідэнтам ЗБС «Бацькаўшчына» стаў Васіль Быкаў, а старшынёй Рады — Яўген Лецка.

Напрыканцы 1992 года мы правялі Сход беларусаў краін былога СССР. Савет Міністраў РБ за подпісам Кебіча прыняў спецыяльную пастанову аб ЗБС «Бацькаўшчына», у якой даручаў усім міністэрствам і іншым урадавым структурам дапамагаць дзейнасці Згуртавання беларусаў свету. Кульмінацыяй магутнай, але, на жаль, кароткай хвалі нацыянальнага адраджэння з'явіўся Першы з'езд беларусаў свету ў ліпені 1993 года, які праходзіў з вялікім уздымам і са значнай падтрымкай і дапамогай дзяржаўных уладаў.

Аднак пасля таго, як наша краіна стала прэзідэнцкай дзяржавай, адносіны да ЗБС «Бацькаўшчына» з боку ўладаў рэзка пагоршыліся. Доўгі час мы не маглі атрымаць дазвол на правядзенне Другога з'езду беларусаў свету, які мы прымеркавалі да Дня незалежнасці 27 ліпеня 1997 года. Нават ішла размова наконт правядзення з'езду ў суседніх краінах. Нарэшце атрымалі дазвол правесці яго ў Тэатры музычнай камедыі, але перашкоды (ліпавая пажарная небяспека, тэрміновы рамонт) працягваліся амаль да самага дня адкрыцця з'езду. Ціск з боку ўладаў на рух за нацыянальнае адраджэнне рабіўся ўсё мацнейшым, суполкі беларусаў пачалі калоцца на «сваіх» і «чужых» і г.д. Таму правядзенне з'езду патрабавала ад кіраўніцтва ЗБС вялікіх намаганняў і нерваў. Прайшоў ён непараўнальна больш сціпла — было толькі 123 прадстаўнікі замежжа, бо многія ўдзельнікі мінулай сустрэчы адмовіліся ехаць у краіну з такім рэжымам.

У далейшым праца ЗБС рабілася ўсё цяжэйшай. Уладныя структуры стараліся стварыць альтэрнатыву «Бацькаўшчыне», і нават у 1999 годзе абвясцілі, што пачала працаваць Міжнародная асацыяцыя «Святло Радзімы». Але ЗБС «Бацькаўшчына» жыло і, нягледзячы на новыя «камедыі» з памяшканнем, правяло Трэці з'езд беларусаў свету. У далейшым ЗБС «Бацькаўшчына», як і Скарынаўскі навукова-асветны цэнтр, было пазбаўлена памяшкання, але актыўную працу працягвала. ЗБС працягвае праводзіць шматгранную дзейнасць па аб'яднанні беларусаў свету, у якой бярэ ўдзел вялікая колькасць шчырых сыноў Бацькаўшчыны і замежжа, адданых здзяйсненню нацыянальнай беларускай ідэі.

### Топ–5 значных падзей у гісторыі «Бацькаўшчыны»

Першы з'езд беларусаў свету. Ён даў штуршок да кансалідацыі беларусаў у Беларусі і за мяжой.

Аднаўленне крыжа Ефрасінні Полацкай. Гэта была ініцыятыва «Бацькаўшчыны», на пазнейшым этапе далучылася праваслаўная царква, дзяржава.

Заснаванне серыі «Бібліятэка «Бацькаўшчыны». За гэты час выйшла 19 кніг. Таксама па-за серыяй выйшла ў свет 37 кніг на гістарычную, літаратурна-мастацкую тэматыку, 8 дзіцячых.

Кампанія «Будзьма беларусамі!». Скіраваная на тое, каб беларусы ўнутры краіны і па-за яе межамі цанілі самабытнасць, пачуццё годнасці, мелі яснае бачанне перспектывы і імкнуліся быць аб'яднаным народам.

Зрух у прыняцці заканадаўства аб беларусах замежжа. Пытанне аб падрыхтоўцы закона, які рэгулюе прававыя адносіны паміж метраполіяй і беларусамі замежжа, было ўзнята яшчэ ў 2001 годзе, але праца над законапраектам далёка не зрушылася. Напрыканцы 2009 года кіраўніцтва Бацькаўшчыны» атрымала запрашэнне да ўдзелу ў працы рабочай групы па падрыхтоўцы праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб беларусах замежжа».

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 18 КАСТРЫЧНІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.15** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** «У цэнтры ўвагі».
**10.35** «Культурныя людзі».
**11.05** Меладраматычны серыял «Маруся».
**12.10** Драма «Кука» (Расія).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**16.30** Nota Bene.
**17.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.40** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.50, 01.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**21.00** Панарама.
**21.55** «Актуальнае інтэрв'ю».
**22.10** Камедыйны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША).
**23.30** Крымінальны баявік «Адрэналін».
**01.10** Дзень спорту.
**01.25** «Хакей для ўсіх».

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Жыць здорава!».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шальны анёл». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Дзікі маладняк».
**16.50** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Ток-шоў «Выбар».
**22.10** Прэм'ера. «Галасы».
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** Матафрыстайл. Сусветная серыя.
**00.35** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Сакрэтныя гісторы».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУра!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Прэм'ера! Фільм «Код апакаліпсісу». Расія, 2007 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Ахоўнік». ЗША, 2006 г.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.05** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік.
**12.10** Пра мастацтва.
**12.40** Школа рамонту.
**13.40** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.35** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Тэлебарометр.
**15.25** Простыя практыкаванні (Расія).
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.45** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург)-Дынама (Мінск). У перапынку: «Калыханка».
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.25** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.35** Авертайм.
**00.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**01.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Леанід Быкаў. На апошнім дыханні». Дакументальны фільм.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** Тэлесерыял «Дворык».
**13.25** «Гарадок».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Пакой смеху».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Сэрца маці».
**22.20** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.05** Прэм'ера. «Гарадок».

**НТВ**

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Серыял «Граф Крастоўскі».
**15.10** «Цуд-людзі».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** Сёння.
**23.55** «Сумленны панядзелак».
**00.50** «Школа зласлоўя».

**EUROSPORT**

**09.30** Марафон (Польшча, Познань).
**10.30** Тэніс. Турнір WTA у Аўстрыі (Лінц). Фінал.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**15.45** Вось дык так!!!
**16.00** Веласпорт. Тур Ламбарды (Італія).
**17.30** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). Дзень 1-ы.
**19.00** Футбол. «Еўрагалы». Часопіс.
**19.45** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**21.15** Футбол. «Еўрагалы». Часопіс.
**21.30** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**23.30** Футбол. «Еўрагалы». Часопіс.
**00.15** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**01.45** Веласпорт. Тур Ламбарды (Італія).

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Каранацыя Вітаўта. Няспраўджаныя магчымасці».
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** ПраСвет.
**08.20** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак Кастыліі».
**08.50** Прыватная калекцыя.
**09.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.25** Басаног па свеце (спазнаваўчая праграма): «Новая Гвінея, 1969», ч. 2.
**09.55** Дакументальная гадзіна: «Рэнэ», дак. фільм, 2009 г., Чэхія.
**10.50** «Малая Масква», тэлесерыял.
**11.40** Фільматэка майстроў: «Дом дурняў», драма, 2002 г., Расія.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**17.35** «Малая Масква», тэлесерыял.
**18.25** Госць «Белсату».
**18.40** Невядомая Беларусь: «Свіцязь, горад на дне возера», дак. фільм, 2010 г.
**19.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.20** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.00** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пагоня за праўдаю», дак. фільм, Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.40** Фільматэка майстроў: «Дом дурняў», драма, 2002 г., Расія.
**23.25** Аб'ектыў.

## 19 КАСТРЫЧНІКА, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.10, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** «Актуальнае інтэрв'ю».
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «Рабіны гронкі пунсовыя» (Украіна). 1-я серыя.
**14.05** «Ход у адказ» Ток-шоў.
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Аўташкола.
**16.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**17.15** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Рэал-Мілан. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**01.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Арсенал-Шахцёр.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Браты-дэтэктывы». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Уцёкі».
**22.15** Прэм'ера. «Згарым. Змерзнем. Выжывем».
**23.15** Нашы навіны.
**23.45** Навіны спорту.
**23.50** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.25** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.1** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** СТБ прадстаўляе: «Кажа і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.00** Фільм «Код апакаліпсісу». Расія, 2007 г.
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха».
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2».
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Меч».
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** Прэм'ера! «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**23.50** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі».

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**11.35** Авертайм.
**12.05** «Запал па культуры».
**12.50** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.45** Прыгодніцкая кінааповесць («Беларусьфільм»).
**14.55** Мультсерыял.
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.20** Простыя практыкаванні (Расія).
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.45** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.50** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. Мінск-2006 (Беларусь) - Хонка (Фінляндыя). Прамая трансляцыя.
**20.50** Калыханка.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Беларуская часіна.
**22.15** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.55** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** «Спорт-кадр».
**23.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Па той бок жыцця і смерці. Пекла». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** Тэлесерыял «Дворык».
**12.20** Тэлесерыял «Сэрца маці».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Сэрца маці».
**22.20** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм'ера. «Загадкавыя суседзі. Крумкачы». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Рускія сенсацыі».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Граф Крастоўскі».
**15.10** «Жывуць жа людзі!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.25** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. «Спартак» (Расія)-»Чэлсі» (Англія). Прамая трансляцыя.
**21.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**22.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.50** «Вочная стаўка».
**00.45** «Асабліва небяспечны!».

**EUROSPORT**

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. «Еўрагалы». Часопіс.
**10.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**15.45** Футбол. «Еўрагалы». Часопіс.
**16.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**18.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі. Дзень 2-і.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** «Алімпійскія гульні. Лондан». Часопіс.
**20.15** Футбол. «Еўрагалы». Часопіс.
**21.00** Бокс.
**22.00** Бокс. Міжнародны турнір у ЗША.
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**00.15** Ралі. Ралійная серыя IRC у Вялікабрытаніі (Абердзін, Шатландыя). Агляд.
**00.45** Матаспорт на выходных.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пагоня за праўдаю», дак. фільм, 2002 г., Польшча.
**09.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.35** Невядомая Беларусь: «Свіцязь, горад на дне возера», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**10.00** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**10.30** «Наўскач», маст. фільм, Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 7 серыя.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял: «Скарб».
**18.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.45** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Каранацыя Вітаўта. Няспраўджаныя магчымасці».
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.10** ПраСвет.
**20.35** Вагон.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Жалезныя лэдзі Ліберыі», 2007 г, ЗША.
**22.30** «Доктар Марцін», серыял: 7 серыя.
**23.15** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 20 КАСТРЫЧНІКА, СЕРАДА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.35** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.25** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2010».
**12.10** Меладрама «Рабіны гронкі пунсовыя» (Украіна). 2-я серыя.
**13.45** Відэафільм АТН «Дуброўна-таямніцы сівога Дняпра» цыклу «Зямля беларуская».
**14.05** Здароўе.
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Дак. серыял «Гараджане»: Барселона».
**16.30** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная перадача.
**17.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.40** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Інтэр-Тотэнхем. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
**01.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Ліён-Бенфіка.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.30** Навіны спорту.
**11.10** «Браты-дэтэктывы». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.05** «Гаражы».
**22.15** Асяроддзе пасялення.
**23.35** «Справа часу».
**00.10** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.00** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Меч».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха».
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2».
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Новыя падарожжыі дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Меч».
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** Прэм'ера! «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**23.50** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі».

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.40** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Камедыя «Афоня» (СССР).
**12.25** Спорт-кадр.
**12.55** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**13.45** Медычныя таямніцы.
**14.20** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.15** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Камедыя «Афоня» (СССР).
**20.50** «Калыханка».
**21.10** Тэлебарометр.
**21.15** Беларуская часіна.
**22.20** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** Рэальны свет.
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

---

**07.00** Канцэрт «Лепшыя песні - 2008».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Папялушка саюзнага значэння. Людміла Сенчына». Дак. фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Дворык».
**12.05** Тэлесерыял «Сэрца маці».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Гарадок».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Сэрца маці».
**22.20** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм'ера. «Не спрачайся з Богам. Анатоль Рамашын». Дак. фільм.

---

**08.55** Футбол. Агляд дня.
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Развод па-руску».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Прыгодніцкі серыял «Граф Крастоўскі».
**14.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.35** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.55** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. «Панаціякос» (Грэцыя)-»Рубін» (Расія).

---

**09.30** «Прыродная энергія». Часопіс.
**09.35** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**10.00** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**10.30** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). Дзень 2-і.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**16.00** Спідвэй. Гран-пры (Харватыя, Кралявец).
**17.00** Спідвэй. Гран-пры (Данія, Капенгаген).
**18.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). Дзень 3-і.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** «Еўраспорт» за чыстую планету».
**20.40** Абранае па серадах.
**20.45** Конны спорт. Кубак свету па канкуры ў Нарвегіі (Осла).
**21.45** Навіны коннага спорту.
**21.50** Гольф. Тур PGA. Турнір Frys. com Open.
**22.50** Гольф. Мастэрс (Партугалія, Віламора).
**23.20** Гольф-клуб.
**23.25** Абранае па серадах. Госць тыдня.
**23.35** Ветразевы спорт. Рэгата Medcup (Італія, Кальяры).
**00.05** Яхт-клуб.
**00.10** Абранае па серадах.
**00.20** «Спартовае вандраванне». Часопіс.
**00.25** Часопіс «Спартовы вандроўца».
**00.35** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**01.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі. Дзень 3-і.
**02.00** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**02.25** «Прыродная энергія». Часопіс.

---

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Сальда (эканамічная праграма).
**08.05** Тыдзень з радыё «Свабода».
**08.35** ПраСвет.
**09.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.15** Беларусы ў Польшчы.
**09.30** Вагон.
**09.35** «Бульбаны», мультсерыял: «Скарб».
**09.40** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**10.10** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Жалезныя лэдзі Ліберыі», 2007 г, ЗША.
**11.05** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Каранацыя Вітаўта. Няспраўджаныя магчымасці».
**11.15** «Доктар Марцін», серыял: 7 серыя.
**12.00** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 7 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**17.35** «Доктар Марцін», серыял: 7 серыя.
**18.25** «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**19.20** Вагон.
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах.
**20.10** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Новая Гвінея, 1969», ч. 1.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Тры кіламетры да неба», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**21.40** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак Кастыліі».
**22.05** «Язда», маст. фільм, 1994 г., Чэхія.
**23.40** Аб'ектыў.

## 21 КАСТРЫЧНІКА, ЧАЦВЕР

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 15.55, 17.05, 18.00, 19.00, 23.10** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** Відэафільм АТН «Бяроза-дрэва гаючасці» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Дэтэктыў «Без адмысловых прыкмет» (Украіна).
**14.05** Дакументальны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**16.00** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**16.35** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**17.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.50, 01.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Камедыйны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША).
**23.25** «Эпоха».
**23.55** Прэм'ера. Камедыя «Утаймаванне свавольных» (Расія).
**01.45** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Браты-дэтэктывы». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Банды».
**22.15** АНТ прадстаўляе: «Міжземнаморскі запал». Канцэрт.
**23.30** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.05** Нашы навіны.
**00.20** Навіны спорту.
**00.25** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.15** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Меч».
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха».
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2».
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Меч».
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** Прафесійны бокс.
**23.55** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Заключная серыя.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Меладрама «Сяброўка Восень» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**12.25** Жансавет.
**13.05** «Бітва экстрасэнсаў».
**14.05** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.00** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**15.15** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Простыя практыкаванні (Расія).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Беларуская часіна.
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Зеніт-Хайдук. Прамая трансляцыя.
**21.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Шэрыф-БАТЭ. Прамая трансляцыя.
**00.05** Час футболу.
**00.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

---

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Фатальны круіз. Таямніца катастрофы на Волзе». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Дворык».
**12.05** Тэлесерыял «Сэрца маці».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Сэрца маці».
**22.20** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм'ера. «Паядынак».

---

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** Футбол. Агляд дня.
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.20** «Праспявана ў СССР».
**12.10** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Містычная меладрама «Лабірынты хлусні».
**15.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**20.50** Моладзевая камедыя «Спатканне ўсляпую».
**22.45** «Капітал.ru».
**23.40** «Вочная стаўка».
**00.35** «Асабліва небяспечны!».

---

**09.30** Часопіс «Спартовы вандроўца».
**09.35** Часопіс «Еўраспорт» за чыстую планету».
**10.00** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**10.30** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). Дзень 3-і.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**16.00** Спідвэй. Гран-пры (Італія).
**17.00** Спідвэй. Гран-пры (Польшча, Быдгашч).
**18.00** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**18.30** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). 1/8 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Боўлінг. Тур PBA. ЗША. Часопіс.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Klash. Германія.
**00.05** Вось дык так!!!
**00.10** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**00.40** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**01.45** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). 1/8 фіналу.

---

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Без рэтушы: «Тры кіламетры да неба», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**08.10** Госць «Белсату».
**08.25** «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**09.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**09.25** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак Кастыліі».
**09.50** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Новая Гвінея, 1969», ч. 1
**10.15** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**10.45** Доктар Марцін», серыял: 7 серыя.
**11.30** «Язда», маст. фільм, 1994 г., Чэхія.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Зорны пірат», тэлесерыял.
**17.35** «Язда», маст. фільм, 1994 г., Чэхія.
**19.05** Асабісты капітал.
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Новая Гвінея, 1969», ч. 2.
**20.35** Хто ёсць кім?: «Інтымны працэс», рэпартаж, 2008 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**21.50** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 3 серыя.
**22.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Сакрум», дак. фільм, 2007 г., Расія–Польшча.
**23.10** Аб'ектыў.

ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №10 (48) (кастрычнік)

www.lit-bel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

Анонс

«ПАДЗЕІ»: навіны літаратурна-грамадскага жыцця ... с. 2
«ПАЭЗІЯ»: вершы Васіля ПАНКРАТАВА ... с. 3
«ПАМЯЦЬ»: успаміны Сяргея ЗАКОННІКАВА пра Уладзіміра КАРАТКЕВІЧА ... с. 4
«ПЕРАКЛАДЫ»: старонкі новага нумара інтэрнэт-часопіса «ПРАЙДЗІСВЕТ» ... с. 5–6
«ПАЭЗІЯ»: вершы Рагнеда МАЛАХОЎСКАГА ... с. 7
«ПРОЗА»: «Мост праз Дунай» Міколы ІЛЬЮЧЫКА ... с. 8–9
«ГУМАР»: гарэзныя прыпеўні Алеся НАЎРОЦКАГА ... с. 10
«ШКАЛЯРЫЙ»: Уладзімір АРЛОЎ — пра разгром татараў пад Клецкам ... с. 11
«ЭСЭ»: «Чарэя Мілаша» ад Сяргея ХАРЭЎСКАГА ... с. 12
«СШЫТАК»: вершы Эдуарда ДУБЯНЕЦКАГА і Алеся МАКРАЦОВА ... с. 13
«ЧЫТАЛЬНЯ»: дэбютная аповесць Сяргея ЕГАРЭЙЧАНКІ ... с. 14–15
«ДЗЕЯПІС»: новыя выданні праз анонсы часопіса «ДЗЕЯСЛОЎ» ... с. 16

ПАМЯЦЬ

# АХОЎНАЯ ЗОРКА

## ЗГАДКІ ПРА УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА



Сяргей ЗАКОННІКАЎ

**Вясной 1984 года ў рэанімацыйнай палаце, калі я паіў з лыжачкі журавінавым морсам спакутаванага, знясіленага хваробаю Валодзю, ён прашаптаў: «Помніш, што напісаў табе на сваёй «Чазеніі»? Хай будзе так...». Як можна было забыцца! Яшчэ са студэнцтва гэты самы беларускі беларус стаў для мяне святым чалавекам.**

Я помню слову пра «далёкаўсходняе дрэва жыцця» і наказ. А яшчэ ў душы назаўсёды засталіся радкі з непаўторнай аповесці: «Украніцца на камяністым, неўладкаваным беразе жыцця, мудра, уладна, пяшчотна свідраваць каранямі зямлю. Араць яе для будучыні... Як чазенія...». Так апантана, самаахвярна жыў і пісаў дзеля Беларусі свае неўміручыя кнігі Уладзімір Караткевіч.

Ён застаецца самым любімым і чытаемым пісьменнікам. У ягоных творах жывуць мудрасць і развага, якія падабаюцца людзям сталага веку, рамантыка і прыгодніцтва, якія імпануюць моладзі, дзецям, рыцарства і мілосць, ласка і пяшчота, якія зачароўваюць жанчын, дзяўчат.

Высокім інтэлектам, энцыклапедычнай дасведчанасцю, багатай фантазіяй, выключнай інтуіцыяй пазначана ўся творчасць Караткевіча, пачынаючы ад верша «Машэка», які быў надрукаваны ў 1955 годзе ў часопісе «Полымя», і да пасмяротнай кнігі з сімвалічнай назвай «Быў. Ёсць. Буду.». Уражвае ягоная працавітасць, шматграннасць таленту, які бліскуча змог увасобіцца ў паэзіі, гістарычных раманах і аповесцях, апавяданнях, эсэ, нарысах, публіцыстыцы, п'есах, кінасцэнарыях, крытыцы, малюнках. Такое бывае надзвычай рэдка і, як кажуць у народзе, ідзе ад Бога.

У майго пакалення, якое прыйшло ў свет адразу пасля самай крывавай вайны XX стагоддзя, імкненне да праўды і справядлівасці, нацыянальная свядомасць, чалавечая годнасць выраслі пад крылом не толькі Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, але і П. Панчанкі, В. Быкава, У. Караткевіча. Якраз у час нашага студэнцтва адна за другой выходзілі іхнія адметныя, прыцягальныя кнігі. «Пры святле маланак» (Панчанка), «Мёртвым не баліць» (Быкаў, у часопісе «Маладосць»), «Каласы пад сярпом тваім» (Караткевіч) — адны толькі гэтыя творы абуджалі душу, беспаваротна рабілі нехлямяжных, наіўных вясковых хлопцаў і дзяўчат, гадаваных у нястачы, у пасляваенным холадзе і голадзе, выхаваных ужо зрусіфікаванай школаю, перакананымі беларусамі. За такое шчасце, як гаварыў яшчэ адзін любімы мною дарадца Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі, «і за гарою пакланюся» самай светлай часіне ў жыцці — студэнцтву, сваім выдатным літаратурным настаўнікам.

Любоў да роднага слова, якую запалілі ў сэрцы слаўныя людзі і творцы, я стараўся перадаць сваім вучням, калі пачаў працаваць завучам-арганізатарам, выкладаць беларускую мову і літаратуру ў Клетнаўскай СШ Барысаўскага раёна. Мы выпускалі насценную літаратурную газету, рукапісны часопіс, дзе выяўлялі творчыя здольнасці і старшакласнікі, і малыя, двойчы іхнія вершы, замалёўкі друкавала раённая газета. Пра такі выхаваўчы вопыт расказала «Комсомольская правда». Першым, хто паведаміў і парадаваўся за мяне, быў Караткевіч.

Пасля катастрофы аўтобуса, у якім я ехаў у Барысаў атрымліваць бланкі атэстатаў для выпускнікоў школы, мне давялося спыніць настаўніцкую працу і перабірацца да бацькоў. Левае пляча і рука восем месяцаў былі ў гіпсе. Але доўга хварэць на радзіме не далі. Спачатку працаваў у раённай газеце «Патрыёт», а затым выбралі другім сакратаром Вушацкага райкама камсамола. Хацелася зрабіць нешта добрае для моладзі ў яе культурным развіцці. Пачаў прывучаць хлопцаў і дзяўчат да беларускага літаратурнага друку, наладжваў сустрэчы з артыстамі, журналістамі і, канешне ж, з пісьменнікамі-землякамі.

А сюрпрызам стаў прыезд Уладзіміра Караткевіча. Ліпеньскай суботняй раніцою я павінен быў ехаць з моладдзю райцэнтра на касьбу. Прачнуўся рана, пагаліўся, паснедаў і пашыбаваў да плошчы. Ні народу, ні машын яшчэ не было, а на ганку райкама сядзеў і драмаў адзінокі чалавек. Падышоў бліжэй і вачам не магу паверыць — Караткевіч! Дакрануўся да пляча: «Уладзімір Сямёнавіч, гэта вы? А чаму тут мэнчыцеся? Чаму не зайшлі да мяне?». Ён заўсміхаўся: «Здароў! Ага, зараз я табе на пастой прывяду цэлую банду. Бачыш, колькі вунь там вучоных у аўтобусе кімарыць? Гэта Акадэмія навук вывучае помнікі гісторыі. Дайшла чарга і да вашага Вушацкага раёна. Тут у групе Валя мая, ну дык і я рашыў паехаць з імі. А я, дарэчы, цябе чакаў, вартаўнік сказаў, што хутка будзеш. Чакаў, ды і задрамаў. Слухай, Сярожа, памажы з транспартам. Мы падзелімся па маршрутах, хутчэй усё будзе зроблена».

Я радаваўся прыезду Караткевіча, а яшчэ таму, што якраз была магчымасць дапамагчы. «Не турбуйцеся, нешта прыдумаем. А пакуль што гарантую наш «газік». Пайшлі да мяне, хоць крыху перакусіце», — запрасіў нечаканага, дарагога госця.

У кабінеце згатаваў кавы, знайшоў нейкае печыва, пасадзіў у крэсла: «Сілкуйцеся!». А сам прыхапіў даведнік «Пісьменнікі Савецкай Беларусі» і падняўся на чацвёрты паверх. Я ведаў, што першы сакратар райкама партыі ў летнія дні прыходзіць на службу рана. «Васіль Кірылавіч, добры дзень! У мяне добрая навіна. Караткевіч да нас прыехаў!» — выгукнуў з парога. Той падняў вочы ад папераў, зняў акуляры і разгублена перапытаў: «Караткевіч? Гэта які? Рэктар педінстытута?». Я зразумеў, што нездарма прыхапіў даведнік. «Ды не. Гэта выдатны наш пісьменнік Уладзімір Караткевіч. Яму транспарт трэба, давайце дапаможам слаўнаму чалавеку. Можна, я зараз яго прывяду, пагаворыце?»

Караткевіч ісці да Пасаха не хацеў: «Ведаю я іх, гэтых партыйных чыноўнікаў. Усе далдоны і зануды. Будзе мне зараз пра надої і прывагі расказваць. Лепш бы ты сам дамовіўся. Ды і паглядзі, як я апрануты! Каля гэтых помнікаў усё папарваў ушчэнт». Апратка ў Караткевіча і сапраўды была вясёлаю. Зверху, праўда, мелася модная махровая, салатавага колеру майка з замочкам, затое ніз «падгуляў» — зліняла, выцвілае на сонцы сіняе трыко, дзіркі ў якім «зашыты» тонкім медным дротам. Але я супакоіў: «Нічога, Уладзімір Сямёнавіч! У нас тут на ўборы не зважаюць. Галоўнае — сам чалавек».

Транспартную праблему мы вырашылі хутка. Дамовіліся, што экспедыцыя будзе карыстацца, акрамя нашага камсамольскага, яшчэ і «газікам» Пасаха, а ён перасядзе на «Волгу», якую ў райкаме мелі для выездаў у Віцебск і Мінск. Караткевіч пасля дыфірамбаў у свой адрас сядзеў у кабінеце сакратара ашаломлены. Такога ён не чакаў.

Тыя ліпеньскія дні 1972 года, якія згадваю, запомніліся не аднаму мне, а і многім маім землякам, бо Караткевіч сустракаўся і гутарыў з імі паўсюль: проста на вясковых вуліцах, у хатах, а з моладдзю каля вечаровага вогнішча на беразе возера Вечалле. Я пабачыў ягоную незвычайную дапытлівасць. Ён абгледзеў усе вушацкія валатоўкі, рэшткі храмаў, помнікі, могілкі, абмацаў, як кажуць, кожную цаглінкуі камень.

Валодзя быў выдатным апавядальнікам і ўмеў слухаць іншых. Столькі цікавага, невядомага пра гісторыю Беларусі, пра многія куточкі роднага краю пачуў я ад яго ў тыя дні і пасля! На маё здзіўленне: «Адкуль такія веды?» Караткевіч аднойчы адказаў так: «Я ж, браце, вандроўнік заядлы. Колькі пераходжана гэтымі хворымі нагамі, колькі перабачана гэтымі стомленымі вачыма! А яшчэ архівы. Табе і ў страшным сне не прысніцца, колькі пылу пераглытаў я ў сховішчах, колькі старонак дакументаў перагартаў. Не толькі дома, але і ў Кіеве, Львове, Вільні, Ленінградзе, і далёка за мяжою».

Начавалі Валодзя з Валяю ў маёй невялічкай кватэры. На падлогу паслалі свежае сена, накрылі яго капамі, атрымалася ўтульная пасцеля, у якой добра было і размаўляць, і засынаць. Караткевіч быў мастак на ўсялякія прыдумкі. Маю маленькую дачушку Алёнку ўразіла, як дзядзька Валодзя па-майстэрску выконваў розныя мелодыі на дзіўным музычным інструменце... сваіх надзьмутых шчоках.

Працяг на стар. 12 (4) ▸

НАВІНЫ



Фота Наталлі Герасімюк

# «БАБІНА ЛЕТА НІНЫ МАЦЯШ»

**Так, «Бабіна лета ў Белаазёрску», назвала вянок санетаў выдатная беларуская паэтэса Ніна Мацяш. Яе зямное жыццё перапынілася два гады таму. І вось ад гэтага кастрычніка тая назва будзе менавацца паэтычнае штогадовае літаратурнае свята, якое праводзіцца ў гонар славутай паэтэсы ў яе родным горадзе.**

6 кастрычніка Белаазёрск стаў міжнародным цэнтрам беларускай літаратуры, бо на «Бабіна лета Ніны Мацяш» з'ехаліся не толькі пісьменнікі з Мінска (Анатоль Вярцінскі, Васіль Жуковіч, Сяргей Панізьнік, Алесь Пашкевіч, Алесь Разанаў, Міхась Скобла), з Брэста і Берасцейшчыны (Іван Мельнічук, Мікола Папека, Лявон Валасюк, Мікола Аляхновіч, Генадзь Праневіч, Анатоль Крэйдзіч ды іншыя), але і з Польшчы ды Бельгіі. Паэтычнае свята робіцца міжнародным, і не выпадкова: светлай памяці Ніна Мацяш была не толькі чуллівым і ўзнёслым лірыкам, але і працавітым перакладчыкам, якая перастварыла на родную мову сотні твораў замежных паэтаў і празаікаў. А яшчэ кволая паэтэса выявіла і ўзорную грамадзянскую моцу, калі ў апошнія гады свайго жыцця ўзначальвала і апекавала Берасцейскае абласное аддзяленне Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Госці наведалі мемарыяльную кватэру Ніны Мацяш, усклалі кветкі на магілу паэтэсы.

Вялікая зала гарадскога Дома культуры была запоўненая. Прыйшлі пакланіцца памяці паэтэты настаўнікі, вучні, бібліятэкары, землякі. І, безумоўна, блізкія сябры і родзічы.

«Яе шанавалі і любілі, ёю ганарыліся», — адзначыў кіраўнік Брэсцкага аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў Іван Мельнічук. — Гэта дарагі нам чалавек, мы проста ганарымся тым, што ў нас былі такія людзі. Я б сказаў, што гэта ў міжнародным плане вядомы чалавек, яна шмат зрабіла перакладаў, каля 20 кніжак перакладаў пісьменнікаў розных краін. Гэта славутасць, якую нельга забываць».

У гарадскую бібліятэку Белаазёрска, якая цяпер носіць імя Ніны Мацяш, старшыня СБП Алесь Пашкевіч перадаў нумары берасцейскага абласнога альманаха «Жырандоль», ініцыятарам выдання і рэдактарам якога была Ніна Язэпаўна.

Тры гадзіны ў вялікай зале Дома культуры гучалі ўспаміны і вершы сяброў па пяры Ніны Мацяш: Анатоля Вярцінскага, Сяргея Панізніка, Алеся Разанава, Васіля Жуковіча, Міхася Скоблы, Лявона Валасюка, Міколы Папекі, Генадзя Праневіча, Міколы Аляхновіча і іншых. Гучаў голас самой Ніны і страны яё песні…



# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПЛАТФОРМА КУЛЬТУРЫ?

**У Беларусі ствараецца нацыянальная платформа грамадскіх аб'яднанняў па пытаннях культуры ў межах рэалізацыі праекта АБСЕ «Развіццё патэнцыялу для супрацоўніцтва дзяржаўных і грамадскіх арганізацый».**

Першае пасяджэнне ўдзельнікаў платформы незалежных грамадскіх аб'яднанняў па пытаннях культуры прайшло 1 кастрычніка. У ім прынялі ўдзел кіраўнікі і прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, якія працуюць у сферы культуры, сярод якіх Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў, Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Саюз беларускіх пісьменнікаў, Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», моладзевае грамадскае аб'яднанне «Гісторыка», Рэспубліканскі камітэт прафсаюзаў працаўнікоў культуры, дэпутаты парламента, члены камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе, а таксама члены Грамадска-кансультатыўнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта.

Як паведаміў БелаПАН кіраўнік праекта АБСЕ, старшыня праўлення Грамадскага аб'яднання «Цэнтр СКАФ», член Грамадска-кансультатыўнай рады Юрый Загуменнаў, удзельнікі пасяджэння абмяняліся меркаваннямі па актуальных праблемах захавання культурнай спадчыны і развіцці нацыянальнай культуры. Яны прывіталі стварэнне пры Міністэрстве культуры органаў дзяржаўна-грамадскага ўзаемадзеяння – Грамадскай наглядальнай камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і Грамадскай рады па справах беларускай дыяспары. У той жа час яны адзначылі неабходнасць наладжвання эфектыўнага механізму гэтага ўзаемадзеяння, каб грамадзянская супольнасць магла рэальна ўплываць на працэсы, якія адбываюцца ў сферы культуры.

На пасяджэнні было прынята рашэнне працягнуць працу па стварэнні кансалідаванай пазіцыі грамадскіх аб'яднанняў па пытаннях культуры і звярнуцца з прапановай да кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея занесці ў тэматычны план працы Грамадска-кансультатыўнай рады пытанні развіцця нацыянальнай культуры.

# МАРЫЁ ВАРГАС ЛЬЁСА — НОБЕЛЕЎСКІ ЛАЎРЭАТ

**Лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры ў 2010 годзе стаў перуанскі празаік, драматург і палітык Марыё Варгас Льёса. 74-гадовага пісьменніка ўзнагародзілі з вельмі блізкай і вуху беларускіх літаратараў фармулёўкай: «за дэталёвае апісанне структуры ўлады, яскравыя вобразы супраціву і за яркае выяўленне чалавека, які паўстаў, змагаецца і цярпіць паражэнне».**



Марыё Варгас Льёса праславіўся дэбютным раманам 1963 года «Горад і сабакі» (кніга выклікала скандал на радзіме ў Перу, а ў колішнім СССР была культавай сярод моладзі). Сярод іншых кніг празаіка — «Зялёны дом», «Шчанюкі», «Гутарка ў саборы», «Капітан Панталеон і рота добрых паслуг», «Хто забіў Паляміна Малера?», «Цётачка Хулія і пісака», «Вайна канца свету», «Гісторыя Майты», «Пахвальнае слова мачысе», «Сшыткі дона Рыгаберта», «Прыгоды брыдкага дзяўчаці». Варгаса Льёсу лічаць адным з найбуйнейшых лацінаамерыканскіх празаікаў XX стагоддзя і ставяць у адзін шэраг з такімі літнаватарамі, як Борхес, Гарсія Маркес і Картасар.

Новы лаўрэат — член Іспанскай каралеўскай акадэміі, ганаровы доктар шэрагу ўніверсітэтаў Еўропы і Амерыкі, кавалер Ордэна Ганаровага легіёна, лаўрэат прэмій прынца Астурыйскага і Сервантэса, а таксама прэміі Чына дэль Дука.

Марыё Варгас Льёса нарадзіўся ў 1936 годзе ў Перу, апошнія гады жыве ў Мадрыдзе. У 1990 годзе быў кандыдатам у прэзідэнты Перу ад партыі «Дэмакратычны фронт».

Дыплом лаўрэата і прэмію Марыё Варгас Льёса атрымае з рук шведскага караля Карла XVI Густава на цырымоніі, якая пройдзе ў Стакгольме ў дзень смерці заснавальніка прэміі Альфрэда Нобеля 10 снежня.

У спісе прэтэндэнтаў на Нобелеўскую прэмію застаюцца і беларусы: Святлана Алексіевіч і Рыгор Барадулін. Хаця поўны пералік застаецца засакрэчаным, вядома, што сёлета ў яго ўвайшоў семдзесят адзін пісьменнік. Вялікія шанцы атрымаць новага Нобеля па літаратуры маюць палякі, літаратуру якіх прадстаўляе Адам Загаеўскі. Яго імя брытанская букмекерская кампанія «Ladbrokes» называла ў ліку іншых магчымых пераможцаў 2010 года — Томаса Транстрэмера са Швецыі, Ко Ун з Паўднёвай Карэі, сірыйца Алі Ахмад Саіда.

Сярод іншых кандыдатаў былі пісьменнікі і больш вядомыя: Умберта Эка, Мілан Кундэра, Харукі Муракамі. Сярод іх — і два расійскія: Бэла Ахмадуліна і Яўген Еўтушэнка.

# КОНКУРС «КАЗКА ДЛЯ КАРАТКЕВІЧА»

**Гэты конкурс ініцыяваў віцебскі тэатр «Лялька». Да ўдзелу запрашаюцца самыя юныя літаратары, акурат ва ўзросце гледачоў «Лялькі», якім у сярэднім ад 5 да 16 гадоў.**

Як адзначыла загадчыца літаратурнай часткі лялечнага тэатра, старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў Людміла Сіманёнак, ён прысвечаны 80-м угодкам Уладзіміра Караткевіча, якія адзначаюцца сёлета 26 лістапада.

Літаратары-пачаткоўцы могуць прапанаваць на разгляд журы адну-дзве казкі на беларускай мове агульным аб'ёмам не больш за 3 друкаваныя старонкі. Людміла Сіманёнак адзначыла, што найбольш высока будуць ацэнены творы з персанажамі беларускай міфалогіі, такімі, як цмок, ваўкалак, лясун і г.д.

Казкі можна дасылаць на электронны адрас тэатра, перасылаць па пошце і нават аддаваць дзяжурнаму адміністратару перад пачаткам лялечных прадстаўленняў — у «Лялцы» распачаўся новы тэатральны сезон.

Творы прымаюцца да 1 лістапада, а ўганараванне пераможцаў адбудзецца на пачатку снежня.

Гэта ўжо другі конкурс для юных літаратараў, які ладзіць тэатр «Лялька» — летась было арганізавана паэтычнае «спаборніцтва», пасля якога аўтары лепшых беларускамоўных вершаў атрымалі ганаровыя дыпломы ды кнігі ў падарунак.

**Матэрыялы старонкі падрыхтаваныя паводле Радыё Рацыя, Радыё Свабода, БелаПАН і ўласнай інфармацыі**

ВЕРШЫ

# ПАМІЖ МАЛПАЙ І АНЁЛКАМ

Васіль ПАНКРАТАЎ




Фота niadbaj.livejournal.com

## Вызваленне

*Вызваленне*
*З межаў маўлення.*
*Уносіць нястрымная хваля трызнення.*
*Натхненне*
*У несупраціўленні,*
*Але на шляху нас чакаюць здарэнні:*
*Скажэнні*
*Структуры сумлення*
*І розныя іншыя псіх-пагаршэнні.*
*З'яўленне*
*На тварах здзіўлення*
*У прадстаўнікоў твайго пакалення.*
*Вызваленне —*
*У вольным падзенні.*
*Рэчаіснасці глеба чакае сутыкнення.*

**09 снежня 2009**

## Яна

*У крамах калядныя зніжкі:*
*Словы кахання*
*Шматразовага выкарыстання,*
*Ружы і плюшавы мішка —*

*Усё гэта не варта цябе,*
*Усё гэта не растлумачыць,*
*Чаму сапраўды я вярнуўся.*

*Я вандраваў Адысеем,*
*Сімбадам, Улісам*
*І гэтак далей па спісе,*
*Шукаючы промні надзеі.*

*Угледзаўся ў люстэркі, і твары,*
*І чорныя хвалі,*
*Каб зразумець, што насамрэч істотна.*

*Патрэбных словаў няма,*
*Няма адпаведных прадметаў.*
*Але павер: для мяне ты —*
*Не толькі «ТЫ», але і «ЯНА».*

**18 снежня 2009**

## * * *

*Упусці мяне з галавою — у*
*Тлусты глей, у цёплую багну,*
*Абдымі чырвонымі плямамі*
*Ад пальцаў на спіне.*
*Трымай мяне галінамі дрэў,*
*Коўдрай травы.*
*На шчоках пакіне вадкасць*
*Свае сляды.*
*Пацалуй мяне ў вуха*
*Енкам вады,*
*У якую я кінуў камень.*
*Завядзі мяне ў ноч,*
*Краніся мохам маіх валасоў.*
*Тысячай шэптаў распавядзі,*
*Растлумач, як гэта —*
*«Быць жывым».*

**Студзень 2010**

## Розныя

*Мы з табой зрыфмаваныя белым вершам,*
*Недапасаваныя ў склоне і часе,*
*Непаралельныя і не перасякаемся —*
*Наўпрост у розных сістэмах каардынатаў.*
*Розныя пахі, розныя страхі і розныя сэнсы.*
*І розныя голасу тэмбры.*

*Кахацца з гумавай лялькай*
*Значна працей і бяспечней.*

**6 сакавіка 2010**

## Ганаровы донар сэрцаў

*Згубілася мапа дэмаркацыйнай зоны,*
*Я загадаў «Здавацца па ўсіх франтах!».*
*Кавалак белай анучы, каб загарнуць*
*у яе гонар.*
*Сэрцаў не будзе — загінуў апошні іх донар.*
*З пераламанымі крыламі —*
*болей не птах*
*Нарэшце вызваліўся з палону*
*Неба.*

**09 сакавіка 2010**

## Нізка і яшчэ ніжэй

*Хацелі новага,*
*Выпадковага,*
*Спазнаць бездані.*
*І панеслася:*

*Грукатам, коламі,*
*Рухамі кволымі,*
*Замшэлымі думкамі,*
*Стракатымі малюнкамі,*
*Карункамі,*
*Падарункамі*
*Брыдка-слізкімі,*
*Вершамі, нізкамі.*
*Як жа нізка мы*
*За жыццё хапаючыся ўпалі.*
*Потым хвалі*
*Нас калыхалі,*
*А мы не спалі*
*І не кахалі.*
*Стылі скура і смочкі,*
*Сядзелі моўчкі,*
*Абхапіўшы калені.*
*Глядзелі на цені,*
*На іх трымценне.*
*Вусціш ды захапленне.*
*Усе памкненні*
*Зледзянелі,*
*Вусны апусцелі,*
*Цягліцы знямелі.*
*Толькі холад па целе.*
*Спрэс колер шэры,*
*На пасмах шэрань.*
*Зачынi дзверы,*
*Пакінь час звонку.*
*Смех цішыні звонкі.*
*Усё, больш ужо нічога не зменіцца —*
*Давай выкінем словы ў сметніцу.*

**26 траўня 2010**

## Паміж малпай і анёлкам

*Хутчэй, глыбей, да дна.*
*Фінішная стужка.*
*Выцiснуць апошнія сокі.*
*Рабіць крокі,*
*Каб пакінуць сляды.*
*Бясконцая спроба напісаць на плоце*
*«Тут быў я, і я не такі, як ты».*
*Ёсць розныя сцежкі і розная хуткасць,*
*Але галоўнае:*
*Сваечасова спыніцца*
*На шляху ад малпы да анёлка.*

**27 ліпеня 2010**

## Завулак інфра-чырвоных ліхтароў

*Куфар уражанняў поўны.*
*Нават касмічная поўня*
*Болей не вабіць, каб пакарыцца.*
*Няма небяспекі спазніцца,*
*Ці памыліцца.*
*Бо ўвесь гэты свет*
*Пакінуў свой след*
*На ўнутраным баку маіх павекаў.*
*Апошняе падарожжа веку.*
*Апошняя мэта, апошні прытулак:*
*Знайсці свой інфра-чырвоных*
*ліхтароў завулак.*

**10 жніўня 2010**

## Ніхто не хоча быць Dr.Faustus. І я таксама

*Я качуся ўніз па схіле.*
*Засталіся яшчэ 133 мілі.*
*Ёсць вакансія спадарожніка,*
*Калі вы не занадта яшчэ асцярожныя.*
*Але ёсць умовы: не азірацца,*
*Не заплюшчваць вочы і не чапляцца*
*Рукамі за камяні і сцяблiны,*
*І за ўсялякія розныя там успаміны.*
*Выкінь з галавы кантроль,*
*Пакінь ззаду свой страх, свой боль.*
*Вызвалі розум, ад розуму вызваліся.*
*Адчуваеш, як раптам усё з рук*
*выслізнула?*
*Як знікла з-пад ног цвёрдая глеба?*
*Ты не ведаў? Гэта першы крок на неба.*
*Забыўся сказаць: ён звычайна і апошні.*
*У лепшым выпадку — 100 год*
*на шпітальным ложку.*
*У якасці лекаў — прымусова шторанак*
*Доза распушчальніку мозгу*
*на сняданак.*
*А таксама на абед і вячэру,*
*Пакуль ад цябе не застанецца ні халеры.*

*Ну дык што, хто са мной?*
*Дзе той экзістэнцыйны герой?*
*Што, гэта болей не модна?*
*Так, згодны.*
*Сам не разумею, навошта гэта трэба,*
*Нейкая падлеткавая бздура пра геніяў*
*і крокі ў неба.*

**30 жніўня 2010**

## Па́ра

*Астываю.*
*Пару з роту ў кулакі збіраю,*
*Хаваю ў кішэні.*
*Дазволь мне ўвайсці без запрашэння.*
*Сказаць хацеў штосьці.*
*Па словы ў кішэню лезу,*
*Ды там толькі ключоў жалеза.*
*Ды ўсё тая ж пара.*
*Больш нічога. Ізноў Сансара.*
*Добра, бяры маё дыханне.*
*Пакуль цёплае. На развітанне.*
*Ну а зараз — зарыемся ў шалік носам*
*І нырнем у Восень.*

▸ **ПАМЯЦЬ**

# АХОЎНАЯ ЗОРКА

## ЗГАДКІ ПРА УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

◂ **Працяг. Пачатак на стар. 9 (1).**

Потым Валодзя (адзін, з жонкаю, з сябрамі) часта бываў на Вушаччыне. Ён зблізіўся з маім бацькам, мамай, упадабаў наш родны дом, які стаіць у маляўнічай мясціне — на беразе возера Глыбачка. З дапамогай таты падрыхтаваў некалькі тэлеперадач пра Вушаччыну, яны рэгулярна ліставаліся.

У 1975 годзе мяне перавялі ў рэдакцыю газеты «Чырвоная змена» ў Мінск. Помнячы наказ Валодзі, я пакарыстаўся сваёй пасадай загадчыка аддзела сельскай моладзі і аб'ездзіў шмат куточкаў Беларусі. Пісаў рэпартажы, замалёўкі, нарысы пра маладых механізатараў, даярак, настаўнікаў, клубных і бібліятэчных працаўнікоў, а яшчэ стараўся не абмінуць ніводнага раённага музея, аглядаў ацалелыя храмы, старыя будынкі, паркі, сустракаўся і гутарыў з доўгажыхарамі. Гэтыя вандроўкі, непасрэднае дакрананне душою да сівой мінуўшчыны дапамаглі зразумець значнасць, маштаб усяго, што ўзнімала і даносіла да чытачоў самабытная, непаўторная творчасць Караткевіча. Ён вяртаў забытую і знявечаную душу народа, які мае права быць роўным паміж іншымі. Ён абуджаў нашую годнасць, патрыятычныя пачуцці і жаданне зрабіць хоць нешта добрае для «зямлі пад белымі крыламі», для ўсіх, хто жыве і будзе жыць тут:

*Абяцаюць нам новы раскошны дом,*
*Але ТУТ нам жыць і канаць,*
*Тут пад кожным навекі*
*забытым бугром*
*Нашы продкі забітыя спяць.*
*Яны аддалі нам меч і касу,*
*Слова з вуснаў, цяпер нямых…*
*І нам немагчыма пайсці адсюль*
*І пакінуць са смерцю іх.*

Калі перачытваеш Караткевіча, то заўважаеш, што самыя блізкія яму словы — Гонар, Годнасць, Сумленне, Праўда. Яго заўсёды турбавала думка: як захаваць, абараніць і ўмацаваць годнасць чалавека, на што яму абаперціся ў гэтым жыцці? Такім роздумам прасякнутыя ўсе кнігі пісьменніка. І ён знаходзіць адказ: нашая трываласць — у памяці, у павазе да матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларускага роду, у любові да роднай зямлі, у вернасці мудрым, гуманістычным традыцыям працавітых і вольналюбівых продкаў.

Вандроўкі па Беларусі (працаваў я яшчэ і ў газеце «Звязда»), заглыбленне ў яе гісторыю пераканалі мяне, што багатая мастацкая фантазія, рамантызм Караткевіча заўсёды маюць пад сабою рэальны грунт. Многія ягоныя аповеды, якія, дарэчы, на вялікі жаль, не сталі старонкамі кніг, нягледзячы на пэўную казачнасць і легендарнасць, таксама чыстая праўда. Напрыклад, палеская прыгажуня, рака Убарць, якую вельмі любіў Валодзя, сапраўды ў некалькіх месцах цячэ ў



гранітным ложы. Мне давялося ўбачыць грыбы, якія на глеі ў прыпяцкіх лазняках вымахваюць да паўметра…

Караткевічу жылося і працавалася няпроста. Гісторыя падае нам шмат прыкладаў, калі адданая, неймаверная па сіле любоў вялікага сына да свайго народа, да роднае зямлі натыкаецца на неразуменне, на адкрытую варожасць абмежаваных, неадукаваных, але «звышпільных» сучаснікаў, якія рознымі шляхамі ўціскаюцца ў высокія крэслы і адчуваюць сябе ўладарамі жыцця.

Нямала крыві і нерваў папсавалі Валодзю такія «ўладары», навешваючы на яго ярлык нацыяналіста. Я гэта добра ведаю, бо давялося працаваць загадчыкам сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ, часта адстойваць лепшыя кнігі беларускіх пісьменнікаў ад нападу суседняга аддзела прапаганды і агітацыі, бачыць цемрашальскую валтузню мінскіх і маскоўскіх цэнзараў у цывільным і ў пагонах. Шмат разоў яны вышуквалі «нацыяналістычную крамолу», рэзалі па-жывому рукапісы Караткевіча. І не заўсёды можна было яму дапамагчы. Так здарылася з выдатным эсэ пра Мсціслаў — адным з апошніх твораў Валодзі. Пасля цэнзарскіх чырвоных алоўкаў «чорных палкоўнікаў» з выдавецтва «Беларусь» яно выйшла ў кастрыраваным выглядзе. Але цешуся тым, што дапамог Караткевічу абараніць, адстаяць многае. Ён гэта заўсёды помніў.

Дарэчы, хачу зазначыць, што высокія, пільныя начальнікі, служкі савецкага суперінтэрнацыяналізму, хоць і ваявалі з нацыяналістам-Караткевічам, але чыталі ягоныя творы з вялікай цікавасцю і захопленасцю. Парадокс? Ды не. Талент пісьменніка перамагаў іхнія замшэлыя ўяўленні пра «класавую чысціню», пра «ідэйную непахіснасць». Праўда, гэтыя адносіны да творчасці Караткевіча і яго самога былі падпольныя, схаваныя ад іншых.

Ведаючы цану таленту і заслугам Караткевіча ў падняцці нашай літаратуры на новую высокую прыступку, перад ягоным 50-годдзем я прапанаваў сакратару ЦК КПБ па ідэалогіі А. Т. Кузьміну прадставіць Валодзю да ўзнагароджання ордэнам Леніна. «Ну ты и загнул! Если бы даже здесь все согласились, так ведь в Москве не поймут. Ведь он же закоренелый националист», — такой была рэакцыя Аляксандра Трыфанавіча. Я запярэчыў: «Ніякі ён не нацыяналіст, а сапраўдны патрыёт Беларусі. А талент які!». Кузьмін зморшчыўся: «Да знаю я, знаю. Но это ничего не меняет».

Што было рабіць? Кажу: «А як наконт «трудавіка» (ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга на чыноўніцкім жаргоне)? Аляксандр Трыфанавіч падумаў і сказаў: «Трудно будет Бюро ЦК уговорить. Если только Пётр Миронович своё слово скажет». Машэраў важкім словам замацаваў рашэнне, дакументы я аформіў, яны пайшлі ў Маскву. Потым яшчэ доўга вяліся перамовы з ЦК КПСС, не хацелі партыйныя чыноўнікі ўшанаваць Караткевіча.

За гэты час здарылася страшная трагедыя — у кастрычніку 1980 года ў загадкавай аўтамабільнай катастрофе загінуў папулярны і любімы ў народзе

**На свой урачысты юбілейны вечар Валодзя прыйшоў з ордэнам і добра падвяселены чаркаю**

Пётр Міронавіч Машэраў, у арганізацыі пахавання якога мне давялося ўдзельнічаць самым непасрэдным чынам, шмат перажыць. Першым сакратаром ЦК КПБ стаў Ц. Я. Кісялёў, які заўсёды добра адносіўся да беларускіх пісьменнікаў, цаніў іхнюю працу. Памочнікам у яго, як пры Машэраве, застаўся Віктар Якаўлевіч Крукаў.

Я часта турбаваў Крукава: як жа з узнагародай Караткевіча, калі прыйдзе стужка з паведамленнем? Нарэшце, у самы прытык да юбілею, Масква «разрадзілася»: Валодзя ўзнагароджаны, але не «трудавіком», а ордэнам Дружбы народаў.

Ціхан Якаўлевіч Кісялёў у гэты дзень вылятаў у замежную камандзіроўку, здаецца, у Балгарыю, але захацеў асабіста павіншаваць Караткевіча з узнагародай. Званок у маім кабінеце, чую ў трубцы голас Крукава: «Сяргей Іванавіч, хутчэй заходзьце да мяне».

Памочнік сакратара папрасіў, каб я тэрмінова пайшоў да Караткевіча на кватэру і дапамог арганізаваць размову Ціхана Якаўлевіча з юбілярам. Бягу праз вуліцу, званю. Адчыняе здзіўленая Валя і тывожна пытае: «Сярожа, што здарылася, ты ж павінен быць на працы». Тлумачу патрэбу, а яна спалохана кажа: «Ідзі ў ванную і паглядзі на прыгажуна. Адмакае пасля ўчарашняга». Разуваюся і тэпаю да Валодзі. Ён ляжыць у ванне ў вялікай аблачыне пены, тырчыць толькі нос. Нешта паціхеньку мармыча, нібыта спявае, але бачна, што «лыка не вяжа». Валя застыла ў дзвярах, як раззлаваная мумія. Я кажу ёй: «Не хвалюйся. Усё будзе ў парадку».

Прынёс у ванную табурэтку, паставіў каля Валодзі. Знайшлі даўжэйшы провад да тэлефона, усталявалі апарат. Ён на гэтую падрыхтоўку не звяртаў ніякай увагі. Толькі тады, калі я загаварыў каля ягонага вуха, страшэнна здзівіўся і прамармытаў: «А ты чаго тут, я ж голы ляжу?». Супакоіў яго і сказаў: «Цябе ўзнагародзілі ордэнам Дружбы народаў. Табе зараз будзе тэлефанаваць Ціхан Якаўлевіч Кісялёў, віншаваць. Ты надта думкамі не расцякайся, бо не ў форме. Падзякуй, ды і ўсё». Паўтарыў гэта некалькі разоў, таму што бачыў — не даходзіць. Званю Крукаву: «Караткевіч гатовы гаварыць».

Я трымаў руку Валодзі з тэлефоннай трубкай, каб ён не памакнуў яе ў ваду, і таму добра чуў, як Кісялёў не казённа, сардэчна віншаваў Караткевіча, выказаў яму словы ўдзячнасці за творчасць. А той у адказ, як папугай, прамаўляў: «Дзякуй. Давер народа апраўдаю!». Адкуль ён узяў гэты «давер народа», не ведаю, відаць, па савецкай традыцыі, нагледзеўшыся ўручэнняў узнагародаў па тэлевізары. А мне было так смешна, што баяўся, каб зусім не разрагатацца і не загубіць усю «аперацыю».

Нарэшце «размова» скончылася. Я забраў у Валодзі тэлефонную трубку, а ён з закрытымі вачыма прамармытаў: «А з кім, Сярожа, гэта я гаварыў?».

Да ўсёй гэтай мітусні з ордэнам Караткевіч аднёсся з гумарам: «А я і праўда дружбу народаў умацоўваю. Як вучыўся і працаваў ва Украіне, то быў украінскім нацыяналістам, а цяпер — беларускі нацыяналіст».

На свой урачысты юбілейны вечар Валодзя прыйшоў з ордэнам і добра падвяселены чаркаю. У кабінеце старшыні Саюза пісьменнікаў Максіма Танка, дзе звычайна перад пасяджэннямі збіралася, распраналася начальніцкая «багема», Караткевіч адкалоў «нумар». Ён зняў ордэн і прышпіліў мне на штрыфель пінжака: «Панасі, браце. Я ведаю, што ты, а не яны, спрыяў, каб мне далі ўзнагароду». Была сцэна, як у гогалеўскім «Рэвізоры». Ледзь угаварылі Валодзю не ўскладняць далей сітуацыю.

А вінаваты ў гэтым быў не вясёлы настрой юбіляра, а ягоная заўсёдная бескампраміснасць, здольнасць «рэзаць праўду-матку проста ў вочы» любому чынушы. Валодзя быў абсалютна незакамплексаваным, непасрэдным, шчырым чалавекам. А такіх людзей і баіцца, і прымае «ў штыкі» любая ўлада.

Караткевіч так і не пачуў ад афіцыйных уладаў тых слоў удзячнасці і павагі, якіх заслугоўваў больш, чым хто-небудзь іншы. Але затое ён адчуваў пастаянна любоў і ўдзячнасць шматлікіх чытачоў, што падтрымлівала жыццёвыя сілы і творчы настрой. Сам народ надаў яму званне народнага пісьменніка. Гэта была найвышэйшая ўзнагарода, пра якую марыць кожны мастак!

Смерць Валодзі заспела мяне знянацку ў Латвіі, куды толькі-толькі выбраўся адпачыць, нешта напісаць. Лета. Месцаў у самалёце не было, і мяне прытулілі пілоты ў сваёй кабіне. Тады ў небе падумалася: «Ён так любіў гаротніцу-Беларусь! Не можа ягоная душа адляцець ад нас далёка. Яна будзе свяціць нам ахоўнаю зоркаю. Будзе свяціць вечна».

Сапраўды ягоны адыход стаў страшэннай нечаканкаю, нягледзячы на тое, што ўвесну 1984 года здароўе Валодзі прыкметна пагоршылася. Ён трапіў у рэанімацыю лечкамісіі, пэўны час знаходзіўся ў коме. Каля яго тады пастаянна дзяжурыла любімая сястрычка Валодзі — Наталля Сямёнаўна. Яна выклікала мяне некалькі разоў, калі яму станавілася зусім кепска. Мы з ёй бачылі Валодзю, гэтага непаўторнага жыццялюба, непераможнага аптыміста, дасціпнага жартаўніка і гумарыста, нязвыкла знерухомелым, зжаўцелым, бездапаможным, што ніяк не ўспрымалася, ведаючы ягоную няўрымслівую натуру.

Калі мне давялося стаць галоўным рэдактарам часопіса «Полымя», то з дапамогаю Наталлі Сямёнаўны стараўся хоць нечым аддзячыць Валодзю, данесці да людзей ягоную ненадрукаваную спадчыну. Радуюся, што сам рэдагаваў, выпраўляў у свет аповесць «У снягах драмае вясна», раздзелы з рамана «Брань», апавяданні, дзённік. Седзячы над гэтымі рукапісамі бяссонныя начамі, часта думаў: «Божа, якое яшчэ агромністае мастацкае багацце змагла б вынянчыць ягоная дапытлівая, неспакойная, апантаная бязмежнай любоўю да Беларусі, да свайго народа, невычэрпная душа, калі б лёс быў больш літасцівым!».

Аднак у душы Караткевіча жыла не толькі вялікая любоў да жыцця, да людзей. Была ў ёй і высакародная нянавісць, якая жывіла ягонае змаганне з цемрашаламі, невукамі, дзікунамі, хамамі, бяздумнымі, бяздарнымі служкамі гвалту, таталітарызму, якія імкнуцца «загнаць жалезнай рукой чалавецтва да шчасця». З якім сарказмам, з'едлівасцю высмейваў ён усю гэтую нечысць і навалач!

Многае ў жыцці, як і само яно, даецца чалавеку авансам у спадзяванні на тое, што ён, завітаўшы на нейкі час на зямлю з небыцця, зробіць яе лепшай, прыгажэйшай, адорыць людства часцінкай свайго розуму, любові, спагады, міласці і дабрыні. Караткевіч за свой такі кароткі век апраўдаў гэты аванс, сплаціў усе даўгі. Спаўна аддзячыў ён роднай зямлі, свайму народу і пакінуў запавет:

*Калі мы не ўстанем самі –*
*Не падыме нас ніхто.*

**Цалкам успаміны будуць апублікаваныя ў №48 часопіса «Дзеяслоў».**

## ПЕРАКЛАДЫ («ВЕРСІЯ ЕЎРОПЫ»)

Госць «Ь» — інтэрнэт-часопіс перакладной літаратуры «ПрайдзіСвет».

Ён адрасаваны ўсім, хто любіць замежную літаратуру і цікавіцца мастацкім перакладам на беларускую мову. Сёння — гэта адзінае ў Беларусі выданне, цалкам прысвечанае перакладной мастацкай літаратуры.

Выйшла чатыры нумары «сеціўнага» выдання. Нягледзячы на сваю віртуальнасць, часопіс жыве не толькі онлайн-жыццём. Разам з кампаніяй «Будзьма беларусамі!» «ПрадзіСвет» «выходзіў у людзі» з прэзентацыямі і літаратурнымі чытаннямі. Яго асобную папяровую публікацыю змясціў №47 часопіса «Дзеяслоў».

У сённяшняй публікацыі — выбарка перакладаў з новага нумара «ПрайдзіСвета» — «ВЫКРАДАННЕ ЕЎРОПЫ».

(Рэдакцыя інтэрнэт-часопіса запрашае дасылаць свае прапановы і пераклады на электронны адрас rada@prajdzisvet.org.)



Малюнак Вольгі Каралёвай

# Сара Тыздэйл

## І будзе пяшчотны дождж...

*І будзе пяшчотны дождж, і водар зямлі,*
*І ластаўкі будуць са свістам мерацьпалі.*

*Жабкі ўначы завядуць вечны куплет,*
*І будзе трымтлівы дзікае слівы квет.*

*Зноў малінаўкі свой апрануць убор,*
*Будзе гучаць у садах пералівісты хор.*

*Не заўважыць ніхто, што наўкола вайна,*
*Думаць не будзе, калі заціхне яна.*

*Не будзе клапот і птушкам, і дрэвам тады,*
*Калі людзі знікнуць з зямлі назаўжды.*

*І нават вясна, што ранкам выйдзе са сну,*
*Наўрад ці згадае пра нас і нашу вайну.*

## Вандроўка

*Заход пафарбаваў пяскі —*
*Вось Ніл праз іх цячэ барвовы,*
*Глядзіць удаль Рамсес суровы,*
*Амона храм стаіць цяжкі.*

*Вось стромы даўняе пары,*
*Буянне хваль, аскепкі друзу —*
*Тут перамог Персей Медузу,*
*Тут жах спазналі тры сястры.*

*Бязмежжа неба нада мной,*
*Вятры бяруць мяне на крылы,*
*І край паўночны сэрцу мілы,*
*І мілы ледзяны прыбой.*

*Але нічога не дае*
*Мне падарожжаў дух спакусны*
*З хвіліны той, калі ты вусны*
*Пацалаваў мае.*

## Кахай мяне

*Мой дрозд спявае дзень пры дні*
*І песняй поўніць гай.*
*Хай мілы чуе ў цішыні:*
*«Кахай мяне, кахай!»*

*Ты растрывож яго душу,*
*Спакою не даруй.*
*Няхай гучыць яму ўвушшу:*
*«Цалуй мяне, цалуй!»*

## Юнак і пілігрым

*Ты шмат пабачыў, пілігрым,*
*Мне адкажы, малю,*
*Ты без Кахання бачыў край,*
*Шчаслівую зямлю?*

*Мяне замучыў гэты бог,*
*І я збягу, калі*
*Адкрыю шлях за далягляд*
*На хуткім караблі.*

*«Ты не шукай шчаслівы край —*
*Цябе ён знойдзе сам:*
*У грудзі меч свой усадзі —*
*І апынешся там».*

## П’еро

*П’еро гуляе ў садзе*
*Пад месяцам старым,*
*І лютні гук здаецца*
*Трымтлівым і жывым.*

*П’еро спявае ў садзе,*
*І, дорачы мне спеў,*
*Ён пра мяне не помніць*
*Сярод вішнёвых дрэў.*

*П’еро спявае ў садзе,*
*На нас — нібы таўро:*
*П’еро напевы любіць,*
*А я — П’еро.*

## Да Эолавай арфы

*Вятры перамаўляюцца з табой*
*І аднаўляюць крык былога гора,*
*Той крык, які цябе кранаў учора:*
*Бяда жанчын, што з Трої выгнаў бой,*

*Стогн Андрамахі, змучанай журбой,*
*Узнесены й рассеяны ў прасторы,*
*У ім — уся пакута і пакора,*
*Бы ў ракавіне — мора і прыбой.*

*Вось так, жывы, гучыць часамі спеў,*
*І ў ім — для тых нязнаны, хто пяе, —*
*Забытых земляў безгалосы прах*

*Крычыць, што не здалеў і не паспеў,*
*І ў горкай скрусе струнам не дае*
*Спакою на раз’юшаных вятрах.*

**Пераклад з ангельскай Ганны Янкута**

# Эдыт Сёдэргран

## Вяртанне

*Дрэвы майго маленства стаяць,*
*урачыстыя, перада мной: о чалавек!*
*і трава вітае мяне, сустракае з чужых краёў.*
*Галаву апускаю ў траву: нарэшце дома.*
*Да ўсяго, што за мной ляжыць,*
*павяртаюся спінай,*
*адзіныя сябры засталіся — гэты лес,*
*гэты бераг і возера.*
*І п’ю я мудрасць з сакавітых кронаў ялін,*
*і п’ю я праўду са ссохлых ствалоў бяроз,*
*і п’ю я моц з маленькіх і кволых сцяблінак:*
*вялікі заступнік дае мне руку сваю літасціва.*

## Дрэвы майго маленства

*Дрэвы майго маленства высяцца над мурогам,*
*галавой гайдаючы: што гэта стала з табой?*
*Каланада — суцэльны дакор:*
*не варты таго, ты йдзеш пад намі!*
*Ты дзіця, ты ўсёмагутным быць мусіш,*
*дык чаму ты скуты хваробы ніццём?*
*Вось — ты цяпер чалавек, ненавісны чужынец.*
*А быў дзіцем — вёў доўгія гутаркі з намі,*
*позірк быў мудры.*
*Мы хочам табе расказаць таямніцу*
*твайго жыцця:*
*ключы да ўсіх таямніц ляжаць у траве*
*на малінавых схілах.*
*Мы хочам раскатурхаць цябе, заснулага,*
*хочам абудзіць цябе, памерлага, з твайго сну.*

## Бык

*Дзе бык падзеўся?*
*Мая натура — чырвоная прасціна.*
*Ці я не бачу затопленых крывёй вачэй,*
*не чую рэзкіх, цяжкіх уздыхаў,*
*і хіба зямля не трымціць пад шалёнымі*
*капытамі?*
*Не.*
*Бязрогі ступае бык;*
*ён стаіць над кармушкай,*
*перажоўвае ўпарта сваё калянае сена.*
*Беспакарана трапечацца на вятры*
*пунсовая прасціна.*

## Нявеста

*Мой круг — пятля, і колца маіх думак*
*абвіла палец.*
*І на зямлі, дзе ўсё вакол чужое, ёсць нешта*
*цёплае,*
*як тонкі водар венчыка лілеі.*
*Тысяча яблыкаў у садзе майго бацькі,*
*круглявых павіслі, бездакорныя —*
*няясная маё жыццё такім і стала,*
*круглявым, цэлым, пышным, роўным*
*— простым.*
*Пятля мой круг, і колца маіх думак*
*абвіла палец.*

## Край, якога няма

*Сумую па краі, якога няма,*
*бо існых рэчаў жадаць стамілася.*
*Месяц мне бае срэбнымі рунамі*
*пра край, якога няма.*
*Край, дзе чароўным чынам*
*здзяйсняюцца мары,*
*край, дзе абрынаюцца ўсе ланцугі нашыя,*
*край, дзе студзіць нам пабітыя лбы*
*ў расе месяцовай.*
*Маё жыццё было ліхаманкай.*
*Ды штось я знайшла, кудысьці*
*напраўду прыйшла —*
*на сцежку да краю, якога няма.*

*У краі, якога няма,*
*жыве мой любы ў зіхоткай кароне.*
*Хто ён, мой любы? Цёмная ноч,*
*зоркі дрыжаць у адказ.*
*Хто ён, мой любы? Як яго зваць?*
*Вышэй і вышэй выгінаецца неба,*
*і дзіця чалавечае тоне ў бясконцай імгле*
*і адказу не мае.*
*А дзіця чалавечае — гэта ўсяго*
*толькі пэўнасць.*
*Яно выцягвае рукі вышэй за любыя*
*нябёсы.*
*І прыходзіць адказ: «Гэта я — твой любы,*
*цяпер і навек».*

**Пераклад са шведскай Алесі Башарымавай**

# Эмі Лоўэл

## Ростань

*О ты*
*Якая падышла*
*У цішы яблынь да мяне пасля купання*
*Чаму перад размовай не задушыла*
*А да краеў напоўніла дзівосным дзікім*
*мёдам слоў*
*І потым кінула на літасць*
*Лясных пчол?*

## Замест

*Калі пад вербамі стаю*
*Я над ракою*
*Ва ўборы з жоўтага ядвабу,*
*Расквечанага барвай хрызантэмаў,*
*То не празрыстаю вадою*
*Я любуюся —*
*Тваім партрэтам,*
*Для мяне намаляваным*
*На вееры.*

## Дзесяцігоддзе

*Калі ты прыйшла, то была він़ом*
*чырвоным і мёдам.*
*Смакам салодкім сваім мне язык апякала.*
*Цяпер ты — як ранішні хлеб,*
*Лагодны і гладкі.*
*Я больш не спрабую цябе,*
*твой ведаю прысмак.*
*Ды ўсё ж пачуваюся сытай.*

## Таксі

*Калі пакідаю цябе,*
*Губляе сусвет*
*Апошні свой гук.*
*Імя тваё ў колкія зоры крычу,*
*Гукаю самотна ў парывах вятроў,*
*А вуліцы мчаць,*
*Адна за адной*
*Растуць паміж намі*
*І ліхтарамі засцяць мне вочы,*
*Каб болей не бачыла твару твайго.*
*Чаму я павінна сыходзіць*
*і сэрца ўспорваць аб вострыя лёзы начы?*

## Паланёная багіня

*Над цёмнымі дахамі,*
*Над комінаў каўпакамі*
*Я заўважыла бляск аметысту.*
*Раптам блакітам і цынамонам*
*Запалаў*
*Брудны вуліцы ўскраек.*

*Праз заслону дажджу*
*Рубінавае святло праступіла,*
*І я заўважыла промні месяцу*
*У вэлюме бледна-зялёным.*

*Гэта былі яе крылы,*
*Багіні!*
*Яна па аблоках ступала,*
*І на вясёлкавым пер’і трымалі*
*Яе ветру павевы.*

*Я доўга імчала за ёй,*
*Углядаючыся, спатыкаючыся,*
*Мне было ўсё роўна, куды яна прывядзе.*
*Мае вочы насычаліся колерамі:*
*Шафранавы, рубінавы, жоўта-берылавы*
*І ярка-сіні колер кварцу,*
*Усплёскі ружовага, сполахі зялёнага,*
*Россып аранжавага, спіралі барвовага,*
*У крапінку залатыя пялёсткі*
*тыгровай лілеі*
*І ярка-ліловыя выбухі гартэнзіі.*
*Я імчала за ёй*
*І глядзела на бліскучыя ўспышкі яе крылаў.*

*У горадзе я знайшла яе,*
*У горадзе вузкіх вулак.*
*На рынку я наблізілася да яе,*
*Паланёнай, напужанай.*
*Яе гафраваныя крыльцы звязалі вяроўкамі,*
*Голая і халодная стаяла яна,*
*І вецер дзьмуў у той дзень*
*Без промня сонца.*

*Мужчыны таргаваліся за яе,*
*Давалі золата й срэбра,*
*Медзякі і збожжа,*
*Выкрыквалі гучна цану на рынку.*

*Багіня рыдала.*

*Хаваючы твар, я збегла,*
*І шэры вецер шыпеў за спінаю*
*На вузкіх вулках.*

**Пераклад з ангельскай Юлі Цімафеевай**

ПЕРАКЛАДЫ («ВЕРСІЯ БЫКА»)

# ЖАНЧЫНА, ЯКАЯ ГАВАРЫЛА ПРАЎДУ

З ЦЫКЛУ «РЭДЖЫНАЛЬД ПРА ГАЛОЎНЫЯ ЗАГАНЫ»

**(Гектар Х'ю Манро) САКІ**

Жыла-была, пачаў Рэджынальд, жанчына, якая гаварыла праўду. Безумоўна, звычка гэтая з'явілася не ўадначас, а прарастала ў ёй павольна, нібы лішайнік на здаровым з выгляду дрэве. У яе не было дзяцей — інакш усё магло б быць інакш.

Гэта пачалося амаль незаўважна, без асаблівых на тое падставаў, апроч той, што жыццё не было даволі пустым, таму так лёгка было спатыкнуцца і пачаць гаварыць праўду па дробязі. А потым усё ўскладнілася: мяжа дазволенага была пяройдзеная, пачалася праўда па-буйному — і ўрэшце яна сказала праўду пра свой узрост. Яна паведаміла, што ёй сорак два гады і пяць месяцаў, — як бачыце, да таго часу яе праўдзівасць сягнула нават месяцаў. Гэта, мабыць, прыемна анёлам, але яе старэйшая сястра была не вельмі задаволеная. На дзень нараджэння нашай жанчыны замест білетаў у оперу, на якія тая спадзявалася, сястра даслала ёй паштоўку з відам на Ерусалім з Элеонскай гары, што, згадзіцеся, не зусім адно і тое ж. Помста старэйшай сястры можа прымусіць сябе чакаць, але, як Паўднёва-ўсходні экспрэс, урэшце прыбывае без спазнення.

Сябры жанчыны спрабавалі адгаварыць яе ад надмернага патурання гэтай звычцы, але яна сказала, што заручаная з праўдай, пасля чаго ёй заўважылі, што не зусім разумна так часта з'яўляцца разам на публіцы. (Бо прадбачлівая жанчына не будзе рэгулярна абедаць разам з мужам, калі хоча асляпіць яго, нібыта Адкрыццё прарока, за вячэрай. Яму трэба даць час на забыванне, а паловы дня для гэтага недастаткова). І неўзабаве шэрагі яе сяброў месцамі парадзелі. Яе жарсць да праўды аказалася несумяшчальнай з шырокім коламі знаёмстваў. Напрыклад, яна сказала Мірыям Клапшток, як менавіта тая выглядала на балі ў Ілексаў. Ну безумоўна, Мірыям пыталася пра бесстароннюю меркаванне, а нашая жанчына штодня малілася ў царкве за мір ва ўсім свеце, але свет, на жаль, поўны супярэчнасцяў.

Усе пагаджаліся на адным: кепска, што ў яе няма сям'і. З дзіцёнкам-другім у доме неяк несвядома пачынаеш утаймоўваць празмернае імкненне да праўды. Дзеці дадзеныя нам на тое, каб мы стрымліваліся ў выказванні найлепшых пачуццяў. Вось чаму тэатр, як бы ні намагаўся, ніколі не будзе больш штучным, чым жыццё, — нават у ібсэнаўскай драме трэба выкрываць тое, пра што звычайна маўчыш у прысутнасці дзяцей і слугаў.

Лёс ад пачатку наканаваў, каб мы гаварылі праўду, і па справядлівасці частку віны павінен узяць на сябе. Таму, не маючы дзяцей, нашая жанчына была вінаватая хіба што ў неасцярожнасці самога пацярпелага.

З часам яна адчула, што стала рабыняю таго, што спачатку было не больш чым марнай схільнасцю. І вось аднойчы ёй усё адкрылася. Любая жанчына кажа сваёй краўчысе дзевяноста працэнтаў праўды, астатнія ж дзесяць — гэта той нескарачальны мінімум маны, на які ніводная кліентка, якая сябе паважае, ніколі не зробіць замаху. Майстэрня мадам Драга была месцам сустрэчаў голай праўды з крыкліва адзетай маной, і там нашая жанчына адчула ў сабе сілы зрабіць апошнюю спробу і ўваскрасіць прастадушны фальш мінулых дзён. Сама мадам была апанаваная натхненнем і мела выгляд сфінкса, які ведае ўсё на свеце, але пра большасць ахвотна маўчыць. Яна б праславілася, калі б была ваенным міністрам, але ёй было дастаткова багацця.

**Любая жанчына кажа сваёй краўчысе дзевяноста працэнтаў праўды, астатнія ж дзесяць — гэта той нескарачальны мінімум маны**

— Я прыбяру вось тут, а потым — ну пацярпіце хвілінку, міс Ховард! — потым тут, а потым вось так збяру — упэўненая, вам будзе нашмат зручней!

Жанчына крыху павагалася. Здаецца, так мала высілкаў патрэбна было, каб проста моўчкі згадзіцца з мадам. Але звычку было ўжо не перамагчы.

— Баюся, — прамармытала яна, — што тут вось крышку, ну зусім крышачку...

І гэтым «крышачку» яна акрэсліла ўсю незваротнасць сваёй рабскай залежнасці ад праўды. Мадам не вельмі радавалася, калі ёй пярэчылі ў прафесійных пытаннях, а калі мадам страчвала вытрымку, асобная вытрымка знаходзілася ў вашым рахунку.

І ўрэшце надышла жахлівая хвіліна, якую жанчына ўжо даўно прадбачыла, — яшчэ адна маленечкая праўда, што трывожыла яе ў хвіліны абуджэння. Неяк золкай раніцай у сераду, з цяжкасцю падбіраючы словы, яна заўважыла кухарцы, што тая выпівае. Сцэна, якая адбылася пасля гэтага, запомнілася ёй так выразна, нібыта была напісаная ў яе ўяўленні самім Эбі[1]. Кухарка была добрая — такія кухаркі сыходзяць за добрых; а як сыходзяць, то яна і сышла.

На наступны дзень на абед заявілася Мірыям Клапшток. Жанчыны і сланы ніколі не забываюць несправядлівасці.

[1] Эдвін Остын Эбі (1852–1911) — амерыканскі мастак, ілюстратар, з 1878 года жыў у Англіі; у 1902 годзе быў афіцыйным партрэтыстам на каранацыі Эдуарда VII. Ілюстраваў кнігі вядомых аўтараў, у тым ліку Шэкспіра.

**Пераклад з ангельскай Кацярыны Мацієўскай**

# ВЫКЛЯТЫЯ ЖАНЧЫНЫ

**Шарль БАДЛЕР**

## Роспач старой

Зморшчаная бабулька ўся ажно заззяла ад радасці, убачыўшы цудоўнае дзіця, якому ўсе былі радыя й кожны хацеў спадабацца; цудоўнае стварэнне, такое самае крохкае, як яна, бабулька, і, рыхтык яна, бяззубае й безвалосае.

І яна падышла да немаўляці, хочучы пазабавіць яго сваім агуканнем ды ласкавымі мінамі.

Але напалоханае дзіця стала адбівацца ад лядашчай дабрачкі з яе пяшчотамі й завішчэла на ўвесь дом.

І добрая бабулька вярнулася ў вечную сваю самоту і, плачучы ў куточку, казала сабе: «Ах мы, няшчасныя старыя саміцы! Мінуў час, калі мы маглі падабацца, хоць бы найнявіннейшым; і мы наганяем страх нават на малых дзяцей, якіх хочам любіць!»

## Блазан і Венера

Які чароўны дзень! Вялізны парк млее ў пякучым праменні вока дня, нібы маладосць у абладзе Кахання.

Усеагульная раскоша не выдае сябе ніводным гукам; нават фантаны як быццам заснулі. Як жа розніцца ад людскіх святаў гэтая маўклівая оргія!

Здаецца, што святло, усё нарастаючы, выкрасае з прадметаў усё новыя й новыя водбліскі-яскаркі; што краскі ў захапленні згараюць ад жадання перасягчы нябесны блакіт зыркасцю сваіх фарбаў; што спёка робіць водары відочнымі, і яны смугою ўзносяцца да сонца.

Аднак сярод агульнай радасці я ўгледзеў засмучаную істоту.

Ля ног вялізарнай Венеры — адзін з прафесіянальных вар'ятаў, самахотных блазнаў, чый абавязак — забаўляць каралёў, калі тых грызуць дакоры сумлення ці проста нуда. Прыбраны ў бліскучасты й фацэтны строй, у рагатай шапцы са званочкамі, увесь сутулыўшыся каля п'едэсталу, ён падымае поўныя слёз вочы да несмяротнае Багіні.

Ягоныя вочы кажуць: «Я самы няшчасны й самотны з людзей, пазбаўлены кахання й сяброўства, і праз гэтае мізарнейшы за апошнюю жывёлу. Але я, я таксама створаны, каб адчуваць і разумець неўміручую Красу! О, Багіня, злітуйся над маім смуткам і маім шаленствам!»

Але няўмольная Венера глядзіць немавед куды ўдалеч сваімі мармуровымі вачыма.

## Гадзіннік

Кітайцы даведваюцца пра час па вачах катоў.

Адзін місіянер, ідучы пэўнага дня прымесцем Нанкіну, заўважыў, што забыў гадзіннік, і запытаўся, колькі часу, у нейкага хлопчыка.

Юны вісус з Паднябеснай Імперыі спачатку разгубіўся, але потым, сцяміўшы, адказаў: «Зараз дазнаюся». Праз некалькі мгненняў ён вярнуўся з вялікім тоўстым катом у руках і, зазірнуўшы яму, як той казаў, проста ў вочы, без ваганняў абвясціў: «Хутка поўдзень». Так яно й было.

А я, калі схіляюся да пекнай Феліны, якой так пасуе яе імя, бо яна — краса свайго полу, гонар майго сэрца й водар маіх думак, будзь гэта ўночы альбо ўдзень, у зыркім святле альбо непрагледным змроку, — у глыбіні яе чароўных вачэй я заўсёды бачу дакладны час, заўсёды той самы, вялікі, урачысты, бязмежны, нібы прастора, непадзельны на гадзіны й хвіліны, нерухомы, не адзначаны на хранометрах, і ўадначас лёгкі, як подых, і хуткі, як позірк.

І калі нейкі назола з'явіцца й стане турбаваць мяне, пакуль погляд мой адпачывае на гэтым цудоўным цыферблаце, калі нейкі грубы й недалікатны дух, нейкі дэман перашкоды з'явіцца й запытаецца: «Ува што ты так пільна ўглядаешся? Чаго шукаеш у вачах гэтай істоты? Марнатраўны й лянівы смяротны, можа, ты бачыш там, колькі часу?» — я адкажу без ваганняў: «Так, бачу: на маім гадзінніку Вечнасць!».

Згадзецеся, спадарыня, што гэты мадрыгал напраўду варты ўзнагароды — ён атрымаўся такім самым напышлівым, як і вы. Але, шчыра кажучы, мне было так прыемна плесці вам гэты вычварны камплімент, што я нічога не прашу ў вас узамен.

## Паўсвету ў валасах

Дазволь, я буду доўга, доўга ўдыхаць пах тваіх валасоў, занурыся ў іх тварам, як сасмяглы ў крынічную ваду, буду ўскалыхваць іх, нібы напарфумаваную хустку, каб разварушыць рой успамінаў.

Калі б ты магла ведаць усё, што я бачу, што адчуваю, усё, што мне чуецца ў тваіх валасах! Мая душа вандруе ў водары, як душы іншых — у музыцы.

Твае валасы поўныя мрояў пра мачты й ветразі, пра вялікія моры — мусоны нясуць мяне па іх у чароўныя краіны, дзе далячыні блакітнейшыя й глыбейшыя, а паветра прасякнутае пахам пладоў, лісця й чалавечае скуры.

У акіяне тваіх валасоў мне бачыцца гавань у гуках сумных песень, дужыя мужчыны з усіх канцоў свету й караблі ўсіх кшталтаў, чые дасканалыя й складаныя сілуэты вырысоўваюцца на асноведзі вялізарных нябёсаў, дзе пануе вечная спёка.

У пяшчоце тваіх валасоў я зноў перажываю доўгія гадзіны ўтомнай, амаль што няўлоўнай партовай гайданкі, гадзіны, што я прабавіў на канапе ў каюце прыўкраснага карабля, між вазонаў з кветкамі й збаноў з прахалоднай вадою.

У пякучым вогнішчы тваіх валасоў я ўдыхаю водар тытуню, прыпраўлены опіумам і цукрам; у ночы тваіх валасоў я бачу бясконцае ззянне трапічнай сінечы; на пушыстых узбярэжжах тваіх валасоў я п'ю змешаны пах смалы, мускусу й какосавага алею.

Дазволь, я ўвап'юся ў твае цяжкія чорныя косы. Калі я кусаю твае пругкія, непакорлівыя валасы, мне здаецца, я ем успаміны.

**Дазволь, я ўвап'юся ў твае цяжкія чорныя косы. Калі я кусаю твае пругкія, непакорлівыя валасы, мне здаецца, я ем успаміны**

## Якая з дзвюх сапраўдная?

Я пазнаёміўся з некай Бенедыктай, што жыла ў залатым бляску ідэалу; вочы яе выклікалі прагу велічы, красы, славы і ўсяго, што прымушае нас верыць у несмяротнасць.

Але гэтая цудоўная істота была запекнай, каб жыць доўга; не прайшло й некалькіх дзён па нашым знаёмстве, як яна памерла; я сам пахаваў яе пэўнага дня, калі вясна кадзіла свой ладан нават на могілках. Я сам пахаваў яе, замкнуўшы ў труну з духмянага дрэва, незнішчальнага, нібы індыйскія скрыні.

Вочы мае яшчэ былі ўтаропленыя ў зямлю, дзе я закапаў свой скарб, як раптам я ўбачыў маладую асобу, надзвычай падобную да пахаванай. У дзіўным істэрычным запале яна ўтоптвала рыхлую глебу й пырскала смехам, кажучы: «Гэта я, я сапраўдная Бенедыкта! Я, знакамітая агідніца! У пакаранне за тваю дурноту й слепату кахацьмеш мяне такою, якой я ёсць!»

А я, як непрытомны, крычаў у адказ: «Не! Не! Не!». І, каб выразней падкрэсліць сваю нязгоду, тупнуў так моцна, што нага мая па калена ўгрузла ў свежы дол. Быццам воўк, што трапіў у пастку, я застаўся — і, магчыма, назаўсёды — прыкаваны да магілы ідэалу.

## Суп і аблокі

Мая любая, мая шалёная каханка падавала мне абед, а я праз расчыненае акно залі сачыў, як плыве ў небе цудная Божае дойлідства, сатканае з няўлоўных тхненняў, чароўныя эфемерныя збудаванні. І я сказаў сабе, сузіраючы: «Усе гэтыя дзіўныя відзежы прыгожыя амаль як вялікія вочы маёй каханае красуні, маёй любае, шалёнае, зеленавокае пачвары».

Але раптам я атрымаў моцны ўдар кулаком у спіну й пачуў сіпаты, чароўны голас, істэрычны й нібы ахрыплы ад гарэлкі — голас маёй мілае, любае каханкі: «Будзеш ты есці нарэшце свой суп, чортаў гандляр аблокамі?!»

**Пераклад з французскай Андрэя Хадановіча**

ВЕРШЫ

# ШЛЯХ ДА ЦЯБЕ

Рагнед МАЛАХОЎСКІ

**Рагнед Малахоўскі — паэт, музыкант. Аўтар зборніка вершаў «Беражніца». Нарадзіўся ў 1984 годзе ў пасёлку Сяймчан Магаданскай вобласці (Расія). Скончыў Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Жыве ў вёсцы Нарач.**



## Беражніца

*Беражніца, багіня азёраў,*
*У прадонні густой цішы*
*Пахавай назаўсёды гора,*
*Зберажы скарб душы.*
*Беражніца, хімера паэта,*
*Наталіца каханнем дай*
*І натхненне свайго сусвету*
*Для мяне адшукай.*
*Беражніца, дзяўчына зямная,*
*Не цурайся, прэч не бяжы.*
*Твая цнота душу апякае.*
*Маладосць зберажы.*
*Беражніца!*
*Румяны заранкі*
*Асляпляюць красой жывой…*
*Калі ў сэрцы*
*Сумненняў маланкі,*
*Вір жыцця супакой.*
*Беражніца, вадзіца святая,*
*Жыццядайная моц твая.*
*Калі хваля бяжыць залатая, —*
*Ачышчаюся я.*

* * *

*Заліта поле сонечным вінам,*
*Хаваюцца*
*пабляклыя валошкі.*
*Камусьці шчасце грукаецца ў дом,*
*А хтосьці для сябе габлюе дошкі.*
*На босы дол вятрыска ўпадзе,*
*Калоссе і валошкі пералічыць.*
*Як людзі,*
*адлюструюцца ў вадзе*
*Разгатыя дубы на папялішчы.*
*Над возерам, акрытым цішынёй,*
*Стаіць, як здань, пакінутая хата.*
*Камусьці жыць*
*маркотнаю гульнёй,*
*А іншым пазіраць на лёс заўзята.*
*Развее вецер думак чараду,*
*Дзе мары, як віно, не маюць толку.*
*Аб чымсьці плача, гледзячы ў ваду,*
*Анёлак*
*На валошкавым узгорку.*

## Ласунак

*Ласунак лепшы*
*Для мяне —*
*Кропелькі*
*Ажынавага соку,*
*Што марамі*
*Шчаслівага юнацтва*
*Коцяцца па тваім*
*Бурштынавым целе.*
*А свежы водар*
*Ранішняга сонца*
*Зачароўвае сціпласцю*
*І непаўторнай цеплынёй.*
*Пяшчота прамянёў*
*Пераліваецца*
*З кропелькі ў кропельку,*
*І лёгкая,*
*Дрыготкая хваля*
*Працінае цела.*
*Сусвет —*
*Перад вачыма,*
*А смак яго*
*Ў мяне на вуснах.*
*І сэрцы дрыжаць*
*У радасці*
*Ап'янелай асалоды —*
*Кропелькі*
*Ажынавага соку.*

## Шлях да цябе

***Н. Н.***

*За кратамі касмічнай цішыні*
*Твой голас чысты і недасягальны.*
*У чорнай, некранутай вышыні*
*Я страціў да каханай шлях астральны.*
*Блукаючы і ў ноч, і ў ясны дзень,*
*Знікаючы ў жыцці, як думак кола,*
*Убачыў, як надзей маіх прамень*
*Высвечваў з цьмянай шэрані анёла.*
*А багна слоў*
*Засмоктвае мой свет.*
*Правал у бездань.*
*Шлях святла не мае…*
*А недзе,*
*Сярод тысячы планет,*
*Мігціць твая*
*Адзіная, жывая…*
*Мне вусны ценька горкі лёс кране*
*Засохлаю гартэнзіяй настрою,*
*Бо голас твой застаўся для мяне*
*За вечнасцю касмічнага спакою.*

* * *

*Мой чорны парасон —*
*Акрасец ночы —*
*Растане ў навальнічным даляглядзе,*
*Настане час,*
*Якога не захочаш*
*Ты бачыць у маім нямым паглядзе.*
*Мой чорны парасон –*
*Крыло анёла,*
*Што здрадзіў на зямлі адвечнай веры.*
*Грымотаў бой.*
*На твары мёртвы сполах.*
*За мной адчайна зачыняеш дзверы…*
*Мой чорны парасон —*
*Мой паратунак.*
*Падорыць ноч*
*Нявыплаканы сон нам —*
*Апошні развітальны пацалунак.*
*Іду апошні раз пад парасонам…*

## Знясілены дождж

*Знясілены дождж уладарыць*
*на цёплым асфальце.*
*Ён кроплямі лічыць хвіліны*
*да нашага шчасця.*
*Ён справу завершыць маю.*
*Я дажджу давяраю.*
*Жыццё — навальнічнае неба ад краю*
*да краю.*
*Не трэба тлумачыць, чаму нам*
*тужліва і змрочна.*
*У снах летаргічных заблытацца сёння*
*нам можна.*
*Парою дасветнай на скронях сівое планеты*
*Знікаюць у часе бязважкім*
*дажджынкі-манеты.*
*Знясілены дождж нібы просіць*
*у нас прабачэння,*
*Што ён валацуга, лянівы.*
*Ён стаў на калені.*
*Калі развінаюць нябёсы вільготныя крылы,*
*Нам дождж ахвяруе на шчасце*
*апошнія сілы.*

* * *

*Пластыка слова,*
*Пластыка цела…*
*Наша каханне знікаць не хацела*
*Ў гэтым нязносна вар'яцкім сусвеце.*
*Верыла ноч,*
*Што яе апраўдае дасвецце*.*
*Мы даверыралі жыццё*
*Незямным летуценням.*
*Словы і рухі спяшаліся…*
*Да пабачэння!*
*Новыя промні святла*
*Даспяваюць санеты.*
*Стану над прорвай пачуццяў…*
*Каханая, дзе ты?*

***З Рыгора Барадуліна.**

* * *

*На ўскрайку*
*Атлантычнага цыклону*
*Каханне выпрабоўвае свой лёс.*
*Я веру —*
*Мне з табою быць да скону.*
*Хлушу табе,*
*Што рэўнасць сон прынёс.*
*Дрымотны вечар*
*Гіне ў самалюбстве,*
*Жадае скінуць*
*Рэўнасці хамут.*
*Ты хлусіш мне,*
*Што час не замалюе*
*На твары недавер*
*І боль пакут.*
*Тваё непераможнае маўчанне —*
*Часцінка міратворнай цішыні.*
*Адкінем цяжар спрэчак*
*Да світання,*
*Запалім свечак чыстыя агні…*
*А заўтра,*
*Супакоеныя стомай,*
*Забудзем*
*Недавер сумніўных сноў…*
*На ўскрайку*
*Атлантычнага цыклону —*
*Імгненні непрадбачлівых высноў.*

* * *

*Глыток ахалоджанай колы*
*На плошчы Якуба Коласа…*
*Грукоча трамвайчык вясёлы —*
*Не чутна каханай голасу.*
*Не бачна каханай постаці,*
*Навокал народ спяшаецца.*
*Народ на адвечнай ростані*
*Пад лёсам сваім прагінаецца.*
*А хтосьці сядзіць на лавачках*
*І ловіць пырскі фантанныя.*
*Кропелькі ў сонечных зайчыках…*
*Дзе ты блукаеш, каханая?*
*Скрыжоўцца позіркі нашы*
*На плошчы Якуба Коласа,*
*Дзе сонечны*
*зайчык*
*вушасты*
*Блукае без мапы і компаса.*

* * *

*Я быў закаханы ў багіню пяшчоты*
*І верыў, што лета маё не міне,*
*Не змоўкнуць духоўнай мелодыі ноты*
*І ружа не звяне ў самотным акне…*
*Багіня пяшчоты —*
*Адчаю багіня —*
*Пакутным агнём апякла мне душу.*
*Калі мімалётнасць кахання загіне,*
*Нятленнага шчасця у багоў папрашу.*
*Ды цені прытворныя*
*Нішчаць сумленне,*
*Чарнее аслеплай душы абярог.*
*Багіня адчаю —*
*Жыцця сутарэнне —*
*Спакусніца свету майго.*
*Забыцца ў пялёстках сузор'яў мы рады,*
*А сэрца тваё апусцела да дна.*
*Багіня жахлівай ганебнасці здрады —*
*Адна.*

## Расчараванне

*Цалуюць шыбу*
*Клічнікі дажджу,*
*Пытальнікам*
*Скруціў лістоту вецер.*
*Найлепшы час*
*Прызнаць,*
*Што не жыву, —*
*Страшнейшае*
*Расчараванне ў свеце.*
*Тунэль з аскепкаў*
*Дзённай мітусні*
*Не выпусціць,*
*Пакуль не згасне вечар.*
*Удары сэрца*
*Прагнуць цішыні,*
*Калі жыццё*
*Марнуецца на вецер.*
*Трымценне зор —*
*На палатне акна,*
*Спакою кроплі*
*Змыюць думак смецце.*
*Ад безвыходнасці —*
*Глыток віна,*
*І не задасць пытанняў*
*Нудны вецер.*

## Памяць вады

***Майму брату Дзянісу***

*Вада запамінае нашы словы,*
*Вада запамінае нашы рухі.*
*Прамыць бы ёю нашыя галовы,*
*Пазбыцца б разам тлумнай завірухі.*
*Вада гарыць*
*Пад райскім небасхілам.*
*Паміж табой і мной —*
*Душа вады.*
*Наш час*
*Непадуладны тайным сілам.*
*Яму карціць быць вечна маладым.*
*Вада раве, шалёна вар'яцее,*
*Хвалюецца раздольная прастора.*
*Імгненні лёсу —*
*Каляровы веер,*
*Што ў мітусні нязморанага мора.*
*Праз тысячы гадоў*
*Паўстане Памяць,*
*Дзе голасу імгненні прагучалі.*
*«Так прагнеш жыць,*
*Калі цябе чакаюць», —*
*Прамовяць непакорлівыя хвалі.*

* * *

*Далёкі бераг —*
*Паляўнічы нож —*
*Бязлітасна рассёк*
*Ваду і неба.*
*Барвовы вечар*
*Крочыць басанож,*
*І чайкі ўжо не кленчаць*
*Крошкі хлеба.*
*Пад ціхім небам*
*Стынуць ветракі.*
*Калышацца*
*Ў чароце нізкім човен.*
*Тысячагоддзі*
*Пад вадой звіняць замкі*
*На замку,*
*Што таемнасцямі поўны.*
*І песні беражніц*
*Не чутна ўжо,*
*Упала ніцма поўня*
*Сярод хваляў.*
*А колькі*
*Нема*
*З дна*
*Крычыць крыжоў,*
*Дзе хвалі*
*Столькі душаў пахавалі!*
*Калісьці прыйдзе*
*Шчасная пара*
*І зоркі*
*Ад жыцця адгоняць беды.*
*А над вадою —*
*Палымяная зара…*
*І толькі тут*
*Сустрэнуцца легенды.*

АПАВЯДАННЕ

# МОСТ ПРАЗ ДУНАЙ

Мікола ІЛЬЮЧЫК

## I

Радавы Лазар Фахер ляжаў у садку пад старой грушай. Пайшоў другі месяц, як іх узвод расквартаравалі ў вёсцы Зяблевічы. У самым сэрцы палескіх балотаў на пясчанай выспе месціцца невялічкая, мо з дваццаці хатаў, вёска. Фронт далёка, а што яны тут робяць, Лазар так і не зразумеў. Казалі, што будуць усталёўваць новую ўладу і змагацца з ляснымі бандытамі — партызанамі. Але ж, дзякуй Богу, ні таго, ні другога рабіць не давялося. Жывуць па вясковых хатах, па некалькі чалавек. Учатырох занялі пакой у дыхтоўнай хаце Юзіка Боўдзеля.

Кульгавага Юзіка забракавалі, і вайна для яго ніяк не змяніла ход сялянскага жыцця. Ён з Тэкляй і малым дзіцём спяць на печы. А ў пакоі жывуць жаўнеры.

Немцаў у Зяблевічах так ніхто і не бачыў. Людзі, што бывалі на чыгуначнай станцыі, казалі, што іх там шмат. А ў вёсцы толькі некалькі дзясяткаў мадзяраў.

Лазар адганяў надакучлівую муху, што перашкаджала чытаць ліст, бегала па паперы з месца на месца, паціраючы пярэднімі лапкамі. Гэта раздражняла.

Лісты прывезлі ўчора. Сэрца ўздрыганулася спужанай птушкай, калі ўбачыў знаёмы почырк. З лістом было фота...

У Тэрэзію Кун Лазар закахаўся на першым курсе. З фота глядзела яна, з ледзь прыкметнай усмешкай. Тыя ж вочы, тыя ж вусны. Здавалася, што развіталіся толькі ўчора... Перад вачыма паўстаў мост праз Дунай, дзе закаханыя прастаялі да раніцы. Яны так любілі вечаровыя прагулкі па вуліцах Будапешта! Час ад часу разам з імі мог увязацца малодшы брат Лазара - Палько. Яшчэ ў гэтай прыемнай кампаніі мог быць сябар і аднакурснік Балаш Сабо. Ягоныя бацькі трымалі ферму недалёка ад Дэбрэцэна і клалі ўсе сілы, каб вывучыць сына. Толькі аднойчы Лазар заўважыў, што сябар надта пільна ўглядаецца ў вочы Тэрэзіі, але ж не прыдаў гэтаму ніякага значэння. Бо ведаў, што Тэрэзія кахае толькі яго. А з Балашам яны трэці год запар здымаюць пакой у суворай пані Бэрнадэт. За гэты час звыкліся адзін да аднаго і нават пасябравалі. Лазару добра было жыць асобна. Самастойны і незалежны юнак не надакучваў бацькам і ў родным доме, што на ўскрайку сталіцы, бываў толькі зрэдку...

— Лазар, дзе ты? — паклікаў яшчэ адзін кватарант Юзіка Боўдзеля Колаш Хідзеж.

— Тут я, — азваўся за бэзавым кустом Лазар.

— Чуў навіну?

— Што за навіна?

— Заўтра наш узвод пераводзяць на станцыю. Мост праз раку ахоўваць будзем. Партызаны на чыгунцы.

— Адкуль ведаеш?

— Капрала выклікалі да начальства. Ён і паведаміў.

Вось, падумаў Лазар, дарэмна абяцалі дзяўчатам з хутара, што ўвечары прыйдзем. Яшчэ і знаёмства толкам не завязалася, а тут ужо развітваца пара. Пасля атрыманага ліста з радзімы хлопец яшчэ больш засумаваў.

— Слухай, Колаш, а ці надоўга туды, на станцыю?

— Халера яго ведае. Па мне дык і тут добра, спакойна.

На хутар Бабы (такая смешная назва!) Лазар з Балашам запрошаныя былі даўно. Далёкая сваячка Юзіка, смяшлівая дзяўчына гадкоў сямнаццаці, прыходзіла ў вёску, каб забраць соль, што выменяў яе дзядзька ў ротнага кашавара Гергеля. Жаўнеры падышлі да яе, пачалі нешта казаць. Але Ганначка, так звалі Юзікаву пляменніцу, толькі рагатала з кожнага слова. Такой смешнай ёй прыдалася мадзярская мова. Нягледзячы на моўную перашкоду, юнакі ўцямілі, што на хутары сохнуць яшчэ тры дзеўкі. Ганна ж прыйшла да высновы, што з гэтымі прыгожымі хлопцамі варта сустракацца. У Зяблевічах да вайны было толькі трое юнакоў. Дваіх адразу забралі на фронт, а трэці хаваўся недзе ў лясах. Толькі не ведама, ад каго збягаў, бо вінаваты быў перад усімі — новая ўлада лічыла яго партызанам, а старая — дызерцірам.

На сённяшні вечар было прызначана спатканне на хутары...

## II

— Што за хвароба такая? Дактары рады не дадуць, і памерці нельга, — бурчэў пад нос стары Юзік.

— Старасць завецца твая хвароба, — азвалася Тэкля. — Заўтра Вялікдзень, працы колькі, а ён тут стогне. Памог бы, ці што.

Заўтра і Марыська павінна прыехаць. Пашанцавала дачушцы. Адзіную толькі і выгадавалі. Не даў больш Бог. Затое ў яе ўжо чацвёра. Гарадскія! Жывуць у райцэнтры. І муж добры, п'е толькі па святах. І кватэру маюць, і машыну. Багатыя! Заўтра павінны прыехаць на ўласным «Масквічы».

Юзік узяў кій і пакульгаў з хаты. Выйшаў да веснічак.

— Ах, зараза! А ну пайшла прэч!

Стары замахнуўся кіем. Вялізная суседская свіння зрыла лычом увесь «тратувар», як пагарадскому казала Марыська. Лупачыхіная свіння, такая ж тлустая, як і яе гаспадыня, нават рылам не павяла ў Юзікаў бок. І толькі пасля таго, як цяжкі кій з покіду агрэў яе па пукатай спіне, нехаця пайшла па вуліцы. Млосна было Юзіку. Месца сабе не знаходзіў. У хаце не сядзіцца — дыхаць няма чым, і ў двары неяк няўтульна...

У нядзелю прыехала дачка з усім сваім сямействам. Хата і двор напоўніліся дзіцячым лямантам. Старэйшыя адразу наляцелі на кошык з яйкамі, што спецыяльна для іх варыла Тэкля ўчора ў чыгуне з цыбульнікам. Яна яшчэ з зімы пачала збіраць яго ў кардонку, каб парадаваць унучанятаў чырвонымі мацкамі на Вялікдзень.



Марыся ж паведаміла бацькам радасную навіну: да вёскі заасфальтуюць дарогу. Костусь працаваў у райвыканкамаўскім гаражы, і нехта з начальнікаў неяк прамовіў: «Вось, Косцік, хутка да цешчы ў Зяблевічы будзеш па асфальце ездзіць». Навіна не надта ўразіла бацьку, бо ён толькі буркнуў у адказ: «Мне ўсё роўна, па асфальце кульгаць ці па гразі плюхаць. Без кія ж ні так, ні гэтак...»

...Напрыканцы лета дарогу заасфальтавалі. А ў верасні добрыя начальнікі паклапаціліся, каб адзіная вуліца ў Зяблевічах таксама была, як казаў Косцік, «з цвёрдым пакрыцproperly». Клапаціліся, бо акурат за вёскай было маляўнічае возера, куды ўсё раённае начальства з'язджалася папіць гарэлкі. А Косцік казаў, што «на падвядзеніе ітогав».

Юзік з Тэкляю чаўпліся каля капцоў з бульбаю. Хавалі, каб захаваць ураджай, асобна насенную і вялікую. Увесну ж прыедуць купцы з поўдня, і можна будзе выручыць якую капейчыну.

Раптам вуліца ажывілася. Пыхкаючы дымам, праехаў нязграбны грэйдэр, за ім каток і агромністае жоўта-чорнае пудзіла, што ўкладае на дарогу гарачы і смярдзючы асфальт. Спрытна падруліў «козлік». З машыны выскачыў зухаваты хлопец з папкай у руцэ. Не вітаючыся гаркнуў:

— Ну што, старэча, і да вас цывілізацыя прыйшла! Папільнуй тэхніку да раніцы. З мяне пляшка!..

Раніцай вуліца зноў ажыла. Панаехалі самазвалы, запаўняючы вёску смуродам дыму ды гарачага бітуму. З «уазіка» выскачылі жвавыя дзяцюкі. Стрэльнулі ўздоўж вуліцы нейкім стрыножаным прыцэлам ды забілі ў зямлю загадзя прыгатаваныя калочкі. Пайшла справа...

Юзіку не сядзелася ў двары у такі лёсавырашальны для вёскі момант. Не зважаючы на Тэклінны заўвагі, стары пакульгаў да вуліцы. Заўважыў, што калочкі набітыя надта блізка да ягонага плоту — і праз нейкую гадзіну ці дзве пад асфальтам застанецца і ягоны «тратувар». Юзік падбегаў, як толькі мог, рынуў да таго, што ўчора хадзіў з папкаю:

— Сынку, не трэба так шчыльна да плоту. Трэба ўзяцца далей.

— Што ты, дзед, у мяне праект. Ды і табе лепей будзе. Адразу з двору на асфальт.

— Мне не трэба лепей. Сынок, мой ты харошы, адступі метр...

— Ды пайшоў ты! А я яму яшчэ пляшку паабяцаў...

— Хлопча, я сам табе пляшку пастаўлю, і не адну... Саступі старому, га?

— Ну, дурыла старое, зусім з глузду з'ехаў.

— Прашу, дзіця, сынок...

— Ніякі я табе не сынок. Не перашкаджай, недабітак стары!

— Ах так!

Юзік кінуўся на падворак. Дзе толькі сіла ўзялася! Ля паветі з калоды вырваў убітую сякеру і так жа жвава пачыкілдаў зноў на вуліцу.

— Не будзе тут вашага асфальту! Саступі! — закрычаў стары.

Інжынер збялеў, нават пот на ілбе праступіў. Ад былой зухаватасці і следу не засталося.

Праца спынілася. Працоўны люд у аранжавых камізэльках накіраваўся да сельскай крамы. Балазе якраз быў той дзень, адзін з трох на тыдзень, калі яна адчынялася. Начальства ў «казле» з'ехала. А Юзік, узброены сякерай, застаўся вартаваць невядома што.

Прыкладна праз гадзіну ў вёску завітаў цэлы картэж: інжынераўскі «уазік», сіня-жоўтыя «Жыгулі» з блакітным ліхтаром на даху і надпісам на бачыне «Милиция», а замыкала калону белая «Волга» старшыні сельскага савету. Лупачыха з зайздрасцю пазірала з-за плота. Бач ты, колькі да гэтага Юзіка начальства панаехала... Чым толькі гэты дурань кульгавы заслужыў такую павагу...

— Гражданин Бовбель, почему нарушаете общественный порядок? — афіцыйна звярнуўся ўчастковы.

— Не парушаю я нічога, — прабуркацеў Юзік.

— Вот, топором угрожаете. Что вам не нравится?

— Панаехалі! Не дам тутака асфальт класці.

— Дзядзька Юзік, — ласкава прамовіла старшыня сельсавета Лідзія Іванаўна, — ну чаму вы перашкаджаеце. Вам дабро робяць, а вы?

— Не дам, і ўсё!

Сварку на вуліцы Тэкля чула. Ды ці мала чаго сварыцца Юзік. З Лупачыхаю або яшчэ з кім. Але ўбачыўшы столькі машын і сярод іх міліцэйскія «Жыгулі», перапужалася не на жарт. Падышла бліжэй і адразу ж зразумела ўсё. У Юзіка ад хвалявання трэсліся рукі, а вочы зрабіліся вільготнымі.

Тэкля звярнулася да старшыні:

— Даражэнькая, я вам усё растлумачу. Не чапайце вы яго, ён і так ледзьве клывае. А асфальт яшчэ ж не пакладзены, на метр адсуньце калочкі, і ўсё...

— Ну што гэта за дурыкі, у мяне праект... — прараб мацюкнуўся.

— Но почему, что за упрямство?! — падаў голас міліцэйскі капітан.

Тэкля дрыготкім галасам, спяшаючыся, быццам баючыся, што яе не даслухаюць, пачала:

— Дзетачкі, даражэнькія... Мы з мужам у вайну пад гэтай ліпай чалавека пахавалі... Забітага... Салдаціка... Зусім юнак яшчэ быў, мо гадоў васямнаццаці. У нас у вёсцы ў вайну мадзяры стаялі. І вось, аднойчы, перад іх выходам на станцыю, у апошні вечар, гэтага застрэлілі... Не ведаю, свае ці партызаны... Гэтага і не шукаў ніхто, відаць, спяшаліся вельмі... Два дні ляжаў пры дарозе, што да хутара Бабы праз лес... Тут побач. Мы з Юзікам падвечар выкапалі магілку. Юзік зняў з пуні вароты і з тых дошак труну зрабіў... А майстар быў на ўсе рукі. Зараз хваробы данялі. А тады ўсё рабіў... Ужо амаль сцямнела... Палажылі мы таго хлапца ў дамавіну. Я псалом з Біблії прачытала, каб па людску ўсё было. Я ж пісьменная, пры Польшчы два класы скончыла. Чытаць і пісаць умею... Апусцілі дамавіну ў магілу, засыпалі зямліцай, узгорак не насыпалі. Баяліся... Мо сапраўды яго партызаны забілі. Што скажуць? Так і ляжыць ён, небарака, колькі гадкоў ужо. А Юзік зашкадаваў. Казаў, што калі б не памёр першынец — Міхаська, такі ж на гадах быў бы, як і гэты хлапчына... Дзетачкі, не трэба

магілку ў асфальт. Тут чалавек ляжыць...

Міліцыянт дастаў цыгарэту, пстрыкнуў запальнічкай і глыбока зацягнуўся. Інжынер пачухаў патыліцу і задуменна прыціх. Юзік, нібыта вярнуўшыся з забыцця, цвёрда прамовіў:

— Не дам магілу асфальтам закатваць. Тут жа чалавек!

Лідзію Іванаўну нібы хто кіпенем абдаў:

— Человек? Какой это человек? Это наш враг!

— Ён не вораг, дзіця зусім, нават паваяваць не паспеў, — ціхенька умольвала Тэкля.

— Делайте свое дело, — павярнула кіраўніца сельсавету расчырванелы твар да маладога інжынера.

— За что вам деньги платят? — гэта фраза была адрасаваная ўжо да капітана.

Тэкля загаласіла, амаль нягучна, сцапіўшы рукі на грудзях. Здавалася, што галосіць кожная клетачка стомленага жыццём цела старое жанчыны. Уся роспач, боль і адчай былі ў гэтым галашэнні...

Юзіку зрабілася зусім кепска. Толькі плямаў зсінелымі вуснамі. Міліцыянт адвёў старога ў хату і па рацыі папрасіў, каб выклікалі «хуткую».

Фельчар зрабіла укол. Юзіку падалося, што ён зусім страціў пачуццё часу. Праляжаў у ложку цэлы тыдзень. Дачка хацела везці бацьку ў больніцу, але Тэкля не дазволіла. Ціха прамовіла: «Ён ачуняе, не хвалюйцеся».

...Юзік зноў пачаў выходзіць з хаты. Але толькі ў двор. На вуліцу яму не хацелася. Шырокаю ракою там чарнеў свежы, яшчэ смярдзючы асфальт. Новая вуліца, новая дарога, толькі зрэдку падпэцканая каровінымі блінцамі.

## III

Лазар з Балашам пачалі рыхтавацца да сваёй даўно запланаванай вандроўкі на хутар. Аднагодкі і аднакурснікі, добрыя прыяцелі, калі не сказаць больш таго — сябры. Так было да ўчарашняга дня. Менавіта ўчарашні дзень перакрэсліў усё...

Яны самыя маладзейшыя ва ўзводзе. У хаціне беларускага селяніна Юзіка кватаруюць яшчэ двое іх таварышаў. Але ў тых зусім іншыя інтарэсы, іншыя размовы. Увесь час узгадваюць пра жонак з дзецьмі. Быццам і пагаварыць ім няма больш аб чым. Надакучыла слухаць, кожны дзень адно і тое ж. Ды і вёска надакучыла, глухамань сярод лясоў і балотаў. Надакучыла і вайна, хоць і не шмат часу прайшло, як прызвалі ў армію.

Лазар неаднаразова разважаў, што не так і блага сядзець у гэтай вёсачцы. Толькі вайсковая форма ды зброя нагадвалі пра вайну. Але час ад часу прыходзілі думкі аб нейкіх вандроўках ды прыгодах...

Нешта перахацелася Лазару ўжо і на хутар ісці. Што яму тыя паляшучкі? Адна была тут у вёсцы, да дзядзькі наведвалася. Прыгожая — і толькі. Мова незразумелая, а яна толькі рагоча ўвесь час. Мо і сёстры яе такія. «Не, не для мяне гэта ўсё, — падумаў Лазар, — дома чакае Тэрэзія, патрэбна ліст як мага хутчэй адпісаць».

А Балаш мітусіўся. Прыбору аднаго колькі: сагрэў вады, пагаліўся, начысціў да люстранога бляску боты... Раз-пораз пазіраў у люстэрка, што вісела на сцяне, і папраўляў чорны, як смоль, чуб. Потым нярвова ператрыбушыў ложак, дастаючы прыхаваны пад сеннікам пісталет. Лазар не ведаў, адкуль у прыяцеля такі ладны «Вальтэр». Балаш наогул любіў пакорпацца з вайсковым жалезам...

— Навошта табе пісталет? — запытаў Лазар.

— Няхай будзе на ўсялякі выпадак. Мала што, праз лес ісці... Не пойдзеш жа з вінтоўкай на хутар, дзяўчаты разбягуцца са страху, — Балаш гучна зарагатаў...

Лазар стаў ставіцца да сябра з нейкай асцярожнасцю не так даўно. На гэта былі падставы, але да высвятлення адносінаў справа пакуль не дайшла. Хлопец затаіў крыўду і перажываў моцна...

Неяк у размовах сярод жаўнераў Лазар пачуў навіну: карныя падраздзяленні немцаў шукаюць па навакольных вёсках габрэяў. Забіваюць усіх, не глядзяць: стары гэта, жанчына ці дзіця. Пачутае моцна ўстрывожыла юнака.

Неўзабаве пасля такіх размоў адбылася сутычка ягонага прыяцеля Балаша з жаўнерамі, што жылі побач, у хаце састарэлай кабеты. Спрэчка так сабе — драбяза. Але Балаш стаяў на сваім і не хацеў саступаць. Раптам адзін з жаўнераў гаркнуў:

— Дык ідзі запытайся пра гэта ў свайго сябрука-жыдочка. Мо ён разумнейшы за цябе і лепш ведае.

— Дзе той жыд? Запытаюся. Але ж, мабыць, хутка ўсім жыдам будзе канец, трэба спяшацца, — зарагатаў Балаш.

Ягоныя апаненты ацанілі гумар, бо і яны дружна зарагаталі.

Лазар чуў усё: і лаянку, і спрэчку, і зневажальныя словы... Але чаму Балаш так сябе паводзіць? Усе ведалі, што ён — Лазар Фахер быў з сям'і венгерскіх габрэяў. Ён сам ніколі не хаваў гэтага. Ды і якое гэта мае значэнне, хто ты — габрэй, венгр, нейкі там цыган альбо беларус...

Засядзеліся яны ў гэтых балотах. Трэба тэрмінова нешта мяняць. Балаш зусім нярвовы стаў. На пустым месцы сварку зробіць, добра яшчэ да бойкі справа не даходзіць. Але ж адносіны паміж прыяцелямі сапсаваліся амаль канчаткова.

Балаш чарговы раз зазірнуў у люстэрка і, гладзячы непакорную чупрыну, спытаў:

— А хто гэта табе ўчора ліст даслаў?

— Вядома ж хто — Тэрэзія, — стрымана адказаў Лазар і дастаў фотаздымак дзяўчыны.

Балаш Сабо ўважліва паглядзеў на фота і быццам бы жартаўліва прамовіў:

— Лазар, калі ты загінеш на гэтай вайне, то я ажанюся з ёю.

— Як загіну? Дык што ж ты... — у хлопца аж дух заняло.

Лазар вылецеў з хаты. Падбегам — да саду, упаў на траву пад старой грушай, зажмурыў вочы і ці то прысніў, ці ў нейкай мроі ўбачыў прыгожыя вочы Тэрэзіі. Зноў вясна. Яны ідуць мостам праз Дунай. Побач бяжыць Палько. Нешта расказвае, махае рукамі, быццам слоў яму не хапае, а сказаць хочацца. Дапамагае сабе жэстамі і робіцца ад гэтага падобным на ўстрывожаную птушку. І Балаш — з пажадлівым позіркам на Тэрэзію. І зноў яна, яе вочы...

— Ну, прачынайся, чаго разлёгся, вечар хутка, — Балаш злёгку тыцнуў бліскучым ботам прыяцелю ў бок.

— Што з таго, што вечар, — нехаця адказаў Лазар.

— Дык мы ж на хутар павінны ісці!

— Нічога і нікому я не павінен.

— Ну вось, крыўдуе. Не крыўдуй! Вайна пасварыла, яна і памірыць.

— Чалавек павінен быць чалавекам заўсёды.

— Ну, ужо пачаў філасофстваваць. Збірайся, дружа!

Лазар падняўся з неахвотай і пакрочыў у хату. Настрой быў сапсаваны канчаткова. Не хацелася ісці нікуды. На досвітку зборы і пераезд на станцыю. Прычапіўся гэты Балаш з паходам на хутар. «Дружа...» Быў сябар, ды ўвесь выйшаў. Ну і няхай сабе так. Па дарозе трэба сказаць яму ўсё: і пра знявагу, і пра подласць, і пра насмешкі, і пра страчанае сяброўства...

Сонца амаль схавалася за лесам. Па вільготнай сцежцы поплава, што цягнуўся ад вёскі да лесу, няспешна крочылі дзве постаці. А за тым лесам, у якім больш хмызу, чым дрэў, быў хутар. Сцежка на ўваходзе ў рэдкалессе звузілася, і жаўнеры пайшлі ўжо не побач, а адзін за адным. Лазар крочыў наперадзе. З поплава пачало даносіцца кваканне жаб. Пацягнула вільгаццю і прахалодаю. У ляску распачынаў сваю дасканалую песню салавей.

Нечакана нешта суха трэснула ззаду. Лазар рэзка павярнуўся. Балаш пазіраў на яго шырока раскрытымі вачыма. Быццам спужаўся нечага. Так моцна запнуло пад лапаткай, і гарачыня па ўсім целе.

— Што адбывецца? — толькі паспеў падумаць Лазар. Хацеў спытацца ў Балаша, і толькі зараз заўважыў у ягонай руцэ пісталет, з рулі якога ўзвіваўся сіняваты дымок. На вочы насунуўся густы туман. Перахапіла дыханне. Лазар бохнуўся на калені, схапіўся за галаву і ніцма ўпаў на жорсткі сітнік.

На мосце праз Дунай не было нікога, толькі яны ўдвох — закаханыя Лазар і Тэрэзія. Заходзіла сонца...

## IV

Усё ж перазімаваў Юзік. Хоць і страціў ужо ўсякую надзею пабачыць яшчэ адну ў сваім доўгім жыцці вясну. Тэкля — дык тая нічога сабе. На бульбяным полі ці на чарнічніках у бары ўлетку завіхаецца яшчэ не горш за маладых кабет.

Стары са сваім спрадвечным спадарожнікам кіем выйшаў у двор. Веснавое сонейка так старалася сагрэць астылую за зіму зямлю, што Юзіку балюча было глядзець. Зачыкілдаў да саду. На старой дзічцы нязменную сваю веснавую песню гарланіў шпак. Ля борці лётала некалькі пчолак.

Яшчэ адна вясна для Юзіка, для шпака, пчол, для саду, для усяго... Прысеў на прызбу. Цяжка ўжо нават па ўласным двары клываць. Прыжмурыў вочы. Ці то ад стомы і яснага сонца, ці то ад задавальнення. Вясна...

Раптам устрывожана закудахтаў певень. Юзік прахапіўся: на вуліцы, акурат ля веснічак, стаяла шэрая машына. Іншамарка, адзначыў пра сябе Юзік. Гэтае слова некалі пачуў ад Косціка, калі разам глядзелі на калону машынаў з райвыканкамаўскімі працаўнікамі, што рухалася па Зяблевічах да возера на адпачынак. Зяць з дачкою даўно марылі, каб памяняць свой «Масквіч» на замежнае аўто.

З легкавіка выйшлі трое. Кіроўца застаўся ў машыне. Мужчына і кабета сталага веку. Апранутыя неяк дзіўна. Нейкія замежнікі, адзначыў пра сябе стары. Зусім маладая дзяўчына за некалькі крокаў звярнулася да гаспадара:

— Вітаем вас. Ці не вы, часам, Іосіф Боўбель?

— Добрага здароў'я і вам. Я — Боўдзель.

— Я Святлана, перакладчыца, а гэта спадар Палько Фахер і ягоная жонка — спадарыня Тэрэзія. Яны з Венгрыі, з Будапешта. У іх да вас ёсць вельмі важная справа.

— Што за справа? — закрахтаў Юзік, а ў галаве быццам маланка бліснула ад здагадкі: няўжо сваякі таго мадзяра?

— Вы ж, пэўна, памятаеце, спадар Іосіф, як у вайну ў вашай хаце жылі венгерскія жаўнеры? У іх захаваўся ліст, дзе адзін з вашых пастаяльцаў пісаў, што знаходзяцца яны ў вёсцы Зяблевічы, а жывуць у хаце Іосіфа Боўбеля, прабачце, Іосіфа Боўдзеля. А саслужывец аднаго з салдатаў, вярнуўшыся з вайны, распавёў, што родны брат гэтага пана загінуў ад партызанскай кулі недзе ў палескай вёсцы.

— Ну, жылі тут чацвёра. Потым тых мадзяраў перавялі на чыгуначную станцыю. Я іх болей ніколі не бачыў, трох... А чацвёрты... — балючы камяк сціў горла старога, — таго забілі, небараку, зусім хлопчык яшчэ быў. Мы з Тэкляй маёй пахавалі яго, тут, побач, — стары паказаў кіем на вуліцу.

Святлана павярнулася да замежнікаў і хуценька пераклала ўсё сказанае Юзікам. Мужчына ўсхвалявана абняў старога. На вачах праступілі слёзы. Жанчына дастала насоўку і прамакнула слёзы. Венгры ўсхваляваўна загаманілі. Святлана спакойным мілагучным голасам звярнулася да Юзіка:

— А ці можна паказаць месца, магілу, дзе пахавалі той хлопец? У іх і прыбор адмысловы ёсць, каб весці такога кшталту пошукі.

Тэкля выйшла з хаты з чыгунком варанай бульбы. Трэба было ссыпаць яе ў ражку ды пасекчы секачом. Рабы падсвінак чакаў сваю гаспадыню ў перакошаным хляўчуку. Старая ледзьве не перакуліла гарачае варыва, бо знянацку пабачыла ў двары столькі незнаёмых людзей. Стала, як скамянелая, не ведала, што і рабіць.

— Гэта сваякі таго юнака, таго мадзяра, — ціха прамовіў стары.

— Ох, Божачкі! Сколькі год мінула. Знайшлі! Вітаю. У хату, калі ласка, праходзьце... — гаспадыня паставіла чыгунок, зняла брудны хвартух і стала ўсхвалявана папраўляць хустку.

Жанчыны пайшлі ў хату, а Фахер вярнуўся да машыны. Праз некаторы час ён таксама зайшоў у хату з бліскучай металічнай скрыняй, падобнай на чамадан сярэдніх памераў.

Тэкля пачала распавядаць пра салдацікаў, што жылі ў іх хаце, у гэтым пакоі, пра пахаванне забітага, пра тое, як увесь час баялася прызнацца, што пахавалі салдата варожай арміі. Яшчэ казала нешта пра Сталіна і Сібір, пра асфальт і старшыню сельсавета, пра...

Дзяўчына ледзьве паспявала з перакладам, а Юзіку падалося, што перакладае яна не ўсё з таго, што кажа жонка. Потым перакладчыца пагаманіла аб нечым з венграмі і спыталася ў гаспадароў:

— Пакажаце ім магілу?

— Пакажам, канешне ж, — адказала Тэкля, а Юзік у знак згоды толькі кіўнуў галавою.

— А чамадан навошта?

— Гэта прыбор, які дапамагае знайсці парэшткі, што ў зямлі ляжаць.

— Няўжо выкопваць будуць? Костачкі трывожыць? Няхай бы ляжаў ужо. Колькі год прайшло.

— Хочуць на радзіму адвезці, іхняя справа.

Тэрэзія не хавала насоўкі, увесь час плакала, ціха ўсхліпваючы. Не дачакаўшыся каханага з вайны, выйшла за яго малодшага брата. Не прыняла заляцанняў Балаша, сябра па даваенных студэнцкіх часах. Доўга верыла ў тое, што вернецца яе Лазар. Не вярнуўся, не прыйшоў з вайны...

Праз колькі хвілінаў усе гуртам пакінулі пакой. На вуліцы Юзік ткнуў кіем у зямлю і ціхенька прамовіў:

— Тут. Капайце тут, прыбор ваш не патрэбны. Але самі, я не здужаю.

Венгр дастаў са скрыні нейкія прылады, скруціў шчуп, падключыў яго чырвоным дротам да апарата. У слухаўцы запішчала, а на шэрым экранчыку нешта заміргацела. Венгр задаволена заківаў галавою і паклікаў шафёра. Той нехаця вылез з машыны. «Я капаць не наймаўся», — прабурчаў сабе пад нос, але выняў з багажніка рыдлёўку і нехаця падышоў да ўсіх. Хвілінаў з дваццаць мужчыны папераменна шчыравалі рыдлёўкай.

Пад асфальтам у яміне забялелі косткі...

Парэшткі склалі ў цыратовы пакет чорнага колеру. Пакет — у прыгожую драўляную скрынку, што хутчэй нагадвала шкатулку. Яміну засыпалі, патапталі нагамі.

Быццам баючыся каго, спешна склалі прыстасаванні ў багажнік, туды ж паставілі скрынку з парэшткамі. Венгр паціснуў руку Юзіку, стрымана абняў разгубленую Тэклю. Тое ж зрабіла паненка з заплаканымі вачыма. Неспадзяваныя госці селі ў легкавік, кіроўца рэзка крутануў стырно, і машына развярнулася амаль на месцы, жвава паімчала да райцэнтра.

«Неяк знянацку ўсё атрымалася, нечакана», — падумаў Юзік. Старая стаяла побач. Плачучы, шморгала носам і, нібы дзіця малое, размазвала бруднай рукою слёзы па схуднелых шчоках.

— Вось як яно сталася, — нарэшце задуменна прамовіла Тэкля і пайшла дарабляць свае нясконченыя гаспадарчыя справы.

Юзік раскрыў старэчую мазолістую далонь. Мадзяр, калі паціскаў яму на развітанне руку, усунуў нейкую паперку. Толькі цяпер стары разгледзеў на ёй няголенага мужчыну, нечым падобнага на яго самога, толькі маладзейшага. Грошы... Замежныя...

«Можа і добра, што старая не бачыла. На выходныя прыедзе Косцік. Вып'ем за салдата. Каб яму добра ляжалася там, на радзіме...»

**Красавік–травень 2010 г.**

ПРЫПЕЎКІ



# КВЕТКА-РУЖА МАЯ

Алесь НАЎРОЦКІ

## Доктар! Роды новыя прымай!

*Міхалінай кліча*
*мяне калгас «Прагрэс».*
*З кошыкам аднойчы*
*я шыбую ў лес.*

*Тут бамбавозы хмарай,*
*помню, гулі.*
*Над чарапамі зараз*
*гудуць чмялі.*

*Паспелі арэхі,*
*гараць агні рабін.*
*І хоць бы для пацехі —*
*баравік адзін.*

*Вавёрка танцуе*
*уверсе, дзе дубы.*
*Ох, нешта не шанцуе*
*мне на грыбы.*

*Чаму я не ў Парыжы?*
*Навошта гэты дуб?*
*І тут пад кепкай рыжай*
*угледзела я чуб.*

*Маліннік можа сведчыць:*
*там, дзе ўгрэўся мох,*
*як партызан-разведчык,*
*той чуб — Змітрок — залёг.*

*Вось бы мне прывабіць*
*таго прыгажуна.*
*І я… зрабіла выгляд,*
*што ў лесе я адна.*

*Скідаю я абнову.*
*Накрыла хусткай твар —*
*і у касцюме Евы*
*Лаўлю пупком загар.*

*Ляжу так. Загараю.*
*А грудзі — што званы.*
*Змітрок мой падпаўзае*
*і — шусь свае штаны.*

*Я штурх яго рукамі,*
*а ён мяне — ў палон.*
*І зазваніў званамі,*
*і разбудзіў мой звон.*

*З тае пары зацірку*
*есць маю Змітрок*
*з фарфоравай талеркі,*
*дзе сіні абадок.*

*Дабрэннейшага мужа*
*упалявала я.*
*Ён працавіты дужа,*
*дружная й сям'я.*

*У хаце званочкам —*
*шустрая дачка.*
*А хоча муж сыночка,*
*авось дасць Бог сынка!*

*Няп'ючай муж пароды*
*і не гультай.*
*Доктар! Роды*
*новыя прымай!*

## Па снезе

(1955 год. Я, санфельчар сельскай бальніцы, іду ў школу, каб правесці з вучнямі заняткі па комплексу ГСА — гатоў да санітарнай абароны.)

*Малаком белізна*
*разлілася вакол.*
*Вунь бяжыць ад гумна*
*сцежкі вузкае ствол.*

*Журавель вунь з вядром*
*захісталі вятры.*
*Вунь глядзіць пузыром*
*прасціна на шнуры…*

*Санны полаз дугой*
*запаўзае ў кусты.*
*У кішэні маёй*
*два пакеты-бінты.*

*З кожным крокам бліжэй*
*мой у школе ўрок,*
*беганіна дзяцей*
*і зазыўны званок.*

*Ў клас зайду я царом.*
*Будуць ведаць усе,*
*як раненне бінтом*
*абвязаць на назе,*

*як суняць той ручай,*
*што каліны ярчэй*
*(каб не трапіць у рай) —*
*навучу я дзяцей.*

*Вучаніца адна*
*там ёсць — Божухна мой!*
*Жах наводзіць яна*
*сваёй юнай красой.*

*А краса — быццам крык.*
*Тым я ўскрыкам жыву.*
*З-за яе пад цягнік*
*суне хтось галаву.*

*Мой глыбокі уздых…*
*Эх, каб я быў не я, —*
*мы б злавілі ўдваіх*
*разам з ёй салаўя!*

*Зноў убачыў за шклом*
*яе твар — у акне.*
*Рассякла, бы мячом*
*яна ўсмешкай мяне…*

*О, каб я быў герой!*
*Каб жа я быў не я, —*
*мы б злавілі зімой*
*разам з ёй салаўя!*

## Ружа

### I

*Я ў школу бягом,*
*каб паспець на ўрок.*
*А ля школы — дзетдом*
*і дзяцей табунок.*

*Сярод іх — і ЯНА,*
*хто за партай са мной.*
*Не спазняюся я,*
*раз ЯНА тут з дзятвой.*

*Суцішаю свой бег.*
*Абапёрся аб воз.*
*Даляцеў ЯЕ смех*
*ад зжаўцелых бяроз.*

*Развязаўся шнурок*
*на бацінку ЯЕ.*
*Зробіш крок, а ён скок:*
*крок зрабіць не дае.*

*Стан сагнула ЯНА.*
*Свой партфель — убачок.*
*І рукамі двума*
*хоп за той завіток.*

*О ты Божухна мой!*
*Які быў артыстызм!*
*Як жа спіна дугой*
*нахілілася ўніз!*

*Тут я маху не даў.*
*Мой учынак такі:*
*ружу вокам сарваў*
*з яе мілай шчакі.*

*Мне бяда — паўбяды:*
*я ж з той ружай багач.*
*Схаваў руку — куды?*
*Здагадайся ж, чытач!*

*Завязала шнурок.*
*Паглядзела кругом.*
*І пайшла на ўрок*
*паўз калодзеж з вядром.*

*А за ЁЮ праз міг*
*па лісцю, па агнях,*
*затаіўшы свой дых,*
*і я рушыў у шлях.*

*Нёс я торбу. А ў ёй —*
*кніжкі, кляксы, пяро,*
*вінт з сарванай разьбой*
*і ляза вастрыё.*

*Мне дванаццаты год.*
*Прылаўчыўся чытаць:*
*як асколкі — у рот*
*знакі-кулі ляцяць!*

*Стройных клёнаў кастры*
*лютавалі ўгары.*
*А на шэрым жвіры —*
*нібы колер зары.*

*Нібы шчасця збанок*
*ўвесь я выпіў да дна —*
*завязала ж шнурок*
*спрытным рухам ЯНА!*

*Будзе некалі знаць,*
*хто шчаслівы такі.*
*Удалося ж сарваць*
*ружу мне са шчакі!*

### II

*Дзяцел долатам б'е,*
*і дзяўбе, і дзяўбе.*
*Раздрабіў цішыню,*
*стукам лечыць сасну.*

*Адшугалі агні,*
*ападаюць на дол.*
*Дух прыемны, лясны,*
*дух смалісты вакол.*

*Вадаспады агнёў*
*з шалясценнем — уніз.*
*О, як шмат жалудоў*
*холад ноччу адгрыз!*

*Хмыз хавае лісу.*
*Адцвілі верасы.*
*Ну й апенак — касу*
*запускай і касі!*

*Дзяцел долатам б'е,*
*і дзяўбе, і дзяўбе.*
*Раздрабіў цішыню,*
*стукам лечыць сасну.*

*Бачу зноў цябе, лес,*
*толькі ў сумным святле.*
*Пад твой кіну навес*
*думы-мары свае.*

*Ўчора лёг я набок*
*і не спаў дапазна:*
*завязала ж шнурок*
*на бацінку ЯНА.*

*І я маху не даў.*
*Мой учынак такі:*
*ружу вокам сарваў*
*з яе мілай шчакі.*

*Дрэва, птушка і звер!*
*Знайце: нібы красу,*
*тую ружу цяпер*
*я па лесе нясу!*

*Дзяцел долатам б'е,*
*і дзяўбе, і дзяўбе.*
*Раздрабіў цішыню,*
*стукам лечыць сасну.*

*Сумны клін жураўлёў*
*у блакіце плыве.*
*Вадаспады агнёў —*
*на пажухлай траве.*

*Шэпчуць лісцяў агні,*
*колюць хмызу шыпы.*
*І куды ні зірні —*
*чарапы… чарапы…*

*З акружэння байцы*
*выбіваліся тут.*
*Немцы іх — у шчыпцы.*
*«Рус, здавайся!», «Капут!»*

*А патронаў няма,*
*толькі дзесяць штыхоў.*
*…………………*
*І не будзе пісьма*
*і праз сотню гадоў.*

*Дзяцел долатам б'е,*
*і дзяўбе, і дзяўбе,*
*раздрабіў цішыню,*
*стукам лечыць сасну.*

*Скокнуў з клёна лісток,*
*дакрануўся да пня.*
*Вельмі ж спрытна шнурок*
*завязала ЯНА…*

*І я маху не даў.*
*Мой учынак такі:*
*ружу вокам сарваў*
*з яе мілай шчакі.*

*Не завяне павек*
*кветка ружа мая*
*Праз нягоды і здзек*
*яе вынесу я.*

*З тою ружай мне жыць.*
*З ёй ісці цэлы век.*
*У глыбінях душы*
*тая ружа павек!*

*Дзяцел долатам б'е,*
*і дзяўбе, і дзяўбе,*
*раздрабіў цішыню,*
*стукам лечыць сасну…*

26.ІІ.2010 г.

УРОК

# РАЗГРОМ ТАТАРАЎ ПАД КЛЕЦКАМ

Уладзімір АРЛОЎ





Князь Іван ІІІ


Герб Гірэяў

## Небяспека з усходу і поўдня

Разбіўшы нямецкіх рыцараў пад Грунвальдам, нашыя продкі ўсталявалі мір на заходняй мяжы. Але неўзабаве ў Вялікага Княства Літоўскага з'явіліся новыя небяспечныя ворагі.

На ўсходзе гэта была Расейская дзяржава, якую тады называлі Масковіяй. Маскоўскія князі аб'ядналі расейскія княствы і пачалі прагна пазіраць на суседнюю краіну. Беларусь яны называлі «спрадвеку сваёй» зямлёй, хоць яна ніколі не была пад уладаю Масквы.

Масковія распачала з Вялікім Княствам бясконцыя крывавыя войны.

Расейскія землі доўгі час жылі ў татарскай няволі. 250 гадоў яны былі часткаю велізарнай мангола-татарскай дзяржавы — Залатой Арды. Але і пасля вызвалення з-пад ардынскага ярма парадкі ў Маскоўскім княстве засталіся такія ж дзікія і жорсткія, як і пры татарах. На малюнках у тагачасных еўрапейскіх кнігах маскоўскія ўладары надзвычай падобныя на татарскіх ханаў.

Тым часам на рэштках былой Залатой Арды ўзнікла Крымскае ханства. Яно атрымлівала вялікую дапамогу з Турцыі і хутка мацнела.

Ваяўнічае Крымскае ханства зрабілася для нашай дзяржавы яшчэ адным ворагам, які пагражаў з поўдня.

## Наезды ардынцаў

Ханства жыло за кошт нападаў на суседнія землі. Амаль штогод татарская конніца ўрывалася на абшары Вялікага Княства Літоўскага. Каб захапіць больш здабычы, ворагі пачыналі паходы пры канцы лета, калі быў сабраны ўраджай. Але татарскія аддзелы-загоны не проста забіралі нажытае мірнай працай дабро. Яны захоплівалі людзей у палон і прадавалі іх у рабства.

Варожыя аддзелы лёгкаўзброеных вершнікаў звычайна абыходзілі ўмацаваныя гарады. Іхняй мэтаю былі вёскі і мястэчкі, дзе жыхары не маглі схавацца за мурамі замкаў. Захопнікі пакідалі за сабою попел пажарышчаў, целы забітых і нязмерная гора жывых, якіх вялі ў няволю. Кожны татарын меў з сабою некалькі падменных коней. Гэта дазваляла захопнікам рухацца амаль без перапынкаў і хутка пакідаць чужыя землі.

Асабліва небяспечным Крымскае ханства зрабілася, калі ўчыніла вайсковую дамову з маскоўскім князем Іванам ІІІ. Татары пустошылі і руйнавалі Берасцейшчыну, Мазыршчыну, дасягалі нават ваколіцаў Менска.

Нашыя прадзеды мужна бараніліся. Яны няраз выпраўляліся ў пагоню за стэпавымі драпежнікамі. Татараў білі не толькі на лясных дарогах, але і ў чыстым полі. Кожны другі наезд стэпавікоў заканчваўся іхняй паразай, але варожыя напады не спыняліся.

## Лета 1506 года

Тое лета прынесла беларускай зямлі новае цяжкое выпрабаванне. У ліпені на Беларусь рушыла 20-тысячная конная арда. Яе вялі сыны крымскага хана «царэвічы» Біці і Бурнаш.

Татары хутка дайшлі да Наваградка і Ліды. Яны палілі вёскі і цэрквы, забівалі мужчын, а жанчын і дзяцей, абыходзячыся з імі як з жывёлай, гналі ў палон.

Наш гаспадар Аляксандр і вялікакняжская рада пастанавілі, што гэтым разам ардынцаў нельга адпусціць жывымі. Усе, хто мог трымаць у руцэ шаблю, пачалі з Наваградчыны, Гарадзеншчыны і Меншчыны збірацца ў Лідзе. Адтуль войска рушыла да Наваградка. Баяры Юрай і Андрэй Неміровічы ўзялі ў палон шасцёх татараў. Ад іх даведаліся, што галоўны стан ворагаў знаходзіцца пад Клецкам.

Памаліўшыся за перамогу ў наваградскіх цэрквах і касцёлах, нашыя аддзелы выправіліся на Клецак. У войску было ўжо блізу 10 тысячаў вершнікаў. Іхні шлях праходзіў праз папаленыя вёскі і мястэчкі Цырын, Паланечку, Ішкалдзь, Молева, Ліпу.

Ваярамі камандаваў князь Міхайла Глінскі. Яму было 36 гадоў. У маладосці князь вучыўся ў Італіі і Нямеччыне, ведаў шмат мораў і падарожнічаў па Еўропе. Перад вяртаннем на радзіму ён служыў у арміі германскага імператара і добра ведаў вайсковую справу.

5 жніўня князь са сваімі рыцарамі дасягнуў вёскі Красны Стаў на рацэ Лань. З высокага берага яны ўбачылі на тым баку ракі гатовую да бітвы татарскую арду. Удалечыні пад аховаю сядзелі на зямлі тысячы нашых палонных. Жанчыны тулілі да сябе дзяцей, шапталі малітвы і з надзеяю глядзелі на ліцвінскае войска.

## Нашы дзеці не будуць рабамі

Ворагаў было ўдвая болей. Аднак ліцвіны (так у тыя часы зваліся беларусы) адрозна ад захопнікаў мелі не толькі лукі, але і агнепальную зброю. Перастрэлка з татарамі доўжылася некалькі гадзінаў. Пад заслонаю трапных стрэлаў нашых гармат і рушніцаў удалося зрабіць цераз Лань дзве гаці для пераправы.

Перад пачаткам бітвы князь Глінскі ўзняў над галавой шаблю і звярнуўся да ваяроў з прамоваю. Паказваючы на захопленых татарамі палонных, ён запытаўся: «Няўжо мы дазволім, каб нашыя жанчыны сталі рабынямі? Няўжо дазволім, каб дзеці былі нявольнікамі і забылі сваю зямлю?» — «Не дазволім!!!» — адказаў шматтысячны хор галасоў.

Правы фланг княжскага войска пераправіўся на другі бок Лані так імкліва, што апярэдзіў іншых і трапіў пад моцны націск лепшых татарскіх сечкароў. Нашыя ваяры трымаліся стойка, але многія гінулі, бо на аднаго налятала па два-тры ворагі.

Князь загадаў паскорыць пераправу астатніх сілаў. Ён сам павёў іх на бітву з гучным воклічам "За мной, браты!". Пад Глінскім двойчы забівалі каня, але князь не пакінуў сечу. Шляхецкая конніца ў сталёвых панцырах рассекла ардынцаў надвое. Тым часам перайшлі ў наступ і палкі правага флангу. Частку ворагаў заціснулі ў «абцугі» і пасеклі. Рэшта разам з татарскімі «царэвічамі» кінулася наўцёкі.

У небе радасна заспявалі беларускія жаўрукі.

## Вянок князю Міхайлу

Пагоня доўжылася шмат дзён. Захопнікі гінулі ў рэках і балотах. Татараў пераймалі каля Слуцка, Петрыкава і нават ва Украіне. Чатыры тысячы ворагаў трапілі ў палон. Толькі некалькі сотняў з велізарнай арды дабраліся да Крыма жывымі. Здабычаю пераможцаў стаў і табун з 30 тысячаў коней.

Рыцары Міхайлы Глінскага вярнулі свабоду ўсім 40 тысячам палонных. З жахам успаміналі яны дні, праведзеныя ў няволі, беларускія жанчыны, дзяўчаты і дзеці вярталіся ў родныя хаты.

Захавалася паданне, што на знак падзякі вызваленыя дзяўчаткі звілі князю Міхайлу вялікі вянок з лугавых рамонкаў і званочкаў.

Клецкая бітва сталася першай буйной перамогаю над крымскімі татарамі. Хан Менглі-Гірэй так напалохаўся, што адразу пачаў мірныя перамовы. На нейкі час ён нават ператвараўся ў хаўрусніка Вялікага Княства Літоўскага…

## Настасся Слуцкая

Побач з рыцарамі-мужчынамі супроць татараў мужна змагаліся і жанчыны. Гісторыя захавала імя адной з іх — Настассі Слуцкай.

На пачатку XVI стагоддзя загоны хана Баты-Гірэя ўсё часцей даходзілі да Слуцка. Яны пустошылі наваколле, палілі слуцкія прадмесці, але ўзяць Слуцкі замак не маглі.

Аднойчы вялікае войска стэпавікоў зноў атачыла замак. Каля татарскіх вогнішчаў гучаў радасны смех. Захопнікі ведалі, што гэтым разам слуцкі князь Сямён Алелькавіч у ад'ездзе – і не сумняваліся, што без галоўнага абаронцы случакі не вытрымаюць аблогі.

Але ворагі пралічыліся. Жонка князя Сямёна Настасся загадала ваярам і ўсім жыхарам горада сабрацца на пляцы. Неўзабаве здзіўленыя случакі ўбачылі незнаёмага ім коннага рыцара. Калі ён зняў шалом, людзі пазналі залацістыя косы княгіні Настассі. «Я сама павяду вас на бітву!» — абвясціла яна.

Татары цярпліва чакалі, калі горад здасца. Але замест гэтага замкавая брама нечакана расчынілася і адтуль рынулася на ардынцаў конная лавіна. Наперадзе імчалася княгіня Настасся. Пасля кароткай сечы ворагі не вытрымалі і пачалі адступаць.

Праз некалькі дзён вярнуўся князь Сямён. Ён сціснуў жонку ў радасных абдымках, аднак адмовіўся сядаць за святочны стол. Трэба было як след правучыць татарскіх рабаўнікоў. Іх дагналі і разбілі пад Давыд-Гарадком. Побач з мужам у бітве была і княгіня Настасся.

Яна і пазней, калі князя Сямёна не стала, працягвала ваяваць з татарамі. Стэпавікі ні разу не змаглі захапіць Слуцак. Пра княгіню-змагарку ўжо ў XXI стагоддзі ў Беларусі знялі мастацкі кінафільм, які так і называецца — «Настасся Слуцкая».

***

Слаўная перамога пад Клецкам засталася і ў летапісах, і ў памяці беларусаў. Некалькі стагоддзяў на месцы колішняй бітвы людзі ставілі крыжы. У 1996 годзе нашчадкі ўшанавалі яе герояў помнікам.

### Пытанні і заданні

1. Якія новыя ворагі з'явіліся ў нашых продкаў пасля разгрому нямецкіх рыцараў пад Грунвальдам?
2. Якое няшчасце напаткала Беларусь у ліпені 1506 года?
3. Што вы даведаліся пра князя Міхайлу Глінскага?
4. Як князь Міхайла з войскам рыхтаваліся да Клецкай бітвы? Што надавала ім адвагі?
5. Раскажыце пра разгром татарскіх захопнікаў.
6. Колькі палонных вызвалілі нашыя ваяры? Як палонныя аддзячылі князю Міхайлу?
7. Як беларусы захоўваюць памяць пра перамогу пад Клецкам?
8. Чаму мы памятаем княгіню Настассю Слуцкую?


Бітва пад Клецкам. Старадаўняя гравюра


Выгляд старога Клецка

ПОСТАЦІ

# ЧАРЭЯ МІЛАША

Сяргей ХАРЭЎСКІ

**Ёсць, ёсць у нашай краіне яшчэ таямніцы, містычныя мясціны, што нібы вэлюмам ахутвае нязнанасць, недасяжнасць ці забытасць…**

Адно з такіх месцаў – Чарэя, былая сталіца Чарэйскага княства, былое родавае гняздо Сапегаў, былое котлішча Мілашаў, былы цэнтр Чарэйскага раёна… Гэтае легендарнае места знаходзіцца, дарэчы, куды бліжэй ад Менска, чым гэта можна сабе ўявіць, чытаючы пра ягоную бурлівую й парадаксальную гісторыю. Маскоўская шаша без затрымкі даімчыць вас да Бабра. А там адзін толькі паварот улева і… па гарбатым асфальце, у лапіках бітуму і каровіных ляпёхах праз якіх пятнаццаць хвілінаў можна апынуцца сярод стромых гор і курганоў на беразе разлеглага Чарэйскага возера. І цяжка даць веры, што некалі тут віравала людское жыццё…

Чарэйскае княства было добра вядомае з XIV стагоддзя. У 1454 г. япіскап смаленскі Місаіл заснаваў тут, на возеры Галаўль, славуты Чарэйскі манастыр. У часы вайны 1432–1435 гадоў паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам стары чарэйскі князь Міхал Пястрuцкі быў забіты Свідрыгайлам. За вернасць Пяструцкіх вялікі князь Жыгімонт падараваў Чарэйскаму княству багата новых уладанняў. Асаблівы росквіт Чарэі прыпаў аднак на эпоху Сапегаў, якія хацелі пераўтварыць гэты край у сваю сапраўдную сталіцу, кшталту Нясвіжу Радзівілаў…

Цяпер мала хто з нас можа ўявіць сабе, што Чашніцкі раён мае багатую гісторыю. Закінутыя, з праваленымі дахамі колішнія калгасныя будынкі, пустыя дамы, вялікі пусты дзіцячы садок… Дыхтоўны вялікі будынак школы, сталінскіх часоў, таксама пусты. Чуваць адно пошум лісця ў здзічэлых прысадах і на закінутых могілках… А менавіта тут знаходзіцца старажытны Лукомль, цэнтр некалі слыннага й заможнага княства. Побач ёсць яшчэ вёска Чарэя. Некалі й тут быў княскі пасад. Чарэя славілася сваім базыльянскім кляштарам, што стаяў на выспе пасярод возера. Тут нарадзіўся славуты дзеяч каталіцкае царквы, выбітны грамадзкі дзеяч Расійскай імперыі арцыбіскуп магілёўскі Стэфан Дзенісевіч, які шмат зрабіў дзеля беларусізацыі рэлігійнага жыцця.

А яшчэ гэтая мясціна дала свету выдатнага франкамоўнага паэта-містыка Оскара Любіча-Мілаша. Пасля першай сусветнай вайны ён стаў літоўскім дыпламатам у Парыжы і ўсе свае сілы аддаў услаўленню Літвы, хоць да канца дзён гэтак і не акрэсліў, нават сам для сябе, дзе яе межы... І ўвесь час мроіў пра сваю міфічную Чарэю.

«Хадземце, я павяду вас у край дзівосаў, сутоння, імглы і ціхіх шэптаў… Вось мы й тут, на ўскраінах польскіх земляў, ужо пэўна паўночных, але яшчэ закаханых у колеры. Адзін узмах крыла – і мы паляцім над краінай, дзе ўсе рэчы пазначаныя прыгаслым колерам успамінаў. Нас агортвае пах гарлачыкаў, імшастая лясная смуга. Млявае бледнае неба задуменнага краю, што адкрываецца перад намі, хавае ў сабе ўсю свежасць позірку старавечных плямёнаў».

Гэтак пісаў пра свой родны кут Оскар Мілаш, які нарадзіўся ў дзедавым фальварку, у Чарэі, на ўскрайку старажытнага места, слава якога некалі сягала ў самыя далёкія куткі Рэчы Паспалітае…

Як ні дзіўна, у Чарэі пра Мілашаў ведаюць калі не ўсе, то амаль усе. Простыя людзі са смакам перадаюць дзіўную ў сваёй цвёрдай дакладнасці апакрыфічную лічбу – 126. Столькі, маўляў, у Мілашаў было гатункаў бэзу. А вось супрацоўніцы бібліятэкі й клубу выдатна абазнаныя ў акалічнасцях біяграфіі свайго славутага земляка – французскага паэта. Нават распавядаюць такую трапную дэталь, што ён, калі прыязджаў сюды з Францыі дваццацігадовым дзецюком, то скакаў вярхом на кані, вось «да гэтага месца».

У часы Мілашаў Чарэя была хоць і прыгожым, але ўжо проста мястэчкам, закінутым і забытым, на сумежжы губерняў, наўзбоч ад усіх вартых увагі шляхоў. Старасвецкія храмы, ружанец таямнічых курганоў над зіхоткім бяздоннем вазёраў і на доўгія мілі вакол нерухомага забыцця. Род тутэйшых Мілашаў належыў да буйных абшарнікаў, бо яны мелі ў валоліцах 30 тысячаў гектараў зямлі. Хоць слыннымі іх зрабіла не багацце, а незвычайна моцныя характары й арыгінальныя ўчынкі. Дзед, слухаючыся адно свайго сэрца, вывез таемна з Італіі сабе жонку – Наталі Тассістра, з роду гэнуэзкіх патрыцыяў. А бацька Оскара, Уладыслаў, таксама здзівіў публіку, пабраўшыся шлюбам з габрэйкаю, Марыяй Разаліяй Разэнталь, дачкою настаўніка габрэйскае мовы з Варшавы… У выніку гэткіх сямейных акалічнасцяў 28 траўня 1877 года й нарадзіўся ў прадзедавым фальварку Оскар Вэнцэслаў Мілаш, гербу Любіч. А ў 1889 годзе іхная сям'я пераехала ў Парыж, дзе й было яму наканавана жыць і тварыць да конца дзён. Ён атрымаў такую адукацыю, якую хацеў: стаў знаным у Парыжы арыенталістам, адмыслоўцам у мовах і верах Усходу. Там, ужо праз дзесяць гадоў, выходзіць ягоная першая кніжка вершаў «La Poem des Decadences».

У часы маладосці Мілаша Чарэя лічылася культурным мястэчкам. Тут былі народная вучэльня, касцёл, сінагога ды царква. У блізкіх Чашніках працавалі ажно тры народныя вучэльні й адна вышэйшая, было шмат розных бажніцаў.

Але.. у 1904 годзе, пасля смерці бацькі, ён вяртаецца ў Чарэю, дзе мусова заняўся вялікай гаспадаркаю. Знаходзіць час і для далёкіх падарожжаў – у Ангельшчыну, у Расію, у Афрыку… У ягоныя рукі трапляе першая легальная газэта па-літувіску «Vilniaus ћinios». Хоць пісаць па-літувіску Мілаш не навучыўся, але менавіта ў гэты час ён раптоўна становіцца prince lituanien, літоўскім князем, апантаным усім, што тычыцца Літвы. У 1918 годзе ён ужо браў удзел у пасяджэннях Лігі Нацыяў як прадстаўнік… літоўскае дэлегацыі. Думаецца, што з гэткім жа поспехам, а то і большым, ён мог бы стаць дзеячом беларускага Адраджэння, прадстаўляць Беларускую Народную Рэспубліку... Але сталася так, як сталася.

На месцы колішняй сядзібы Мілашаў сёння стаіць школа, пабудаваная па вайне. Ад былога панскага фальварку пасярод школьнага двара застаўся падземны склеп – ляднік. Уваход у яго адрамантаваны, і ўсё вакол дагледжана. Аказваецца, у вайну тут была немецкая катоўня. За савецкім часам уваход сюды каравуліла піянерская варта… Сёння тубыльцы гавораць пра гэта з горкай усмешкаю. Вялікі будынак школы пустуе…

У 1905 годзе ў Чарэі, акурат тады, як тут гаспадарыў Оскар Мілаш, былі дзве праваслаўныя царквы (ад адной гэтаксама не засталося і знаку), вялікі каталіцкі касцёл, тры капліцы, царкоўна-прыходская школа, паштова-тэлеграфнае аддзяленне, а апроч таго сінагога, тры габрэйскія малельні і рэлігійная школа… Соннае правінцыйнае жыццё, па свому багатае, па свойму мілае…

Прамінула няшмат часу, і Чарэю, з яе пракаветнай гісторыяй, з таямніцамі й байкамі, выпаліў час. Бязлітасная калектывізацыя, шалёная бязбожніцтва сцерлі амаль дашчэнту ўсё, што тут было. Ад даваеннае Чарэі, раённага цэнтра, не засталося нават фотаздымкаў… З пачаткам рэпрэсіяў Чарэйскі раён быў ліквідаваны, пасля ліквідоўвалі людзей.

А 5 сакавіка 1942 года на ускрайку Чарэі, акурат за Мілашавымі прысадамі, немцы забілі 800 тутэйшых габрэяў. Калі хто будзе ў Чарэі – паспрабуйце ў хмызняку знайсці гэтае вусцішнае месца, куды не вядзе нават сцяжына…

З тых часоў шмат чаго змянілася. Чашніцкі раён цяпер — амаль цалкам меліяраваная раўніна, адзіная слава якой — электрастанцыя імя 50-х угодкаў СССР у Новалукомлі ды Лукомскае вадасховішча пры ёй, на дне якога засталіся курганы й магілы...



Колішняя Белая царква

Нядаўна пра родны край Оскара Мілаша згадалі і ў Менску. Гадоў дзесяць таму пасля крытычнага артыкула ў «Советской Белоруссии» ў Чашніцкі раён з інспекцыяй з'ездзіў тагачасны прэзідэнтаў памочнік П… Па выніках ён паклаў на стол свайго начальніка дакладную запіску, у якой красамоўна апавёў пра гэты куток Беларусі. Улічваючы, што запіска ў газету не трапіла, прывяду з яе пару цытатаў:

«...Лад жыцця нават вясковае інтэлігенцыі (настаўнікаў, спецыялістаў саўгасаў і гэтак далей), не кажучы пра простых работнікаў, дэградуе. Людзі спяць без пасцельнае бялізны, не маюць нармальнага посуду, апранутыя ў лахманы, практычна не карыстаюцца звычайнымі сродкамі гігіены, мыйнымі сродкамі, не маюць тэлевізараў, не чытаюць газет. У дамах зусім няма кніг і часопісаў. У большасці дробных паселішчаў няма тэлефоннае сувязі. У некаторых дамах адлучанае энергазабеспячэнне…».

Гэткім выглядае Чашніцкі раён на досвітку XXI стагоддзя. Вядома, адсутнасць кніг на радзіме Мілаша рэч дзікаватая. Але й гэта не ўсё... Далей напісана:

«Харчаванне людзей крайне беднае — сала ды бульба, бо лядоўняў няма, лёхі не выкарыстоўваюць, садавіну й гародніну няма дзе захоўваць. Ды й немагчыма іх набыць. Дзеці выглядаюць млявымі, неахайна апранутыя. Іх ратуе ад голаду толькі цэнтралізаванае харчаванне ў школах. Медычная абслуга кепская. У клубах не топіцца».

На чатырох старонках гэтага дакумента паўстае катастрафічная карціна жыцця беларускай правінцыі. На загад чыноўніка з Менска ў тым раёне была праведзеная генеральная прыборка. Што маглі — тое зрабілі... Купляць жа кнігі тутэйшым людзям, вядома, ніхто не будзе. Зрэшты, і карміць іх няма каму. А сакрэтныя дакладныя запіскі апошніх гадоў лягуць у архівы. Можна шукаць вінаватых, але сёння няма сэнсу.

Ёсць сэнс пачытаць Оскара Мілаша. Ягоная радзіма застанецца ў сусветнай культуры гэткай, якой яе стварыў ён. Без голаду, бруду і брыды запусцення...



Былая школа ў Чарэі

ВЕРШЫ

# РАКА СНОЎ

Эдуард ДУБЯНЕЦКІ

## Карт-бланш

*У чэрствым свеце страчваем мы існасць,*
*Нібыта дрэвы, што сваю лістоту*
*Па волі восені губляюць, і пяшчоту*
*Сваю зямлі ўсю аддаюць. І прамяністасць*

*Апошніх дзён мы бачым пільным вокам,*
*Ў якім люструюцца ўсе клопаты і мары*
*Зняверанага людства, на якога чары*
*Смяротныя наведзены.*
*Нячутным крокам*

*Ўваходзіць ў сэрца Боль і за сабою Скруху,*
*Бы паслугачку верную, вядзе,*
*І неўзабаве нашых душ валадарамі*

*Яны становяцца, і сэрцы ланцугамі*
*Акручваюць, сціскаюць, і Бядзе*
*Даюць карт-бланш на руйнаванне Духу…*

## Басаногі дождж

***Марская акварэль***

*Неба ўжо цяжарнае аблокамі.*
*Спее дождж там,*
*Нібы плод на дрэве.*
*Жальба чуецца*
*Ва ўсхваляваным чаек спеве,*
*Вецер з хвалямі*
*Гуляе сінявокімі.*

*...Шчэ імгненне, —*
*І вось мору падарунак*
*Неба пасылае — летні дождж!*

*Мора усміхнулася,*
*Таму што*
*Ў яго дождж той*
*Падаў басаножк…*

## Рака сноў

*Я плаваю ў рэчцы сваіх сумных сноў.*
*У снах тых вобраз твой ўзнікае зноў*
*і зноў.*

*Наяве мы з табой не разам ужо даўно*
*І ты далёка — у краіне халадоў,*
*дажджоў.*

*Узгадваць соладка і сумна ў час начны*
*Вачэй пяшчотных бляск,*
*пах чорных валасоў…*

*Так, ты сыйшла, аднак дагэтуль чую гук*
*Тваіх даверлівых,*
*кранальна-ціхіх слоў.*

*І сэнсу папракаць кагосьці ўжо няма —*
*Не вытрымалі рэўнасці шалёнай*
*скразьнякоў...*

*…Але я веру-спадзяюся, што мая душа*
*Калісьці ўвойдзе ў палац кахання зноў.*



## Вечная спадарожніца

*На ўсе мае дарогі і трывогі,*
*На ўсе памкненні,*
*Мары-летуценні*
*Заўжды*
*Кладзецца*
*Твой*
*Ледзь бачны цень...*

*...Заўжды*
*Ў душу маю*
*Змяёю запаўзаеш*
*І там сабе знаходзіш*
*Самы ўтульны*
*І самы дальні*
*Цёплы закуток...*

*...Заўжды*
*Маё ты сэрца апякаеш,*
*Нібы агонь,*
*Ці востры і балючы,*
*Імгненны*
*Электрычны ток...*

*...Заўжды*
*Са мной ты —*
*Спадарожніца мая,*
*Якая*
*Не адыходзіць ад мяне*
*Нат ні на крок,*
*Якую*
*І сам не прагаю*
*Я знарок...*

*...І вось ўсё гэта ты —*
*Жахліва-прыцягальная*
*І ненавісна-любая,*
*Пякучая,*
*Салодка-горкая*
*І неадчэпная мая —*
*Ад-зі-но-та!...*

## Кругазварот пачуццяў

*Дзень. Бярозавы гай.*
*— Ты мяне не чапай!*

*Стромкі бераг ракі.*
*— Цёплы дотык рукі.*

*Вечар. Дом. Мае вершы.*
*— Пацалунак наш першы.*

*Ложак. Ноч. Яна. Я.*
*— Шчасця крык. Цішыня.*

*Цемра. Сон. Час світання.*
*— Зноў мы ў коле кахання.*

*Дзень. Сум. Слёзы твае.*
*— Не чапай ты мяне!..*

# ПАРЦЭЛЫ

Алесь МАКРАЦОЎ

*У калысцы*
*(братавай і маёй)*
*пад павеццю*
*спалохана*
*куры кудахчуць…*

***

*Пачатак вайны…*
*успамінае маці:*
*«На дварэ цёмна…*
*Мы ўсе яшчэ спім…*
*А немец —*
*карову ўжо доіць…»*

***

*Над студняй,*
*выкапанай*
*маім дзедам,*
*апошні журавель…*

***

*Працяжнік*
*між датамі*
*нараджэння*
*і смерці…*



***

*Яловыя лапкі*
*на сумнай дарозе…*
*Ад хаты суседа…*

***

*Калгаснае*
*кукурузнае поле…*
*Непазнаныя*
*джунглі дзяцінства.*

***

*Жыццё*
*ў перакладзе*
*з таго свету*
*на гэты…*

***

*Выгаранне*
*фарбаў*
*жыцця*
*пад сонцам…*

***

*Гушкаемся*
*ўдваіх на арэлях:*
*душа — цела,*
*цела — душа…*

***

*Капалі бульбу*
*да прыцемкаў…*
*Клубні*
*ў барознах веку.*

***

*Плады*
*дрэва жыцця,*
*паточаныя*
*грахамі…*

ДЭБЮТ

# АПОВЕСЦЬ ПРА ЧАЛАВЕКА, ЯКІ

Сяргей ЕГАРЭЙЧАНКА



**Калісьці даўным-даўно тут не было нічога…**

Слова «даўно» кожны разумее як хоча. Для кагосьці «даўно» — гэта сівыя стагоддзі і справы дзён, пра якія пішуць толькі ў падручніках гісторыі і псеўдагістарычных раманах. Нехта лічыць, што «даўно» — гэта дзесяць, дваццаць, трыццаць гадоў таму — часы маладосці актуальнага рэспандэнта. Ну а нехта можа сказаць: «Гэта было даўно — хіба пазаўчора».

Калісьці даўным-даўно тут не было нічога.

І, самае галоўнае, тут не было гэтых западзін грунта, на першы погляд непрыкметных, побач з якімі можна прайсці, не заўважыўшы, калі не ведаць, што яны азначаюць. Розныя па памеры — метр на тры, два на пяць, тры на дзесяць — яны падаваліся ранамі на грудзях зямлі.

Спякотны травеньскі дзень пераваліў за сярэдзіну. Сонца завісла над вершалінамі елак, яго промні хутка сушылі аголеную рыдлёўкамі глебу.

Сярод зялёнага дывана маладой травы чорнымі плямамі зеўралі тры глыбокія ямы. Рота байцоў стройбата ўжо некалькі гадзінаў працягвала працу, абсалютна не разумеючы, для чаго яна патрэбна.

Але былі тут і тыя, для каго гэтая справа была не толькі не бессэнсоўнай, але й выключнай. Такіх людзей некалькі: спецыялісты-археолагі Інстытута гісторыі ды мясцовыя партыйныя функцыянеры.

— Вацлаў Міхайлавіч, — з аднаго раскопу пачуўся нізкі голас салдата. — Вам трэба на гэта паглядзець.

— Костка... — прашаптаў навуковец, асцярожна прымаючы знаходку. Нельга было вызначыць, што гэта за костка — рыдлёўка салдата, стомленага працай, проста размалаціла яе на шмат маленькіх фрагментаў, якія не падаваліся ніякай ідэнтыфікацыі.

— Далей капаць з максімальнай асцярожнасцю!

Да справы падключыліся прафесіяналы-археолагі. Праз дваццаць хвілінаў перад вачыма непрыемна здзіўленых чыноўнікаў з'явілася жахлівае відовішча: добра захаваны чэрап з акуратнай дзірачкай на патыліцы. Верхняй пярэдняй часткі фактычна не існавала — яе праламала куля на выхадзе.

## Мы

Жыць. Вось усё, што мы хацелі. Жыць і працаваць. У нас не было дзяцей — мы былі яшчэ занадта маладымі.

Наша вёска была даволі вялікай — хоць і не з'яўлялася райцэнтрам, але мела сваю школу — школу, у якой навучаліся амаль сорак дзетак.

Мы верылі ў тое, што дзяржава не памыляецца — а кіраўнікі прагнуць толькі лепшай долі народам.

Тых, хто не верыў, з кожным днём станавілася ўсё менш ды менш — хтосьці паціху астываў у сваёй непрымірымасці, а кагосьці астыць прымушалі. Каго словам, каго пагрозай, каго турмой. Каго куляй.

Не ведалі мы гэтага тады — так званая «новая інтэлігенцыя» — маладыя настаўнікі, якіх пасля сканчэння спецыяльных курсаў накіравалі працаваць у гэты куток Беларускай ССР на самай мяжы Менскага раёну — за дваццаць кіламетраў ад «варожай» Польшчы. Прынамсі, Польшчай мясцовы парткам упарта называў беларускія землі, адабраныя па сумнавядомай дамове 1920 года.

Я спецыяльна кажу «мы». «Мы» — гэта я і мая жонка, разам з якой закончылі настаўніцкія курсы. Нам пашчасціла: размеркавалі з улікам нашага шлюбу.

Мне было дваццаць шэсць. Ёй — дваццаць чатыры.

Мяне звалі Савіцкі Максім Леанідавіч.

Яе — Савіцкая (Самусевіч) Тацццяна Віктараўна.

Ішла восень тысяча дзевяцьсот трыццаць шостага…

## Жаўнер вызвольнай арміі

Станіслаў Міхайлавіч не спаў ужо колькі начэй. Не мог, не хацеў, баяўся. Апошнім часам ён баяўся кожнага грукату, кожнага шораху.

Яму было чаго баяцца. Ён баяўся свайго мінулага.

Страх быў з ім усе шэсцьдзесят сем гадоў, якія ён пражыў на свеце. Спачатку страх галоднай смерці, — царская эпоха была бязлітаснай да такіх, як ён. Потым, пасля гібелі ўсіх, дзеля каго ён яшчэ хацеў жыць, наступіў час ахвяравання сабой дзеля справы вольнай Беларусі. Асабісты ад'ютант генерала Езавітава, жаўнер у войску Станіслава Балаховіча, стралец Слуцкага збройнага чыну — менавіта ў такой паслядоўнасці ён пражыў пачатак дваццатых гадоў. Кожны новы кіраўнік лакальнай арміі ўзнікаў раптоўна і так жа раптоўна знікаў, збягаў за мяжу. Ён не мог збегчы.

Яго схаваў цёмны беларускі лес — яго і яшчэ трох верных сяброў. Дзе яны зараз, тыя сябры? Адзін Бог можа даць адказ. Можа, у іх атрымалася, як у яго, выйсці з лесу праз некалькі гадоў бессэнсоўнай барацьбы і пачаць новае жыццё пад новым прозвішчам?

Стары ўздыхнуў і з цяжкасцю падняўся на ногі. Гарбатнік пырскаў кіпенем ва ўсе бакі. Стары скрывіўся, узяў прыхватку і выцягнуў гарбатнік з печы. Наліў кіпень у кубак, закінуў туды ж травяны збор, накрыў талеркай. Травы ён збіраў сам — на гарбату ўсё роўна не было грошай.

У вакно гучна грукнуў камень. Стары настаражыўся. Не з-за сапраўднага страху, а так, дзеля парадку. Візіту афіцэра НКУС ён чакаў гадамі і прызвычаіўся жыць у чаканні гэтага. Стары армейскі рэвальвер узору 1898 года з шасцю баявымі патронамі, які ляжаў у шуфлядзе стала, таксама чакаў той сустрэчы. Чакаў, каб апошні раз гучна сказаць сваё слова.

Трывога была дарэмнай — камень у вакно быў кінуты суседскім хлапчуком. Стары ўздыхнуў. Рана ці позна гэткія жарты скончацца тым, што ягонае сэрца не вытрымае і спыніцца. Калі, канечне, раней яго не спыніць стрэл з нагана. Так ці йнакш, жыць яму засталося зусім нядоўга — зіму стары не перажыве, гэта ён адчуваў дакладна. Ён засядзеўся на свеце. Занадта шмат у яго ворагаў, каб гэтак шмат жыць.

Дзверы асцярожна скрыпнулі. У іх прасунуўся моцны хлопец у галіфэ.

Ён асцярожна азірнуўся па баках. Заўважыў Старога, які нібы спаў за сталом, паклаўшы твар на далоні. Хлопец кашлянуў. Стары не падняў галаву.

Хлопец зрабіў два крокі наперад і падкрэслена гучна шчоўкнуў абцасамі цяжкіх ботаў. Пасля гэтага гаркнуў камандным голасам:

— Станіслаў Міхайлавіч Шарэцкі!

Галава Старога варухнулася.

— Што?.. Хто тут?!

— Старшы лейтэнант Народнага камісарыята ўнутраных спраў Міхаіл Звягінцаў. Вы арыштаваныя. Папрашу сабраць рэчы і накіравацца са мной. Падрабязнасці будуць вам растлумачаны на месцы.

— Канечне, канечне... Скажыце толькі, ці ёсць у мяне дзве хвіліны, каб узяць самае неабходнае?

— Адна.

Рука Старога асцярожна пацягнулася ў шуфляду. Час прыйшоў. Час, якога Стары так доўга чакаў. Вось ён, канец.

Далонь легла на рукаятку рэвальвера. Стары хуткім рухам узвёў курок…

Рэзкі шчаўчок пачуў лейтэнант. Хутчэй дзякуючы рэфлексам, чым свядомай думкі, дасведчаная рука выхапіла пісталет з кабуры. У дзверы ўваліліся два НКУСаўцы з шараговых. Не было ніякіх падставаў сумнявацца, што страляць яны будуць без усялякага папярэджання.

— Хай жыве вольная Беларусь! — прагучаў раптоўны крык, і ў той жа момант ўзарваліся чатыры стрэлы.

— Вось жа сукін сын!

Стары ляжаў на падлозе. На ягоных грудзях ярка чырванелі тры ўваходныя адтуліны. Чацвёртая знаходзілася на правай скроні.

## Дзед Юрась

На выгляд яму было гадоў семдзесят, на самой жа справе праз месяц ён павінен быў сустрэць ужо дзявяты дзясятак. Дзед насіў доўгую — да грудзей — сівую бараду, а рукі яго, здавалася, мелі такую моцу, што лёгка маглі задушыць у абдымках ляснога мядзведзя. Стары асілак умеў спяваць песні, якіх ведаў вялізарную колькасць, за што яго вельмі любіў навакольны люд.

Дзед Юрась — а менавіта такое было ў яго імя — заўжды быў рады даць параду. Ён лічыў сябе апошняй інстанцыяй па ўсіх пытаннях.

— Здароў, дзеду! — азваўся я. — Як твае справы?

— Спіна клятая, баліць ды баліць, — паскардзіўся дзед. Зрабіў ён гэта, праўда, са сваёй фірмовай хітрай усмешкай на твары, з чаго можна было зрабіць высноў, што гэтым фактам ён падзяліўся з намі — мной і жонкай —таму, што проста хацелася паразмаўляць, зацягнуць на кубак травяной гарбаты. — Заходзьце да мяне, раскажыце хоць, якія навіны ў свеце...

Дзед пасадзіў нас на ложак, а сам пачаў збіраць на стол посуд і закуску. У мяне ўжо не засталося ніякіх сумневаў, што фінальным акордам на стале з'явіцца мутнаваты напой, якім дзед частаваў самых жаданых гасцей.

З-пад нагі дзеда раптам выскачыў агромісты рыжы кот.

— Не, ну вы толькі ўявіце, якая курва! — залаяў дзед. — Узяў яго два гады таму, маленечкім кацянём, думаў, будзе мне пацукоў лавіць, а ён… Узяў сабе звычку — падбірацца да маіх ног асцярожненька, а потым хваць зубамі! Гэта ён так весяліцца, значыць. У-у, халера скурвелая! — прыгразіў дзед кату кулаком.

— Слухай, дзеду, а дзе ты такой лаянцы навучыўся? — не вытрымаў я.

— Э-э-э, Максім, — стары зноўку ўсміхнуўся. — Я ж такі чалавек… Шмат усяго ўва мне намешана. Маці-та мая сапраўдная ўкраінка, малароска, як зараз бальшавікі завуць і як раней царскія начальнікі звалі. А вось бацька — натуральны паляк, нарадзіўся, значыцца, у польскай вёсцы Віскідкі, што пад Варшавай. Добры ён чалавек быў, бацька-та. Шмат чаго пра радзіму сваю мне распавядаў. І пра жыццё польскае і пра гісторыю іх. І пра касцёл у Віскідках, куды ён яшчэ байструком хадзіў кожную нядзелю. Усё бацька хацеў нас з маці да сябе забраць у Польшчу — мы тады пад Ільвовам жылі. Хацеў ён, значыцца, хацеў, ды ўзяў і памёр раптам… Ад яго я і навучыўся гэтай лаянцы. Татка-та заўжды, калі быў чымсьці дужа незадаволены, усё «курва» ды «скурвелы»...

— Дзеду Юрась, а калі ты ў Беларусь прыехаў?

— О, сынку, я сюды прыехаў у час першае рэвалюцыі ў Петраградзе, пяты год то быў... Галодна нам было на роднай Украіне, сынку, вельмі галодна. Дзякуй Пану Богу, абышлося, аселі тут, гаспадарку нейкую завялі... А потым аказалася, што тут ніяк не лепш, чым было там, на Украіне...

## Маёр Раманаў

У дзверы нечакана пастукалі. Даволі асцярожна, але з упэўненасцю. У клас ўвайшоў высокі чалавек у форме афіцэра НКУС. На выгляд яму было гадоў сорак, можа крыху нават меней. Блакітныя вочы агледзелі дзяцей, потым спыніліся на мне.

— Маёр Віктар Леанідавіч Раманаў, Камісарыят унутраных спраў, — прадставіўся ён і працягнуў руку. Я паціснуў яе і таксама назваў сябе. Маёр кіўнуў і, нібы пытаючыся дазволу, паказаў вачыма на месца за маім сталом.

— Так, канечне, прашу сядаць, — нельга казаць, каб я быў рады госцю з гэтага ведамства ў маёй школе, але ніякага жадання псаваць адносіны з Камісарыятам не меў.

Я падцягнуў да стала другі стул і сеў побач з афіцэрам. У класе стала ціха.

— Можа гарбаты? — асцярожна прапанаваў я.

— Дзякуй, не адмоўлюся, — дабрадушна пасміхнуўся афіцэр. Не магу сказаць чаму, але ягоныя паводзіны да сябе і мая насцярожанасць пакрысе пачала знікаць.

У школе стаяла буржуйка, каб дзеці не замерзлі ўзімку. На ёй жа я час ад часу заварваў гарбату — для сябе і дзяцей, калі было зусім халодна.

— Чым абавязаны?

— Ды як вам сказаць… Па сутнасці й нічым. Хаця не, ёсць у мяне невялічкая справа, але аб ёй потым. Наколькі ведаю, вы не так даўно тут?

—Крыху больш за паўгода.

— А што здарылася з папярэднім настаўнікам? Вы прабачце, што задаю шмат пытанняў — прафесія такая, — з нейкай вінаватай усмешкай апраўдаўся ён. — Не здзіўляйцеся, што не ведаю, я сам не так даўно на гэтай пасадзе, прыслалі са Смаленску...

— Ну што вы! — заўсміхаўся й я. — Хіба ж тут ёсць штосьці, што можна было б хаваць? Мой папярэднік проста па ўзросце ўжо не спраўляўся са сваімі абавязкамі. Яму далёка за семдзесят...

— Ах вось яно што... Дарэчы, мяне інфармавалі, што вы працуеце не адзін — разам з жонкай, так?

Я пацвердзіў.

— Гэта, канечне, добрае рашэнне, даслаць яшчэ аднаго настаўніка... Дзетак апошнія два гады стала куды больш у школку хадзіць, адзін бы вы дакладна не здолелі б за ўсімі даглядзець. Толькі дзе ж яна, жонка вашая?

— На жаль, захварэла. Сёння ёй было вельмі дрэнна, не магла нават з ложка паднясца...

— Вельмі непрыемна. Я пра здароў'е, канечне, а не пра тое, што яе няма… Скажыце, можа вам што патрэбна?

І я адважыўся на пытанне:

— Скажыце, а якая ў вас пасада?

— Хіба я не сказаў адразу? Я ўзначальваю мясцовы аддзел Камісарыяту. Але вернемся да маёй маленькай справы... Ёсць у мяне дачушка, Валя, дзевяць гадоў ёй. Мы тут толькі месяц, жонкі ў мяне няма, а сам я вельмі заняты... Не прымеце дачушку ў школку?

Мая напружанасць адразу знікла і я шчыра ўсміхнуўся.

— Канечне ж, прыводзьце вашую Валю, прымем яе. Заўтра зможаце прывесці?

# НЕ ХАЦЕЎ БЫЦЬ БОГАМ




— Сам не змагу, прашу зразумець — справы. Але хтосьці з маіх падначаленых яе прывядзе — сама яна дарогі не ведае…

Праз чатыры гадзіны я зачыніў дзверы школы і паціху пайшоў дадому. З галавы ніяк не ішоў візіт Раманава. На самой справе, мне няма ў чым было асабіста вінаваціць камісарыят, але я троху баяўся гэтай установы.

На вуліцы зусім сцямнела. Я асцярожна прабіраўся паміж лужынаў, якія пакрывалі ўсю шырыню дарогі. Пару разоў мне не пашанцавала, і я ўсё ж уступіў у халодную ваду. Натуральна, настрой мне гэта не падняло, але ходу я прыбавіў. Хацелася аднаго — дайсці дадому і ўрэшце сагрэцца ля гарачай печкі, паставіць сушыцца мокрыя боты і выпіць смачнай гарбаты.

Але больш за ўсё мне хацелася ўбачыць Таню і даведацца, як у яе са здароў'ем і як прайшоў для яе гэты дзень.

…Таня не спала. Я падышоў да ложка, нахіліўся, каб абняць яе.

— Толькі не надумай мяне цалаваць, не хапала толькі, каб абодва настаўнікі заўтра не прыйшлі да школы, — прашаптала яна. Аднак яе словы прайшлі паўз мяне, бо ўжо ў наступны момант я цалаваў яе вусны.

— Ну вось… ты ніколі не будзеш мяне слухацца, — з найгранай крыўдай сказала яна.

— Канечне не буду, таму што я цябе кахаю.

— Абдымі мяне, — папрасіла яна.

Я прылёг на ложак і абняў яе за плечы.

— Не хварэй, прашу, не хварэй! Мне было так цяжка вытрымаць гэты дзень без цябе!..

## Валя

За пяць хвілінаў да пачатку ўрока ў дзверы зайшлі высокі малады чалавек, апрануты ў вайсковае галіфэ, і дзяўчынка.

— Старшы лейтэнант дзяржбяспекі Звягінцаў, — прадставіўся ён. — Да вас учора заходзіў маёр Раманаў…

— Так, так, вітаю, — я падняўся. — А гэта, напэўна, Валя, так?

— Дакладна, — кіўнуў галавой лейтэнант. — Наколькі разумею, вам трэба атрымаць дакументы?

— Так, вядома. Але гэта зойме нямат часу.

Я запісаў дадзеныя дачкі маёра ў ведамасць.

— Раманава Валянціна Віктараўна, 1928 года нараджэння, першы клас скончыла ў Смаленску. Я нічога не наблытаў?

— Не. Усё дакладна.

— Выдатна. У такім выпадку, я больш не буду вас затрымліваць.

— Калі мне зайсці па Валю? — запытаўся лейтэнант.

— Можаце забраць яе а палове на трэцяю.

— Дзякую, — ён каротка казырнуў і хуткім крокам выйшаў з памяшкання.

* * *

Я спаў неспакойна. Мне снілася маленькая Валя, потым маёр Раманаў, потым Звягінцаў, які чамусьці ўсё хацеў злавіць мяне і ўдарыць цяжкім ялавым ботам. Я бег, бег, бег ад яго, спатыкаўся, падхопліваўся і зноўку бег. Звягінцаў усё набліжаўся, і мне ўжо падавалася, што я не ўцяку. Нарэшце я зноўку ўпаў, і лейтэнант аказаўся побач. На ягоным твары гуляла д'ябальская ўсмешка…

— …Камісарыят унутраных справаў! Адчыніце дзверы!

Я не адразу зразумеў, што адбываецца. Стукалі адначасова і ў вокны і ў дзверы. З вуліцы даносіўся брэх сабак і хуткі тупат ног. Мяркуючы па гуках, чэкісты ламіліся не толькі да нас: грукат нёсся і ад суседніх дамоў.

— Адчыніце дзверы!

Я падхапіўся, раптам адчуўшы, што ў мяне мокрая ад поту спіна.

Таня таксама прачнулася і глядзела на мяне спалоханымі вачыма.

Я падбег да дзвярэй і адкрыў замок. За дзвярыма стаялі два сяржанты.

— Ваша імя і прозвішча!

— Савіцкі Максім Леанідавіч. Што…

— Вы жывеце адзін?

— З жонкай. Ды што ўрэшце…

— Паклічце жонку.

— Не трэба нікога клікаць, я тут, — Таня выйшла з-за маёй спіны.

— Скажыце, калі ласка, ваша імя і прозвішча.

— Савіцкая Таццяна Віктараўна.

— Акрамя вас у хаце нікога няма?

— Вядома, не! Слухайце… — я пачаў злавацца.

— Правер, — старэйшы з іх кіўнуў дрогому, з сабакам.

— Ды што вы сабе…

— Максім Леанідавіч і Таццяна Віктараўна, у раёне вашай вёскі збег вельмі небяспечны злачынец, які этапаваўся канвоем разам з іншымі ворагамі. Мы правяраем усе хаты ў вёсцы…

Да раніцы я ўжо так і не заснуў.

## Нашы часы, Інстытут Гісторыі

Вацлаў Міхайлавіч Міраноўскі прыгладзіў адной рукой напаўсівыя валасы. Археолагу ішоў пяцьдзесят шосты год. Менавіта ён і кіраваў тымі раскопкамі, падчас якіх і былі знойдзеныя пахаванні расстраляных. Незвычайныя знаходкі ён дэманстраваў свайму вучню — аспіранту Акадэміі, дваццацітрохгадоваму хлопцу, які стаяў побач з ім і з вялікай цікавасцю разглядаў прадметы, выцягнутыя ягоным настаўнікам з пластыкавых пакетаў.

— Вось паглядзі сюды. Партсігар алюмініевы, цікавая знаходка. Большасць ахвяраў яўна паходзіла з простых людзей…

— Вацлаў Міхайлавіч, — аспірант адважыўся на пытанне. — А колькі чалавек было ў раскапанай яме?

— Калі падлічыць усе фрагменты костак, атрымліваецца, што не менш сарака пяці.

— А колькі выяўлена магільняў?

— Ах, вось ты да чаго… Мы налічылі дзвесце трынаццаць.

— То бок, калі ўзяць за сярэднюю колькасць сорак пяць, атрымліваецца каля… — аспірант моўчкі шавяліў вуснамі, падлічваючы пра сябе. — …дзесяці тысячаў чалавек!!!

— Я лічу, што ўсё ж такі менш. Па-першае, гэта даволі вялікая яма. Ну а па-другое… Мы не можам быць упэўненымі, што ва ўсіх ямах ёсць пахаванні. Пэўная частка з іх можа быць пустымі. Але на гэтым палігоне, мяркую, ляжыць не менш за сем-восем тысячаў чалавек.

— Сем тысячаў… А колькі можа быць такіх месцаў?..

— Ніхто не скажа табе цяпер, колькі. Адно магу сказаць — шмат.

На століку ля вакна раптам зайшоўся заліўістым перакатам тэлефон. Вацлаў Міхайлавіч цяжка падняўся з-за стала і падышоў.

— Слухаю.

— Вацлаў Міхайлавіч Міраноўскі?

— Так.

— Вацлаў Міхайлавіч, вам лепей згарнуць вашыя даследаванні адносна масавых пахаванняў, якімі вы займаецеся ад мінулага тыдня, і перадаць справу вайсковай пракуратуры.

— З кім я размаўляю? Назавіцеся.

— Вацлаў Міхайлавіч, гэта вельмі настойлівая парада. Даследаванні могуць быць вельмі непажаданымі, а іх вынікі даволі небяспечнымі. Пакуль гэта толькі парада.

— Назавіце сябе!

— Маёр Камітэта дзяржбяспекі Міхалевіч.

— Маёр Міхалевіч, прашу выслухаць мяне. Ніякіх даследаванняў я згортваць не збіраюся, тым больш не збіраюся нікому перадаваць справу. Хай вайсковая пракуратура займаецца сваімі справамі, я, як дзяржаўны эксперт, буду займацца сваімі. Нагадаю вам, што па факце масавых пахаванняў невядомага паходжання ўзбуджана крымінальная справа, і займацца ёй — гэта мой абавязак як эксперта-археолага і проста як навукоўца. Дзякуй вам за клопат, але ён абсалютна недарэчны…

## Пачатак

Гэта пачалося яшчэ ўвосень. Аднекуль з гораду праз нашую вёску пачалі гойсаць вялікія чорныя машыны з крытым кузавам. Пакрысе яны прабілі праз снег і прамерзлую глебу глыбокія каляіны — аж да самага лесу.

А на пачатку снежня ў лесе пачалося будаўніцтва. Побач з чорнымі крытымі грузавікамі з'явіліся грузавікі з адкрытымі бартамі, на якіх везлі ў лес апрацаваныя дошкі і будаўнічы матэрыял. За два тыдні трохметровы плот абкружыў лес на пяць кіламетраў углыб. На ўездзе ў лес была збітая агромістая брама. Штодзень і штоноч каля яе неслі варту два шарагоўцы НКУС…

Заняткі скончыліся дваццаць хвілінаў таму. Я пакрысе збіраў свае рэчы, перыядычна адказваючы на дзіцячыя словы развітання.

Ля задніх сталоў стаялі і аб чымсьці шапталіся Ясік з Валяй. На дзіва, дзеці пасябравалі, я часта заўважаў, як яны разам сыходзілі са школы, калі за Валяй не заходзіў маёр альбо Звягінцаў. Больш сяброў ні ў хлопчыка, ні ў маёравай дачкі ў класе не было, верагодна гэта таксама адыграла сваю ролю.

— А вы чаму не сыходзіце дадому? — ветліва запытаўся я.

Яны асцярожна наблізілася да мяне.

— Максім Леанідавіч… мы…

— Мы б хацелі…

— Калі ласка, я вас слухаю. У вас штосьці здарылася?

— Максім Леанідавіч… мы наконт той высокай брамы ў лесе.

— Та-а-ак… — жэстам я загадаў ім сесці за стол перада мной, сам пайшоў і зачыніў дзверы ў класны пакой. — Вы хадзілі да брамы?

— Так, мы хадзілі. Мы… — Голас Валі дрыжаў і зрываўся, было добра бачна, што яна вельмі хвалявалася і ледзьве стрымлівалася ад таго, каб не заплакаць.

Размову працягнуў Ясік.

— Максім Леанідавіч, толькі не лайцеся на нас! Мы… нам няма чаго было рабіць, і мае, і Валіны бацькі затрымліваюцца на працы ажно да ночы, вось мы і бадзяемся разам… Прыкладна ў кіламетры ад брамы мы знайшлі лаз… Мы пралезлі і выйшлі да вялікай прагаліны. Там было шмат людзей у форме. Яны размаўлялі паміж сабой, палілі цыгарэты. Частка з іх збірала нейкія рэчы. А за імі вялікі бульдозер раўняў чамусьці раскапаную яму — яна была ўжо засыпаная. Але галоўнае не гэта. Галоўнае, што…

— Гэтая яма дыхала! — Валя ледзьве не закрычала, і па яе шчоках нарэшце пацяклі слёзы.

— Цішэй, калі ласка!

— Максім Леанідавіч, яма насамрэч дыхала. Альбо дыхала ТОЕ, ШТО БЫЛО Ў ЁЙ.

— Так… што было далей?

— Далей? Нічога. Мы асцярожненька пайшлі — амаль што папаўзлі — да нашага лазу.

Я памаўчаў хвіліну, збіраючыся з думкамі.

— Каму вы яшчэ распавядалі пра гэта?

— Нікому, — Ясік катэгарычна паматаў галавой.

— А ты, Валя.

— Я… таксама…

— Гэта добра. Слухайце мяне. Нікому, чуеце, нікому больш не гаварыце пра тое, што былі за плотам і што бачылі. Нават сваім бацькам. Вам зразумела?

## Палігон

Я збіраўся нядоўга. На маё шчасце, Тані дома не было — яна выправілася ў госці да дзеда Юрася. Гэта вызваліла мяне ад непрыемных тлумачэнняў. Прынамсі, гэтых тлумачэнняў я не змог бы даць і самому сабе.

А сапраўды, навошта мне гэта трэба?

Адказу ў мяне не было. Я ведаў толькі тое, што спакою мне дзіцячы аповед не дасць, пакуль я сам не ўбачу ўсё сваімі вачыма і не разбяруся, у чым жа там справа. Між тым, я цудоўна разумеў, што калі не рашуся на гэта сёння, наўрад ці ўжо калісьці ў мяне хопіць мужнасці для гэткай разведкі.

Я апрануў цёплы кажух, хоць на вуліцы было не асабліва халодна, і нацягнуў высокія боты. У кішэню сунуў пачак запалак на ўсякі выпадак. Потым падумаў і паклаў туды ж невялікі нож у скураным чахле…

**Заканчэнне — у наступным нумары «Ь». Друкуецца ў невялікім рэдакцыйным скароце**

## КНІГАЗБОР

**Асоба і час. Беларускі біяграфічны альманах. Выпуск 2. Уклад. Аляксандр Фядута. — Мінск: Лімарыус, 2010. — 392 с.**




Чарговы нумар Беларускага бібліяграфічнага альманаха «Асоба і час» багаты на гучныя імёны. Матэрыялы выпуску прысвечаныя Васілю Быкаву, Уладзіміру Караткевічу, Максіму Лужаніну, архітэктару Івану Жалтоўскаму, вучоным Адаму Багдановічу, Яўгену Вярбіцкаму, Івану Замоціну, Аляксандру Еўлахаву, генералу Кіпрыяну Кандратовічу, філамату Вінцэнту Будрэвічу. Сярод аўтараў тэкстаў — Аляксандр Фядута, Сяргей Харэўскі, Адам Глобус, Якаў Басін, Іван Саверчанка, Андрэй Расінскі... а таксама дзіцячы ўрач з Мінска Мінна Лапідус і гарадзенская журналістка Фрыда Пугач.

**Акудовіч Валянцін. Архіпелаг Беларусь. — Мінск: Логвінаў, 2010. — 220 с.**




У новай кнізе літаратара і філосафа чытач знойдзе дыялогі, фрагменты гутарак, дыскусій ды палемік, у якіх аўтар браў удзел цягам апошніх пятнаццаці гадоў. Значная частка іх прагучала на хвалях Радыё Свабода.

Тэксты, што ўвайшлі ў кніжку, узятыя з газетаў і часопісаў. Гэта не цалкам тэксты, інтэрв'ю, гутаркі ды дыялогі, а выцінанкі з іх, згрупаваныя паводле прынцыпу цэласнасці тэмы. І такі прынцып прымусіў аўтара падзяліць кніжку на 6 раздзелаў, у якіх тэксты па беларускай гісторыі, літаратуры, філасофіі.

Адзін з самых цікавых раздзелаў прысвечаны палітыцы. Хоць усё тое, што не вытрымала часу, так званая штодзённая журналістыка, у кніжку не ўвайшло. Акудовіч прызнаўся, што палітыку не любіць: «Усе палітыкі — гэта курдупелі, якіх цудоўная фея падае як прыгажуноў». І гэтай тэме прысвечаны невялікі тэкст, які так і называецца: «Пастамент для курдупеля»...

**Беларус 2010. Літаратурны альманах беларускіх пісьменнікаў замежжа. — Нью Ёрк: Выдавецтва газеты «Беларус», 2010. — 282 с.**




Чацвёрты нумар выдання, заснаванага ў 2007 годзе, парадуе сваіх чытачоў не толькі сталай перыядычнасцю і павелічэннем колькасці аўтараў, але і якасцю надрукаваных твораў. Сярод аўтараў часопіса — Аляксей Арцёмаў, Аляксандр Баршчэўскі, Ірына Варабей, Віталь Воранаў, Янка Запруднік, Віялета Кавалёва, Якуб Лапатка, Цімох Ліякумовіч, Алег Мінкін, Сяржук Сокалаў-Воюш, Аляксандр Тарановіч, Макс Шчур і іншыя.

Вітаўт Кіпель у прадмове да альманаха асаблівую значнасць надае таму, што ён выходзіць на «клясычным правапісе»: «Я, як і шмат маіх сяброў — рэаліст. Наркамаўка сёньня пераважае. Гэта — дзяржава, школа, набытыя навыкі. Аднак ніяк нельга сьпісваць клясычны правапіс у расход. У выніку ён будзе, павінен, дамінаваць у нацыянальнай дзяржаве».

**Вонэгут Курт. «Бойня № 5, або Крыжовы паход дзетак»: раман. Пер. з анг. Павел Касцюкевіч. — Мінск: Логвінаў, 2010. — 220 с. — (Бібліятэка Бацькаўшчыны. Пераклады. Кніга I)**




Новая выдавецкая серыя «Пераклады» распачалася раманам Курта Вонэгута «Бойня №5, або Крыжовы паход дзетак». Цяжка паверыць, што гэты сусветна вядомы твор дагэтуль не гучаў па-беларуску і столькі гадоў чакаў свайго перакладчыка... І добра, што так сталася, бо інакш мы не мелі б такой цудоўнай пасламовы ад перакладніка Паўла Касцюкевіча, якая сама па сабе твор мастацтва...

**Геніюш Ларыса. Збор твораў. У 2 т. Кн. 1. Уклад. М. Скобла. — Мінск: Лімарыус, 2010. — («Галасы Айчыны»).**




Першы том аднаго з першых збораў твораў Ларысы Геніюш складаюць паэтычныя тэксты пісьменніцы, у тым ліку 72 вершы, якія публікуюцца ўпершыню. У кнізе змешчана шмат невядомых здымкаў — ад студыйнага партрэта, зробленага ў 1939 годзе ў Празе, да здымку ўе лагернай кашулі з нашытым на спіне арыштанцкім нумарам... У другім томе друкуецца проза: дакументальная аповесць «Споведзь» і лісты Ларысы Антонаўны — да Васіля Быкава, Максіма Танка, Рыгора Барадуліна, Зоські Верас, Дануты Бічэль, да тагачаснага амбасадара ЗША ў Чэхіі Лорэнса Стайнгарда. Большасць лістоў друкуецца ўпершыню.

**Кавалёў Сяргей. Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу: манаграфія. — Мінск: Кнігазбор, 2010. — 376 с.**




Літаратуру Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу ад пачатку XVI да пачатку XVII ст. «літоўскія даследчыкі разглядаюць як інтэгральную частку літоўскай літаратуры, украінскія — як частку літаратуры ўкраінскай, а польскія — як частку літаратуры польскай», — піша Сяргей Кавалёў ва ўводзінах. Заканамернае пытанне: а ці не ёсць шматмоўная паэзія ВКЛ здабыткам і беларускай культуры? Так, даўно час адмовіцца ад састарэлай канцэпцыі, што старадаўняя беларуская літаратура — гэта толькі тэксты на старабеларускай і царкоўнаславянскай мовах. Бо тады з нашай спадчыны выпадалі лаціна і польскамоўныя творы Сымона Буднага, Андрэя Рымшы, Каятана Марашэўскага, Саламона Рысінскага, Міхала Карыцкага, не кажучы ўжо пра Міколу Гусоўскага, Яна Вісліцкага... Сваю кнігу даследчык прысвяціў светлай памяці прафесара і паэта Алега Лойкі.

**Майсеенка Анатоль. Роздум: вершы, паэмы, прысвячэнні; Прадм. А. Ліс. — Мінск: А. М. Вараксін, 2010. — 264 с.**




Вучоны, філолаг, аўтар літаратуразнаўчых кніг, выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры Анатоль Майсеенка (1940-2009) быў вядомы яшчэ і як таленавіты паэт-лірык, які лепшыя старонкі сваёй творчасці прысвяціў тэме Радзімы — Беларусі. Сведчанне таму і кніга, выхаду якой ён не дачакаўся... «Адбалела душа, адбалела, // Адляцела ад цела душа....» Але засталіся дзясяткі ўдзячных вучняў, якія будуць памятаць і згадваць свайго Настаўніка...

**Папковіч Уладзімір. Рэшта: вершы. — Мінск: Медысонт, 2010. — 64 с.**




Гэтая сціплая кніжачка з сімвалічнай назвай «Рэшта» пры чытанні ператвараецца ў Вялікую кнігу жыцця. 75-гадоваму паэту і перакладчыку Уладзіміру Папковічу ёсць што сказаць на развітанне людзям і сабе. Чаму на развітанне? Такім тужлівым настроем прасякнутая ўся кніга. Сэнс жыцця, сцежкі быцця, якія мы выбіраем (ці яны нас?), пакутная Радзіма, змест паэзіі і творчасці ўвогуле — пытанні, якія так і застануцца без адказаў, колькі б мы ні шукалі іх... А ратуе нас толькі іронія і ўменне пасмяяцца з самых сябе: «Стаўся да сябе так, як ставішся да іншых. Жудасна будзе тады застацца сам-насам з сабой»... Менавіта таму сатырычным раздзелам «Расслабцеся» і заканчвае свой зборнік аўтар.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 22 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.50, 18.00, 19.00, 00.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.35** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.25** Відэафільм АТН «Дуброўна-таямніцы сівога Дняпра» цыклу «Зямля беларуская».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Меладрама «Жаночыя слёзы».
**14.05** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Дакументальны цыкл «Зброя будучыні» (Вялікабрытанія).
**16.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН «Белы канцэрт» у сямі нотах».
**22.10** «White Concert».
**00.15** «Эпоха».
**00.45** Дакументальны цыкл «Зброя будучыні» (Вялікабрытанія).
**01.30** Дакументальны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**02.20** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Браты-дэтэктывы». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі» у Беларусі». Восеньская серыя гульняў.
**22.35** Драма «Штучная хлусня».
**00.20** «Наша Белараша».
**00.50** Драма «Калі апошні раз бачыў свайго бацьку?».
**02.30** Начныя навіны.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Меч».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2».
**15.30** Прэм'ера! «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна»: «Таемныя знакі лёсу».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Ля парадната пад'езду».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! Ток-шоў «Лёс».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Уцёкі». Францыя, 1978 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Вока». ЗША, 2008 г.
**01.50** «Сакрэтныя матэрыялы».

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.10** Меладрама «Сяброўка Восень» («Беларусьфільм»). 3-я і 4-я заключная, серыі.
**11.55** Час футболу.
**12.25** Кінаспробы.
**12.45** Жывы гук.
**13.25** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.25** Прэм'ера. Дакументальны фільм «2014. Мінск. Напярэдадні».
**14.55** Мультсерыял «Драконьчык і яго сябры» (Канада).
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.15** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**17.20** Усё аб бяспецы.
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Поўначсталь (Чарапавец)-Дынама (Мінск) У перапынку: «Калыханка».
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.15** «Пра мастацтва».
**23.45** Дыялогі аб рыбалцы.
**00.15** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**01.10** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Дворык».
**12.05** Тэлесерыял «Сэрца маці».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.20** Прэм'ера. «Дзяўчаты».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Фільм «Цячэ рака Волга». 2009 г.

**НТВ**

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Мама ў вялікім горадзе».
**09.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Бітва за Поўнач».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Містычная меладрама «Лабірынты хлусні-2».
**15.10** «Асабліва небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Дэн». Вострасюжэтны фільм.
**22.55** «Нтвшнікі».
**00.05** Трылер «Драпежныя воды».

**EUROSPORT**

**09.30** Часопіс «Еўраспорт» за чыстую планету».
**09.35** Летні біятлон. Чэмпіянат свету ў Польшчы (Летохрад).
**10.30** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). 1/8 фіналу.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**15.55** Часопіс «Еўраспорт» за чыстую планету».
**16.00** Часопіс «Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая».
**17.00** Летні біятлон. Чэмпіянат свету ў Польшчы (Летохрад).
**17.55** Часопіс «Еўраспорт» за чыстую планету».
**18.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Самыя моцныя людзі планеты..
**21.00** Бокс. Турнір Bigger's Better (Кіпр, Нікасія).
**23.00** Покер. Турнір Партуш (Францыя, Каны).
**00.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый у Нарвегіі.
**01.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**01.15** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). 1/4 фіналу.
**02.25** Часопіс «Еўраспорт» за чыстую планету».

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Асабісты капітал.
**08.05** Рэпартэр.
**08.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Сакрум», дак. фільм, 2007 г., Расія–Польшча.
**09.05** Басаножам па свеце (спазнаваўчая праграма): «Новая Гвінея, 1969», ч. 2.
**09.30** Хто ёсць кім?: «Інтымны працэс», рэпартаж, 2008 г., Беларусь.
**09.50** «Зорны пірат», тэлесерыял: 2 серыя.
**10.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 3 серыя.
**11.00** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Згаі», серыял: 11 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 3 серыя.
**18.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пагоня за праўдаю», дак. фільм, 2002 г., Польшча.
**19.05** Маю права (праваавая праграма).
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Жалезныя лэдзі Ліберыі», 2007 г., ЗША.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Катынь. Праз 70 год», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**22.10** «Герой года», маст. фільм, 1986 г., Польшча.
**23.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Забаўка».
**23.10** Аб'ектыў.

## 23 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

**06.50** Дакументальны фільм «Матухны» (Беларускае тэлебачанне).
**07.15** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.40** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.10** «Аўташкола».
**10.55** Дакументальны цыкл «Невядомая версія (Украіна).
**12.10** Камедыя «Гараж» (СССР).
**14.10** Відэафільм АТН «Больш, чым гульня».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная перадача.
**16.45** Nota Bene.
**17.10** Дакументальны серыял «Гараджане»: Утрэхт» (Галандыя).
**17.40** Відэафільм АТН «Лезна. Гарадок як на карцінцы» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Новая хваля». Канцэртная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.50** Дэтэктыўная меладрама «Чорная архідэя» (ЗША-Германія).
**00.05** «Эпоха».
**00.30** Дзень спорту.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**11.55** «Без страху і папроку».
**12.25** «Дзяржаўная мяжа. Мірнае лета 21-га года». Мастацкі фільм.
**15.00** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Хвіліна славы». Працяг.
**17.20** «Тур дэ Франс».
**18.15** «Адзін супраць усіх».
**19.15** «Цудоўная пяцёрка-5».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** «Дэтэктар хлусні».
**23.15** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.55** «Што? Дзе? Калі?».
**01.05** Дэтэктыў «Чорнывэлюм».

**06.45** Фільм «Незвычайныя прыгоды Карыка і Валі». СССР, 1987 г. 1-я серыя.
**07.50** Фільм «Уцёкі». Францыя, 1978 г.
**09.35** Прэм'ера! «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУра!».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.50** Фільм «Мама выйшла замуж». СССР.
**15.25** «Дарагая перадача».
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Смерць па завяшчанні». Расія, 2006 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Прэм'ера! Фільм «9 рота». Расія-Фінляндыя-Украіна, 2005 г.
**00.05** Прэм'ера! Фільм «Дарога». ЗША, 2009 г.
**02.00** «Сакрэтныя матэрыялы».

**07.10** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.35** Усё аб бяспецы.
**08.00** Нашы тэсты.
**08.35** «Рэальны свет».
**09.10** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.45** Жансавет.
**10.30** Тэлебарометр.
**10.35** Вострасюжэтны серыял «Яшчэ адзін шанец» (Расія). 1-я - 4-я заключная, серыі.
**13.55** «Запал па культуры».
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Тотэнхем - Эвертан. Прамая трансляцыя.
**16.50** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**17.45** Крымінальная камедыя «Кароль камедыі» (ЗША).
**19.50** Бенефіс. Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**23.20** Жывы гук.
**00.05** Дэтэктыўны трылер «Дашчэнту» (ЗША).

**РОССИЯ**

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** Фільм «Хто паедзе ў Трускавец».
**08.30** Прэм'ера. «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Цячэ рака Волга». 2009 г.
**13.40** «Нататкі натураліста».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Уся Расія».
**14.30** Прэм'ера. «Жыве такі барын».
**16.10** Фільм «Станцыйны наглядчык».
**17.30** «Пакой смеху».
**18.05** «Суботні вечар».
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Фільм «Сашка, каханне маё». 2007 г.
**00.00** Фільм «Родная кроў».

**НТВ**

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны пядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.10** Эксцэнтрычная камедыя «Таткі».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Руская сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15** Прэм'ера. «Музычны рынг НТБ».
**01.00** Драма «Усе дзеці Бога могуць танчыць».

**EUROSPORT**

**09.30** Вось дык так!!!
**09.40** Часопіс «Еўраспорт» за чыстую планету».
**09.45** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**10.00** Часопіс «Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая».
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Зольдэн). Слалам-гігант. Жанчыны. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**15.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Зольдэн). Слалам-гігант. Жанчыны. 2-я спроба.
**16.45** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры ў Чэхіі (Ліберац). HS 140.
**17.45** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры ў Германіі (Клігенталь). HS 140.
**18.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Зольдэн). Слалам-гігант. Жанчыны. 2-я спроба.
**19.45** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). 1/2 фіналу.
**21.00** Спідвэй. Гран-пры (Кралявец, Харватыя).
**22.00** Спідвэй. Гран-пры (Капенгаген, Данія).
**23.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Турнір Klash (Германія).
**02.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Зольдэн). Слалам-гігант. Жанчыны. 2-я спроба.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Невядомая Беларусь: «Катынь. 70 год пасля», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**08.35** Маю права (праваавая праграма).
**08.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пагоня за праўдаю», дак. фільм, 2002 г., Польшча.
**09.50** «Чароўнае дрэва», серыял.
**10.15** Калыханка для самых маленькіх.
**11.10** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Жалезныя лэдзі Ліберыі», 2007 г, ЗША.
**12.05** «Герой года», маст. фільм, 1986 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.05** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Малая Міс Цыганія», дак. фільм, 2009 г., Харватыя.
**18.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Альгерд».
**18.55** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.10** Вагон.
**20.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.30** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Заткніся і забі мяне», маст. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія–Чэхія.
**22.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Места».
**22.50** Аб'ектыў.

## 24 КАСТРЫЧНІКА, НАДЗЕЛЯ

### 1

**07.55** Дзень спорту.
**08.05** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША - Вялікабрытанія).
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Альманах вандраванняў».
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** Культурныя людзі.
**11.20** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**12.10** Лірычная драма «Восеньскі марафон» (СССР).
**13.55** Хранікальна-дакументальны фільм цыклу «У інтэрасах нацыянальнай бяспекі».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне- 2010».
**16.00** Сямейная камедыя «Ведаць бы, што я геній» (ЗША).
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.00** Рамантычная камедыя «М + Ж» (Расія).
**00.30** «Эпоха».

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.25** «Шчасце ёсць!».
**13.15** Уся праўда аб ежы.
**14.15** Тэлечасопіс «Звяз».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся».
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.45** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: шоў «Кухня».
**21.40** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя». Працяг.
**23.30** «Yesterday life».
**00.10** Камедыя «Перамотка».

### СТВ

**06.45** Фільм «9 рота». Расія-Фінляндыя-Украіна, 2005 г.
**09.00** Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: «Кажа і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Дзікі сабака дзінга». СССР.
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: ФК «Мінск»-«Дынама» (Мінск). Прамая трансляцыя.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Алекс і Эма». ЗША, 2003 г.
**22.30** СТБ прадстаўляе: Жывы канцэрт БІ-2.
**23.35** Фільм «Такешыз». Японія, 2005 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы».

### ЛАД

**06.40** Дабравест.
**07.10** Мір вашай хаце.
**07.20** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.40** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**09.55** Медычныя таямніцы.
**10.30** Школа рамонту.
**11.45** Тэлебарометр.
**11.50** Бухта капітанаў.
**12.30** «Правы чалавека».
**12.45** Гаспадар.
**13.15** Кінаспробы.
**13.35** Дак. фільм «Тыдзень моды ў Беларусі (Belorussian Fashion Week)» (БТ).
**14.05** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША).
**15.55** Хакей. КХЛ. Лакаматыў (Яраслаўль) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**18.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Сіці-Арсенал.
**20.10** Смешная часіна.
**20.50** Тэлебарометр.
**21.10** Джэймс Бонд - Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**23.30** Культсвет.

### РОССИЯ

**07.00** «Звычайны канцэрт».
**07.50** Фільм «Сашка, каханне маё». 2007 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Дэтэктыў «Малінавае віно».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** Фільм «Родная кроў».
**16.30** Фільм «Заўтра была вайна».
**18.15** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** «Адмысловы карэспандэнт».
**21.35** Фільм «Карусель». 2010 г.
**23.30** Фільм «Прысуд». 2008 г.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Бітва за Поўнач.
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Праспявана ў СССР».
**14.25** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Развод па-руску».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм'ера. «Марскія д' яблы. Лёсы».
**23.55** «Асабліва небяспечны!».
**00.35** «Футбольная ноч».
**01.05** «Нерэальная палітыка».

### EUROSPORT

**09.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Зольдэн). Слалам-гігант. Жанчыны. 1-я спроба.
**10.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Зольдэн). Слалам-гігант. Жанчыны. 2-я спроба.
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Зольдэн). Слалам-гігант. Мужчыны. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). Фінал. Прамая трансляцыя.
**14.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Зольдэн). Слалам-гігант. Мужчыны. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.00** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры ў Чэхіі (Ліберац). HS 140.
**16.00** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры ў Германіі (Клігенталь). HS 140.
**17.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Зольдэн). Слалам-гігант. Мужчыны. 2-я спроба.
**18.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Жанчыны. Фінал.
**19.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). Жанчыны. Фінал.
**20.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк). Жанчыны. Фінал.
**21.00** Спідвэй. Гран-пры (Італія).
**22.00** Спідвэй. Гран-пры (Польшча, Быдгашч).
**23.00** Матаспорт па выходных.
**23.15** Бокс. Міжнародны турнір у ЗША (Маямі).
**00.55** Матаспорт па выходных.
**01.00** Тэніс. Турнір WTA у Расіі (Масква). Фінал.
**02.15** Матаспорт па выходных.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**08.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Альгерд».
**08.15** Вагон.
**08.25** Навігатар.
**08.50** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Малая Міс Цыганія», дак. фільм, 2009 г., Харватыя.
**09.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.40** Калыханка для самых маленькіх.
**10.10** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**11.10** «Заткнісе і забі мяне», маст. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія–Чэхія.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**17.40** «Малая Масква», тэлесерыял.
**18.30** Дакументальная гадзіна: «Генацыд армянаў», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Гарадзельская унія».
**19.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Манголія, 1958».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак Шампані».
**22.00** Фільматэка майстроў: «Падарожжа ў прэрыі», маст. фільм, 2006 г., ЗША.
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Секцыі».
**23.55** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Будзьце ўважлівымі: змяніліся нашы рэквізіты ў банку і адрас рэдакцыі. Рахунак: 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**
**Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ____
Всего ____

Кассир

## Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# НОВЫ АРЛЕАН: ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ КАТАСТРОФ

29 жніўня мінула 5 гадоў пасля найбуйнейшага ў гісторыі ЗША ўрагану «Катрына», які пранёсся над Мексіканскім залівам і ўдарарыў па ўзбярэжжы штатаў Флорыда і Луізіяна. Толькі ў Новым Арлеане, сталіцы Луізіяны, 20% бяднейшага насельніцтва якога (а разам з прыгарадамі гэта больш як 250 тысяч чалавек) не здолела своечасова пакінуць горад, колькасць ахвяраў склала 1836 чалавек, эканамічныя страты — каля 81 мільярдаў долараў. Насельніцтва цэнтральнай часткі горада скарацілася з 484 тысяч у 2000 годзе да 311 тысяч у 2008-м.

І тут новая бяда — 20 красавіка 2010 года на нафтавай платформе BP (British Petroleum) Deepwater Horizon у Мексіканскім заліве ў 80 кіламетрах ад узбярэжжа Луізіяны адбыўся выбух. У выніку ў воды заліва за некалькі месяцаў вылілася ад 4,1 да 4,9 мільёна барэляў нафты — найбольшая колькасць за ўсю гісторыю падобных аварый. Загінула 11 са 126 нафтавікоў на вышцы. 22 красавіка платформа затанула.

Толькі 19 верасня сусветныя СМІ паведамілі: уцечка нафты з аварыйнай свідравіны канчаткова спынена. Выдаткі кампаніі на працэдуру ачысткі наваколля склалі 8 мільярдаў долараў, на кампенсацыі пацярпелым зарэзервавана 20 мільярдаў, агульныя выдаткі, праўдападобна, дасягнуць 32 мільярдаў. Прэзідэнт ЗША Барак Абама заявіў, што ўрад краіны прыкладзе ўсе намаганні, каб ліквідаваць наступствы ўцечкі нафты: «Гэты шлях будзе няпросты, але мы працягнем шчыльна супрацоўнічаць з людзьмі, што жывуць на ўзбярэжжы, каб аднавіць іх крыніцы існавання, а таксама навакольнае асяроддзе».

Пра наступствы тых катастроф я папрасіў расказаць іх відавочца, сталага жыхара Новага Арлеана, Джона Экснішаса, які апошнія 15 гадоў працаваў ва ўрадзе штата Луізіяна. Перад тым ён некалькі разоў бываў на Беларусі, у першыя гады нашай незалежнасці праводзіў у рамках дзейнасці фонда The Krieble Institute семінары для бізнесоўцаў («Як напісаць бізнес-план з заходнім партнёрам») і палітычных актывістаў. Памятаецца, з якім жахам перад выбарамі ў 1994 годзе на двухдзённых занятках у Магілёве Джон спрабаваў пераканаць аслепленых харызмай Лукашэнкі дэмакратаў, што перад імі — трывіяльны папуліст, ад якога краіна яшчэ нацерпіцца. Як у ваду глядзеў. Прапаную яго каментар па трагічных падзеях на ўласнай радзіме.

**Аляксей Хадыка**

***— Як аварыя на нафтавай платформе паўплывала на Новы Арлеан?***

— Паколькі Новы Арлеан не выходзіць непасрэдна да заліву, экалагічна ён не пацярпеў. Шкода нанесена навакольным балотам і ліманам, але яна меншая, чым чакалася ў выніку такога вялікага выкіду нафты. Шмат нафты прыбралі непасрэдна ў моры, а выкарыстанне дысперсантаў забяспечыла выпарэнне і распад нафты. Большасць, якую немагчыма палічыць, знікла: тое, што трапіла на ўзбярэжжа, прыбралі, нешта засталося ў багністых берагах.

На думку эколагаў, асноўная маса нафты пакуль застаецца ў заліве, у той час як дзяржаўныя чыноўнікі і BP сцвярджаюць, што яна выпарылася, разбураная мікраарганізмамі, або, распаўшыся на малыя часцінкі, апусцілася на дно.

Галоўны вынік — сапсаваны турыстычны сезон на пляжах Флорыды і Алабамы, у той час як Луізіана больш пацярпела ад закрыцця рыбных промыслаў. Болей за 40 працэнтаў прадуктаў мора ў ЗША здабываюцца ў Луізіане. Прамысловая нарыхтоўка устрыц, крэветак, крабаў — пацярпела ўсё. Нямала рыбакоў, пазбаўленых магчымасці здабываць рыбу, уладкаваліся на BP па зборы разлітай нафты, і, падобна, зарабілі больш грошай, чым на сваім звычайным промысле.



## Даведка

Джон А. Экснішас (John A. Exnicios) — юрыст і палітычны кансультант. У 1989–1995 гадах працаваў з дэмакратычнымі групамі ў краінах былога савецкага блоку. Затым дзейнічаў як грамадскі адміністратар у кіраўнічых органах Новага Арлеану, двойчы абіраўся ў Цэнтральны Камітэт штата Луізіана. Палкоўнік у адстаўцы. Жыве з жонкай у Новым Арлеане.

Больш непакоіць доўгатэрміновае падзенне рэпутацыі нашых морапрадуктаў. Падаецца, што мільярдная сума, патрачаная на ачыстку і рамонт вышкі са свідравінай, перавышае кошт недаатрыманых даходаў ад рыбалоўства, турызму і рэстараннага бізнесу. Як заўсёды, ёсць тыя, хто выйграў і хто прайграў. Асноўная частка гараджан не мела іншага клопату, апрача паху нафты, які часам прыносіў вецер з поўдня. Недальнабачны мараторый на вытворчасць у заліве, накладзены Абамай, сур'ёзней б'е па Луізіяне, чым сама аварыя: тысячы людзей на мностве працоўных месцаў па-за берагам зараз вымушаны прастойваць. Мараторый мог паўздзейнічаць на вытворчасць на платформах у глыбокіх, аддаленых ад берага месцах. Але гэта дарагія праекты, і гаспадары вялікіх нафтаздабываючых платформ ужо папросту перасунулі іх да ўзбярэжжаў Бразіліі і Афрыкі.

***— Ці адчуваецца ў рэгіёне сур'ёзны ўплыў экалагічнай катастрофы, ці штосьці змянілася ў жыцці горада і навакольных раёнаў?***

— З Новым Арлеанам усё ў парадку. Нягледзячы на шкоду рыбалоўству, выплачаны вялікія кампенсацыі, таму і доўгатэрміновыя перспектывы не выглядаюць такімі сумнымі, як падавалася напачатку.

***— Ці праўда, што аварыя можа мець глабальнае ўздзеянне: праз змяншэнне выпарэнняў у Мексіканскім заліве — на рух Гальфстрыму і аж да змяненняў клімату?***

— Падаецца, гэта перабольшванне. Тая мёртвая рыба, знойдзеная ў заліве, — вынік з'яўлення вуглекіслаты ў вадзе з-за вялікай колькасці парэштак сельскагаспадарчых угнаенняў, якія штогод у гэтыя месяцы нясе ў мора Місісіпі. Шматлікія тэсты морапрадуктаў на атручванне даюць адмоўны вынік. У тое, што кажуць эколагі, не варта верыць больш чым на 10%.

***— Ці ёсць сацыяльныя вынікі аварыі?***

— У асноўным гэта масавыя злоўжыванні з мэтай атрымаць кампенсацыю, таксама як гэта рабілася пасля ўрагану «Катрына». Падобныя катастрофы здольныя высвечваць у чалавечай натуры як добрае, так і злое. Напрыклад, пацярпелі бедныя рыбакі, якія звычайна прадавалі здабычу за наяўныя, пазбягаючы падаткаў, і таму не маглі прад'явіць паперы для кампенсацыі. Іншыя ж толькі зарабілі.

***— А як з «Катрынай», ці пераадолены ў Луізіане наступствы ўрагану пяцігадовай даўніны?***

— Пяць гадоў пасля ўрагану некаторыя часткі гораду — пераважна бедныя — выглядаюць, як быццам ён здарыўся 3 месяцы таму. Прыкладна чвэрць гарадскога насельніцтва пераехала ў пошуках лепшага жыцця ці перасялілася з горада ў навакольныя раёны. У той час, як мой раён (Нэльсан Стрыт), дзе вада падымалася толькі на 3 футы, ужо праз год вярнуўся да нармальнага жыцця.

***— Наколькі змянілася атмасфера гарадскога жыцця, склад насельніцтва?***

— Усё залежыць ад раёна. Прыехала багата мексіканцаў, гішпанамоўных рабочых (многія нелегальна), і значная іх частка засталася. Яны вынеслі асноўны цяжар адбудовы горада. Колькасць чорнага насельніцтва скарацілася на 10% — з 70% да 60%, так што пасля ўрагану белыя партыі ўпершыню за доўгі час аказаліся здольныя выйграць выбары. Тысячы белых валанцёраў з усёй краіны прыехалі ў складзе дабрачынных царкоўных груп, некаторыя вырашылі застацца, каб зрабіцца персанальнай часткай аднаўлення жыцця горада. А так — з Катрынай звязана больш міфаў, чым праўды.



Цэнтр Новага Арлеана 29 жніўня 2005 г.

***— Які стан знакамітага культурнага жыцця горада, асабліва музычных фестываляў, Mardi Gras і іншых?***

— The FQ (французскі квартал, гістарычная частка ў цэнтры горада) застаўся некранутым стыхіяй: паколькі лепшыя кварталы будаваліся на ўзвышшы. Культурная атмасфера засталася некранутай, ужо амаль аднавіўся ўзровень турызму. Рэстарацый увогуле адчынена болей, чым да «Катрыны», прытым што насельніцтва скарацілася амаль на 100 тысяч. Mardi Gras, Jazz Fest і сотні іншых фестываляў праводзяцца, як нічога не было.

Што засталося ў памяці пасля «Катрыны»: як кожная катастрофа, яна выклікала праявы крайнасцяў: жыццё рэзка мянялася, адбыўся выбух самагубстваў, былі напады на суды і паліцыю. Частка людзей паводзіла сябе гераічна, частка — займалася рабаўніцтвам і падпаламі…

**P. S.** Новы Арлеан, ці Горад паўмесяца («Crescent city»), такую назву-мянушку ён атрымаў за прыгожы выгін магутнай ракі Місісіпі, аднаўляецца. Аднаўляецца адзін са старэйшых цэнтраў ЗША, сталіца поўдня, унікальнае месца сустрэчы рознанацыянальных культур. Заснаваны ў 1718 годзе французамі, якія захапілі гэтыя землі ў апошняй чвэрці XVII стагоддзя, названы ў гонар Філіпа Арлеанскага, рэгента пры малалетнім каралі Францыі Людовіку XV. У 1763 годзе ён перайшоў да іспанцаў, у 1800-м — зноў да французаў. Нарэшце, быў прададзены Напалеонам за 15 мільёнаў долараў ЗША ў 1803 годзе — адна з буйнейшых у гісторыі зямельных здзелак.

Так французскія і іспанскія ўплывы перапляліся з мясцовымі крэольскімі і індзейскімі, спалучаючы моцныя каталіцкія традыцы з незвычайнымі магічнымі культамі, накшталт вуду. Французскія дыялекты, закансерваваныя з XVIII стагоддзя, жывыя ў прыгарадах Новага Арлеана і дагэтуль.

Тут упершыню ў ЗША ў 1790-х гадах пачалі даваць оперы. А ў дамах белых гаспадароў, у старасвецкіх будынках з белымі калонамі на фасадах, што знаёмыя ўсім па «Знесеных ветрам» Маргарэт Мітчэл, невялічкія аркестры выконвалі танцавальную музыку: рэгтаймы, салонныя п'ескі, маршы і песенькі з аперэт. Калі да рэпертуару дадалі «гарачыя» імправізацыйныя тэмы, з гэтай сумесі на мяжы XIX і XX стагоддзяў тут нарадзіўся джаз. Тут нарадзіўся і кароль джаза — Луі Армстронг (1901–1971) .

Фестываль Mardi Gras, пярэсты карнавал і бясконцы музычны фэст (у перакладзе з французскай мовы — «тлусты аўторак», аналаг нашай Масленіцы) у 2006 годзе, праз паўгады пасля «Катрыны», прайшоў у 150-ы раз. «Гэта «вяртанне года», знак, што горад адраджаецца», — напісала тады «Нью-Ёрк Таймс».

Непаўторную атмасферу Новага Арлеана можна ўявіць па фільмах Джыма Джармуша, які некалькі гадоў таму ў інтэрв'ю польскай «Газеце Выборчай» паведаміў, што яго продкі па прозвішчу Jarmusz, паходзяць, відаць, аднекуль з Рэчы Паспалітай.

Адсюль паходзіць «наш забойца амерыканскага прэзідэнта Кенедзі» — колішні мінчук Лі Харві Освальд.

А хто не памятае пранізлівы хіт «The Animals», бязмежны блюз-рок «Дом узыходзячага сонца», пераспяваны папулярнымі беларускімі выканаўцамі ў праекце «Я нарадзіўся тут»? Так што Новы Арлеан — горад памежжа культур — не такі далёкі Беларусі. І ён вяртаецца да нармальнага жыцця.

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ПАРТУГАЛІЯ. СТО ГАДОЎ РЭСПУБЛІКІ



Партугалія святкуе стогадовы юбілей абвяшчэння ў краіне рэспубліканскага ладу. У ноч на 5 кастрычніка 1910 года дваццацігадовы кароль Мануэль II з сям'ёй збег з краіны. Ужо зранку Партугалія стала рэспублікай. Быў прызначаны часовы вярхоўны кіраўнік дзяржавы. Змене рэжыму папярэднічалі дзіўныя падзеі: 3 кастрычніка ў парламенце нейкім афіцэрам быў забіты лідэр рэспубліканскай фракцыі. Гэта дало штуршок вайсковаму мяцяжу, які прымусіў караля пакінуць краіну. Сёння гісторыкі спрачаюцца наконт таго, ці была ў 1910 годзе іншая альтэрнатыва. З аднаго боку, у парламенце засядалі рэспубліканцы, і менавіта каласальныя расходы на каралеўскі двор лічыліся прычынай бюджэтнага дэфіцыту. З іншага — Мануэль быў вельмі ліберальным і гатовым на рэформы. Яго ж звяржэнне пры слабасці рэспубліканскіх традыцый стымулявала працяг палітычнага хаосу (за наступныя дзесяць гадоў у Партугаліі было 7 прэзідэнтаў і 10 урадаў) і адчыніла шлях да ўсталявання тут адной з самых працяглых дыктатур у еўрапейскай гісторыі. У 1932 годзе да ўлады прыйшоў Антоніу Салазар, які кіраваў Партугаліяй аж да самай смерці ў 1968 годзе.

**Па матэрыялах FAZ (Германія)**

### ЛАЦІНСКАЯ АМЕРЫКА. ПРЭМІЮ НОБЕЛЯ Ў ЛІТАРАТУРЫ ДАЛІ НЕ ТАМУ ПІСЬМЕННІКУ

Не толькі кітайскія ўлады, чый дысідэнт атрымаў прэмію Нобеля за мір, не задаволеныя рашэннем шведскай каралеўскай акадэміі, якая вызначае лаўрэатаў узнагароды. Свае «фу» таксама выказваюць левыя інтэлектуалы Лацінскай Амерыкі. Ім не падабаецца, што прэмію за літаратуру атрымаў перуанец Марыё Варгас Льоса. Апошні вядомы не толькі як бліскучы літаратар. У 1980-я гады Льоса ўступіў у канфлікт з левымі інтэлектуаламі, выступіўшы ў падтрымку ліberalaў. З часам пісьменнік стаў нават сімвалам лібералаў усяго кантынента. Каб неяк насаліць нобелеўскаму лаўрэату, левая прэса прыдумала цікавую тэорыю пра тое, што існуюць два Льосы. Першы — Варгас Льоса, які пісаў у 60–70-я з пазіцый марксіста, і цяперашні Льоса — ліберальны. І быццам прэмію Нобеля атрымаў менавіта малады левы прагрэсіўны Льоса. Пры гэтым яны спекулююць на тым факце, што раннія творы аўтара сапраўды разглядаліся шмат кім як атака на тагачасную лацінаамерыканскую мадэль капіталізму. Так, першую кнігу Льосы «Горад і сабакі» не хацелі друкаваць па той прычыне, што аўтар паказвае быт вайсковых кадэтаў. Цэнзары ўбачылі тут замах на ўсю сістэму вайсковых дыктатур, якія панавалі тады ў рэгіёне. Тэорыя гэта, аднак, мае слабыя месцы. Творы, якія Льоса напісаў ужо будучы лібералам, таксама дастаткова цікавыя і значныя.

**Па матэрыялах «Rebellion» (Мексіка)**

### РАСІЯ. АБЛОМ У ПАТРЫЁТАЎ

Мякка кажучы, шок перажылі аматары расійскага нацыяналізму. Так званыя «далёкаўсходнія партызаны» аказаліся зусім не тымі, за каго іх успрымалі. Нагадаем, што на пачатку лета ўсю Расію абляцела сенсацыйная навіна: група хлопцаў з-пад Уладзівастоку пачала партызанскую вайну супраць рэжыму. Удзельнікі атрада забівалі міліцыянераў, рабілі падпалы аддзяленняў РАУС і г.д. Пра ідэйны профіль партызан было вядома мала. Хіба што існаваў невялікі тэкст у інтэрнэце, дзе сучаснае кіраўніцтва Расіі малявалася як антынародная ўлада алігархаў семіцкага паходжання, якую трэба змяніць любымі сродкамі. Аднак нават такой няпэўнай інфармацыі расійскім патрыётам хапіла, каб стварыць з партызан сапраўдны культ. Шматлікія нацыяналістычныя арганізацыі заявілі пра сваю падтрымку герылы на Далёкім Усходзе, а некаторыя нават паведамілі, што таксама гатовыя ўзяцца за зброю і пайсці ў лясы (натуральна, гэта была медыйная качка). Між тым, тых хлопцаў у рамках маштабнай паліцэйскай аперацыі каго забілі, а каго схапілі. З часам стала больш вядома пра іх саміх і пра іх чын. У прыватнасці, днямі ў сеціве з'явіўся ролік з партызанамі, на якім сярод іншага фігуруе іх прывітанне братам на Паўночным Каўказе. Ёсць у спічы такія характэрныя фразы: «Ваша магутна імперыя — Расійская Федэрацыя — трымаецца цалкам на алкагалізме і баязлівасці. Аднойчы яна абрынецца, і вы разам з ёй у бездань зваліцеся. Вы можаце ашукваць гэтых лохаў, якія з-за рабскай сутнасці не могуць разгадаць вашу хлусню... Але вы не ашукаеце Усявышняга, бо Ён бачыць усе». Таксама ёсць інфармацыя, што адзін з лідэраў групы быў вахабітам. Такіх маналогаў цалкам хапіла, каб у вачах патрыётаў партызаны з герояў ператварыліся ў здраднікаў. Праўда, эксперты не выключаюць, што ролік мог быць правакацыяй ФСБ, якая зацікаўленая ў кампраметацыі паўстанцаў.

**Па матэрыялах ЖЖ**

ПАРАДОКСЫ ПЕРАПІСУ

# КОЛЬКІ Ў РАСІІ ПАПУАСАЎ ХУЛІ?

**Алег НОВІКАЎ**

**14 кастрычніка ў Расійскай Федэрацыі пачаўся перапіс насельніцтва, у рамках якога таксама плануецца высветліць нацыянальны склад краіны. Без палітычных правакацый на гэтай глебе не абышлося.**

Дазваляецца выбраць любую нацыю з прапанаваных у лісце перапісчыка, а іх там аж 1840. Такое ўражанне, што пазбаўленая магчымасці вялікага палітычнага выбару (у Расіі браць удзел у выбарах дазваляецца толькі кандыдатам ад 7 партый) расійская публіка папросту ашалела ад такой дэмакратыі. Яшчэ ў 2000 годзе падчас мінулага перапісу грамадзяне, асабліва моладзь, павесяліліся. Шмат хто ў пятай графе пазначыў сябе эльфам або гоблінам — персанажамі вельмі папулярнай на той час казачнай сагі Толкіена.

Праз дзесяць гадоў трэба чакаць паўтарэння падзей. Кожны грамадзянін РФ мае поўнае права запісацца ў прадстаўнікі такіх этнічных груп, як «без нацыі», «без нацыянальнай прыналежнасці», «без нацыянальнасці», «грамадзянін зямлі», «грамадзянін свету», «жыхары сусвету», «жыхары зямлі», «інтэрнацыяналісты», «не вызначыліся», «невядома», «не», «ніякая нацыянальнасць», «адсутнічае», «расійцы», «складаная нацыянальнасць», «савецкія», «чалавек», «чалавек зямлі», «чалавек свету».

Іншы варыянт быць арыгіналам — абраць сабе нейкую экзатычную нацыянальнасць. Асабліва спадабаліся расійцам, мяркуючы па каментарах у інтэрнэце, такія афіцыйна дазволеныя адказы, як аўстравенгры, афрарасійцы, бульбашы, ведаросы, замежнікі, інтэрнацыяналісты, кацапы, касмапаліты, хрышчоныя, маларосы, метысы, мулаты, папуасы хулі, праваслаўныя эстонцы, старaверы, старажылы, фараоны, чалавек, чудзь, чухонцы...

Але думаецца, што галоўнай правакацыяй стане гульня з вядомым словам з трох літар. Аказваецца, на прасторах былой імперыі жывуць кітайскія мусульмане (дунгане), якія называюць сябе «х…й». У сеціве ўжо з'явілася ініцыятыва «Расіі важны кожны х…й». Вось што пішуць яе арганізатары: «Прапануем, улічваючы быдлячае стаўленне ўлады да народаў Расіі, у знак пратэсту супраць таго, што на ўсіх пакладзены вышэйзгаданы ўладны х…й, падчас перапісу назваць сябе менавіта «х…м».

Калі сур'ёзна, то, безумоўна, перапіс і пункт пра нацыянальнасць — гэта вялікая палітыка. Асабліва ў рэгіёнах, дзе мясцовая эліта для легітымацыі сваёй аўтаноміі мусіць абапірацца на нейкую статыстыку.

Ужо задоўга да перапісу ў прэсе шмат пісалі пра татарскае пытанне. У паперах перапісчыкаў татар падзялілі на дробныя этнічная групы. Ёсць 113 варыяцый іх назваў — ад булгар да рэгіянальных груп у складзе татар і булгар. Напрыклад, мішары, тэпцяры, крашэны, нагайбакі, астраханскія татары, сібірскія татары (у тым ліку падгрупы сібірскіх татараў — барабінцы, чулымскія цюркі, бухарцы, сарты і г.д.).

У Казані такую поліфанічнасць разглядаюць як спробу штучнымі сродкамі паменшыць колькасць татар і пазбавіць нацыю магчымасці патрабаваць для сябе ад Масквы нейкія прывілеі. Раней татары выступалі за наданне татарскай мове статусу афіцыйнай. Апошні год казанская адміністрацыя вядзе кампанію за тое, каб усе татары запісваліся татарамі.

Татарскае пытанне актуальна і ў Башкірыі, дзе тытульная нацыя доўгі час была меншай за татар і рускіх. У часы кіравання Муртазы Рахімава перапісы ў рэгіёне фактычна фальсіфікавалі, каб павялічыць працэнт башкірскага этнасу. Дэмографы папросту вар'яцелі, калі бачылі лічбы. Калі ім верыць, то ў 1990-я башкіры перажывалі сапраўдны дэмаграфічны бум.

Цікава рэакцыя грамадскасці на ініцыятыву трацкісцкай групы «Рух супраціву імя Пятра Аляксеева» (ДСПА). Група выступіла з заклікам да левых актывістаў у ходзе перапісу называць сябе «савецкі». Матывацыя яе прыхільнікаў досыць дзіўная: «Пасля таго, як СССР перастаў існаваць, ён пачаў паступова перасоўвацца ў галіну знакаў. І ад таго, якія знакі возьмуць верх, залежыць шмат што. Ці будзе СССР успрымацца знакам жахлівай дыктатуры і тэрору? Або сімвалам сапраўднай альтэрнатыўнай цывілізацыі, якая кінула выклік свету прыгнёту і рабства? Вось што для мяне Савецкі Саюз. Таму я запішуся савецкім, і іншым даю такую ж параду. Калі вынікі перапісу пакажуць, што савецкіх людзей большасць — для адстойвання нашых інтарэсаў нам не трэба будзе чакаць чарговага фарсу выбараў».

**Кожны грамадзянін РФ мае поўнае права запісацца ў прадстаўнікі такіх этнічных груп, як «без нацыі», «без нацыянальнай прыналежнасці», «без нацыянальнасці», «грамадзянін зямлі»**

Паказальна, што гэта ідэя не сустрэла падтрымкі. Новае пакаленне расійскіх левых не хоча быць «савецкімі». Яно надае перавагу тэрміну «інтэрнацыяналіст».

Самай рэзананснай справай аказалася праблема сібіракоў. Удзельнікі інтэрнэт-супольнасці «Сапраўдныя сібіракі» заклікалі ўсіх жыхароў Сібіры падчас перапісу насельніцтва ў якасці сваёй нацыянальнасці называцца «сібіракамі».

Нехта Дзмітры Осіпаў нават склаў маніфест сібіракоў. Вось яго самы важны фрагмент: «Не трэба рабіць з мяне сябра паслухмянага статку «паважаных расійцаў», круціць дзень і ўначы прапаганду, убіваць мне ў галаву жахі пра ворагаў вакол Расіі-матухны. Мне не трэба вашых указак, мяне ад іх ванітуе. Ванітуе ад вашай Рублёўкі і гламуру, ванітуе ад вашых картэжаў, ад вашых пацалункаў з сусветнымі ўблюдкамі. Мяне ванітуе ад вашых таўстазадых парламентарыяў і дэбільных палітычных актывістаў з мядзведзямі на лбу. Мяне ванітуе ад вашага нацыянальнага лідэра і яго ВРИО-камедыянта. Мне сорамна за тое, што мая любая радзіма — гэта для вас усяго толькі сыравінны прыдатак! Хопіць! Я заву сябе Сібірак!»

Ініцыятыва была падхоплена шматлікімі інтэрнэт-карыстальнікамі. «Сапраўдныя сібіракі» мяркуюць, што калі жыхары Сібіры арганізавана аднясуць сябе да сібіракоў, дык з'явіцца магчымасць стварыць нацыянальную калектыўную супольнасць, і нават атрымаць адпаведныя правы.

Інфармацыя шырока распаўсюдзілася ў блогах і ў інтэрнэт-СМІ і выклікала хвалю бурных абмеркаванняў, якія не спыняюцца дагэтуль.

Так, Віктар Арлоў, сябра Савета Федэрацыі, назваў акцыю «заявай, якае патыхае сепаратызмам». «Гэта можа стаць небяспечным прэцэдэнтам, што ў канчатковым выніку прывядзе да рассячэння рускага народа на дробныя часткі», — адзначыў сенатар. Яго падтрымалі шэраг маскоўскіх і правінцыяльных чыноўнікаў.

На сайце фашысцкага руху «Рускій образ» гаворыцца: «З'явіліся нейкія ініцыятыўныя групы, якія выступаюць за ўключэнне ў пералік нацыянальнасцяў новай, ніколі раней не вядомай нацыянальнасці — «сібірак». Нацыянальнасць «сібірак» выдумана набрыддзю інтэрнацыянальных гнюсаў, якія паставілі мэтай зняважыць нацыянальнай добрай якасці, нацыянальных пачуццяў і духоўнасці ўсіх народаў, што насяляюць Сібір. І таму кожны рускі сібірак павінен назвацца расійцам».

З улікам наяўнасці асобнай Сібірскай федэральнай акругі да сібіракоў могуць сябе аднесці прыкладна 20 мільёнаў чалавек. Думаецца, што наўрад ці сібіракоў будзе вельмі шмат, аднак штуршок для развіцця лакальнай ідэнтычнасці акцыя ўжо дала. Нехта Саян Андрыянаў напісаў гімн «Мы сібіракі». У Новасібірску ўзнікла культурная суполка «Нацыя сібіракоў». Часам у сеціве нават можна пабачыць літаратурныя эксперыменты, калі нехта спрабуе пісаць на сібірскай мове. Напрыклад: «*Мы сибиряки ся зырим как постать людноси, и твердо собралися поклась все силы гля всевобчево розвитя. Мы загаркивам всех народов с присоветом мира, дружки и ровноправной соробoты*».

Ці было б гэта магчыма без перапісу?

ЦІКАВА

# ТУАРЭГ — ГЭТА НЕ «ФОЛЬКСВАГЕН»

**Сяргей Банько, напэўна, адзіны беларус, які апошнім часам быў у гасцях у туарэгаў — народу пустыні Сахара. Сваімі ўражаннямі ён падзяліўся з журналістам «Новага часу» Алегам Новікавым.**



**Даведка:**

Туарэгі — народ групы бербераў у Малі, Нігеры, Буркіна-Фасо, Марока, Алжыры і Лівіі.

Туарэгі лічацца нашчадкамі бербераў (еўрапеоідная раса), якія ў VIII стагоддзі былі выцеснены арабскімі заваёўнікамі ў Паўночную Афрыку, дзе перайшлі да вандроўнага ладу жыцця. У гэты перыяд туарэгі падпалі пад ісламізацыю. Падчас каланіяльнай эры былі ўключаны ў Французскую Заходнюю Афрыку. Пасля краху каланіялізму туарэгі не атрымалі ўласнай дзяржаўнасці. Захоўваюць племянное дзяленне і элементы патрыярхальнага ладу: народ падзяляецца на племянныя ці «барабанныя» групы, якімі кіруе правадыр, чыю ўладу сімвалізуе барабан.

***— Як ты пазнаёміўся з туарэгамі? Чаму ўзнікла цікавасць да гэтага народу?***

— Падчас навучання ва ўніверсітэце ў Трыпалі сустрэўся з людзьмі, якія былі знешне і па паводзінах вельмі не падобныя на арабаў. Спытаўся, хто яны такія. Кажуць — туарэгі. Мяне зацікавіла іх музыка. Неяк сказаў аднаму з іх, што хацеў бы больш даведацца пра іх народ і культуру. Прыкладна праз месяц яны запрасілі мяне да сябе ў госці. Так я пачаў знаёміцца з мовай, фальклорам, музыкай туарэгаў. Пазней пабываў у Сахары непасрэдна ў зоне, дзе вандруюць іх плямёны. Наведаў іх гарады.

***— Колькі ўсяго туарэгаў на свеце?***

— Цяжка сказаць. Іх папросту немагчыма пералічыць, паколькі яны вядуць вандроўны лад жыцця і не вельмі ахвотна ўступаюць у кантакты з дзяржавай. Называць лічбу 5 мільёнаў чалавек. Увогуле, калі ты пытаеш туарэга, якой ён нацыянальнасці, той папросту адказвае: «Я з пустыні». Супольнасць туарэгаў — нейкі кангламерат берберскіх плямёнаў, які часта называецца Азавад. Яго ўмоўныя межы цягнуцца ад Заходу Нігера да Заходу Лівіі. Гэта нейкая дзяржава ў дзяржаве. Яна не мае адміністратыўных межаў, яе ніхто не прызнае афіцыйна, аднак турбаваць вандроўнікаў таксама асцерагаюцца. Здаецца, толькі ў Малі спрабавалі неяк наладзіць больш-менш нармальную адміністратыўную мяжу з краінамі-суседзямі, якая праходзіла па землях Азавад. Туарэгі папросту знішчылі памежныя гарнізоны, а палонных забралі ў рабства.

***— Ты сам асабіста бачыў рабоў туарэгаў?***

— Я сустракаўся з лівійскімі туарэгамі, якія сярод туарэгаў лічацца, так бы мовіць, найбольш інтэграванымі ў арабскае грамадства. Кадафі праводзіць адносна іх спецыяльную палітыку — будуе дамы, шпіталі, школы. Спрабуе перасяляць іх у гарады. Таму ў Лівіі інстытута рабства ў туарэгаў дакладна няма. Аднак яно захавалася сярод туарэгаў Малі і Нігера. Па тым, што мне распавядалі, гэта цяжка назваць рабствам у класічным разуменні гэтага тэрміну. Звычайна рабы — гэта папросту былыя салдаты гэтых краін, якія трапілі ў палон. Трапляючы ў рабства, яны аўтаматычна становяцца сябрамі сям'і, у якой працуюць. Пры гэтым пакідаюць за сабою права шукаць іншага гаспадара. Калі раб сыходзіць ад гаспадара, для апошняга гэта вялікая ганьба. У сваю чаргу, для раба самая вялікая ганьба, калі яго выганяюць з сям'і і ён становіцца вольным чалавекам.

***— Туарэгі пасля прыходу арабаў прынялі іслам. Якую ролю адыгрывае рэлігія ў паўсядзённым жыцці туарэгаў?***

— У параўнанні з арабскім грамадствам, тут менш рэлігіі, больш нейкай еўрапейскасці. На вуліцах не так брудна. Больш грамадскага парадку, хаця самае вялікае пакаранне для злодзея — байкот з боку грамадства (людзі перастаюць з імі размаўляць). Музыка туарэгаў вельмі нагадвае музыку раманскіх народаў. Берберскія жанчыны не хаваюць твар. Дзяўчыны могуць свабодна сядзець у кафэ і рухацца па гораду без суправаджэння мужчыны. Увогуле, роля жанчын сярод туарэгаў вельмі вялікая. Кабета трымае ўсю хатнюю гаспадарку, а мужчына больш часу праводзіць у пустыні. Дарэчы, існуе нават спецыяльная мова і правапіс для жанчын. Мужчыны карыстаюцца арабскім правапісам. Самае цікавае, што ім, у адрозненні ад жанчын, дазволена быць непісьменнымі. Аднак казаць пра тое, што іслам не адыгрывае ніякай ролі, было б няправільна. Вялікім аўтарытэтам карыстаюцца мурабіты — дэрвішы. У туарэгаў забаронены алкаголь. Яны п'юць нешта падобнае на разбаўлены кефір.

***— Як ставіліся да цябе як да беларуса?***

— Гістарычна да еўрапейцаў ставяцца вельмі асцярожна. Калі мы прыехалі ў зону туарэгаў, нашу машыну ўважліва абшукалі, у адрозненні ад арабскіх памежнікаў, якія вельмі флегматычныя. Сярод некаторых кланаў, напрыклад народу Туду, амаль да нядаўняга часу існавала правіла забіваць кожнага белага чалавека. Гэта, натуральна, не расавыя забабоны, а папросту страх, што за першым белым чалавека прыйдзе другі. Аднак калі ўсе фармальнасці паспяхова пройдзеныя, да цябе ставяцца вельмі добра. Пачынае працаваць усходні закон гасціннасці.

***— Якія перспектывы ў туарэгаў у плане атрымання сваёй дзяржаўнасці?***

— У кожнай краіне свая асобная сітуацыя. У той жа Лівіі, як я казаў, улады праводзяць палітыку на культурную інтэграцыю туарэгаў. Вялікую ролю адыгрывае сам палкоўнік Кадафі, які носіць адзенне туарэгаў, любіць жыць у пустыні. У другіх краінах сітуацыя іншая. Магчыма, нейкія структуры дзяржаўнасці могуць узнікнуць у Нігеры, дзе моцныя сепаратысцкія настроі з-за спробаў уладаў і французскіх кампаній здабываць у зоне туарэгаў уран. Канфлікт тут працягваецца з пачатку 90-х. Аднак тут важна тое, што псіхалогія вандроўніка не адпавядае кодэксу грамадзяніна любой, нават туарэгскай дзяржавы. Адзін з элементаў філасофіі жыцця ў Сахары — гэта пачуццё неабмежаванай свабоды.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ІГАР СМІРНОЎ



Да ўсіх іншых праблем Смірнова, прэзідэнта непрызнанай Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі (ПМР), дадалася яшчэ адна, вельмі незвычайная. Гаворка пра «Энцыклапедыю Прыднястроўя» — маштабны праект, які дзяржава запусціла ў 2007 годзе. «Гэта фундаментальная праца, у якой будуць асветленыя ўсе аспекты жыцця нашай дзяржавы: шлях станаўлення і здабыцця незалежнасці», — падкрэсліў тады Сцяпан Берыл, рэктар універсітэта ў Цірасполі і кіраўнік рэдакцыі энцыклапедыі. Праз тры гады, у верасні 2010-га, адбылася прэзентацыя кнігі. І адразу пачаўся сандал. Шэраг арганізацый (галоўным чынам жаночых) заявілі, што энцыклапедыя — фальсіфікацыя гісторыі ПМР. На яе старонках няма інфармацыі пра шэраг асобаў, якія стаялі ў вытокаў стварэння ПМР або займалі высокія пасады ў першыя гады існавання дзяржавы. Затое значнае месца ў кнізе займае опус пра гераічны шлях Ганны Волкавай, цяперашняй дарадчыцы Смірнова і адной з галоўных аўтараў энцыклапедыі. Волкава адвяла сама сабе вялікую ролю ў падзеях 1991 года, калі была створаная ПМР, што, на думку аўтараў ліста, няпраўда: «Волкава не ведае, як мерзнуць у пікетах, здабываць зброю, арганізоўваць пахаванні і хаваць аднапалчан, не была ў акопах з намі і г. д. Яна спала ў чыстым ложку і ўладкоўвала сваё асабістае жыццё і, як сама піша, увесь час знаходзілася ў крэсле побач з прэзідэнтам. І не больш за гэта». Відавочна, што канфлікт вакол Волкавай — гэта спроба часткі ветэранаў прыднястроўскага руху вярнуць сабе былыя пазіцыі ў кіраўніцтве, з якіх іх пасунулі людзі смірноўскага клану. З іншага боку, гісторыя з энцыклапедыяй даказвае, што нават айцы-заснавальнікі ПМР не задаволеныя дзяржавай, якую калісьці самі і стварылі.

### КРЫСЦІН О'ДОНЭЛ



«Новы Час» ужо пісаў, што сваімі цікавымі заявамі Крысцін О'Донэл, кандыдат ад партыі рэспубліканцаў на пасаду губернатара ў штаце Дэлавер, сябра кансерватыўнай групы Tea party, перавяла выбарчую дыскусію ў нешта дзіўнае. Нагадаем, што адзін з яе экстравагантных лозунгаў — пра шкоднасць мастурбацыя, якая быццам бы разбурае сем'і. Самае смешнае, што апаненты з дэмакратычнага лагера спрачаюцца з ёй на поўным сур'ёзе. На базе рэдакцыі часопіса «The Nation», блізкага да партыі дэмакратаў, адбыўся круглы стол з мэтай разбурыць тэзісы Крысцін. Са спасылкай на нейкія апытанні, якія сведчаць, што гэтым займаюцца 94 працэнты мужчын і 84 працэнты жанчын, дэмакраты прыйшлі да высновы, што Крысцін не адлюстроўвае погляды большасці амерыканцаў. Канчатковы адказ, праўда, за выбаршчыкамі, якія 2 лістапада будуць абіраць паміж Крысцін і яе апанентам-дэмакратам. Між тым, шматлікія палітолагі ўжо занепакоеныя. Пераможа Крысцін ці не, яна ўжо выпусціла джына з бутэлькі. Тэма мастурбацыі можа стаць адной з галоўных у прэзідэнцкай кампаніі 2012 года.

### АБДАЛЛА АЛЬ САУД



Кароль Саудаўскай Аравіі прыняў рашэнне, якое ўскалыхнула ўвесь мусульманскі свет. Цяпер выключна сябры блізкага да караля Савету вялікіх улемаў (муфціі, знаўцы ісламу) маюць права тлумачыць фатвы (рэлігійныя тэксты). Трактоўкі тых фатваў вельмі папулярныя сярод мусульман. У інтэрнэце існаваў цэлы сегмент сайтаў, прысвечаных гэтаму пытанню, плюс працуе асобны тэлеканал. Зараз усе гэтыя СМІ фармальна забароненыя. Аднак вялікае пытанне, ці здольная дзяржаве сапраўды заблакаваць тыя ж крамольныя сайты. Акрамя таго, некаторыя мулы і знаўцы ісламу выступілі супраць закону. Па іх словах, заканадаўства, па-першае, парушае адзінства мусульманскага свету, па-другое, супярэчыць прынцыпам суніцкага ісламу, які выступае супраць іерархічнага прынцыпу мадэлі царквы і нейкіх пасярэднікаў паміж Богам і чалавекам. Крытыкі рэформы нават параўноўваюць яе з працэсам будаўніцтва царкоўнай іерархіі ў раннім хрысціянстве. Што да караля, то яго ўчынкі лагічныя. Спасылкі на фатвы часта ўжываюцца ўладамі не толькі для таго, каб урэгуляваць нейкія канфлікты ў побыце, але нават дыпламатычныя адносіны. Шмат інтэрпрэтацый тут яўна непатрэбна. Між тым, дэкрэт пра фатвы можа быць вялікім падарункам для апазіцыі. Незадаволеныя рэформай ужо патрабавалі стварэння незалежнага савету муфціяў.

З НАГОДЫ

# СІМВАЛ БЕЛАРУСКАЙ СВАБОДЫ

## 300 ГАДОЎ МІНСКАЙ КАТЭДРЫ

Аляксей ХАДЫКА

**9 кастрычніка ў мінскім катэдральным касцёле св. Дзевы Марыі адбыліся юбілейныя ўрачыстасці, прысвечаныя 300-годдзю асвячэння храма. Святкаванні праходзілі пад дэвізам «Радасць і надзея» («Gaudium et spes») — сімвалічным для архітэктурнага помніка са складанай, як і ў самой беларускай сталіцы, гісторыяй.**



Касцёл св. Дзевы Марыі сёння



Катэдра ў 1914 годзе. Фота

Урачыстасць вёў спецыяльны легат Папы Рымскага Бенедыкта XVI кардынал Юзаф Томка, які па-беларуску павітаў прысутных: «Сёння мы сустракаемся ў гэтым месцы з гісторыяй, якая можа здавацца раманам. Трыста гадоў таму касцёл быў асвечаны, і за гэтыя тры стагоддзі архідыяцэзія неадназова скасоўвалася і зноў адраджалася. Касцёл працягваў існаваць і пасля другой сусветнай вайны як сімвал надзеі».

Пасланне галавы каталіцкай царквы да грамадзян нашай краіны агучыў ксёндз Эдмунд Даўгіловіч. Ля старажытных сцен стаялі шматлікія вернікі: тыя, каму не хапіла месца, маліліся перад уваходам, назіраючы за набажэнствам па вялікім маніторы на вуліцы.

Свецкая ўлада салідарызавалася з царкоўнай. Пасланне Аляксандра Лукашэнкі, таксама па-беларуску, зачытала намесніца кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Наталля Пяткевіч.

Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, падзякваўшы святому айцу і іганому спецыяльнаму пасланніку за шанаванне беларускага народа, яго культуры і касцёла, перадаў Бенедыкту XVI адмысловае запрашэнне: «Касцёл у Беларусі, не зважаючы на дзесацігоддзі ганенняў, сёння адраджаецца, моліцца за Папу і вельмі, вельмі, вельмі яго чакае».

### Храм і горад

Напярэдадні на канферэнцыі, прысвечанай юбілейным святкаванням, арцыбіскуп Кандрусевіч выказаў думку, што на 8 новых пляцовак, выдзеленых дзяржавай для будаўніцтва новых касцёлаў, варта паспрабаваць перанесці гістарычныя драўляныя храмы з закінутых вёсак. Зберагаючы спадчыну, можна адначасова вырашыць праблему нястачы храмаў у спальных раёнах сталіцы. Сапраўды, у горадзе з насельніцтвам у 1 мільён 839 тысяч чалавек дзейнічае толькі 4 касцёлы ў цэнтры і 1 у Серабранцы.

Між тым, калі ў 1654 годзе ў Мінску на рагу вуліцы Койданаўскай і Высокага рынку (цяпер вул. Рэвалюцыйная, 1) мураваную сядзібу багатага месціча Ягора Гегера з драўлянай капліцай набыў для езуітаў смаленскі біскуп Геранім Сангушка, насельніцтва горада вагалася каля 5 тысяч чалавек. А пасля таго, як 3 ліпеня 1655 года горад апанавалі маскоўцы і 4 гады рабавалі яго, насельніцтва значна паменела — да 2 тысяч. Ды і ў 1800 годзе насельніцтва складала толькі 6656 чалавек.

Між тым, на момант з'яўлення ў Мінску езуітаў, якія пазней збудавалі будучую катэдру, у горадзе ўжо дзейнічалі: найстарэйшы касцёл св. Тройцы і Унебаўзяцця Марыі (1390), храмы кляштараў дамініканцаў (пасля 1605), бенедыкцінак (пасля 1633), бернардынак (1642) і бернардынцаў (1644).

У 1680 годзе ў горадзе з'явіліся францысканцы — яшчэ да таго, як 31 ліпеня 1700 года езуіты заснавалі каменны храм. За 10 гадоў паўстаў прыгажэйшы ў Мінску будынак — прыкладна такі, які, аднак, рэстаўраваны, сёння бачаць мінчукі — трохнеавая базіліка з дзвюма вежамі ў чатыры ярусы на фасадзе і са своеасаблівай галерэйкай пры ўваходзе, сцены якой тады былі ўмацаваныя жалезнымі кратамі.

Асвячэнне храма пад тытулам Ісуса, Дзевы Марыі і св. Барбары 16 сакавіка 1710 года правёў віленскі біскуп Канстанты Казімір Бжастоўскі. Апошні быў апякраваўцам на езуіцкую місію і касцёл, падараваўшы маёнтак Ніжняе ў Мінскім ваяводстве. Так, як і рэферэндарый ВКЛ Цыпрыян Бжастоўскі (у 1680-м перадаў місіі маёнтак Ніжцы ў Аршанскім павеце і 50 тысяч злотых), і вядомы па партрэце Рэмбранта («Польскі вершнік» у Нью-Ёркскім музеі Фрык) канцлер Марцыян Аляксандр Агінскі (1685-ы — 50 тысяч злотых). Таму сродкаў на будоўлю каменнага храму хапала. Невыпадкова ў левай ад галоўнага алтара капліцы св. Тройцы, фундаванай Цыпрыянам Бжастоўскім, яшчэ ў XIX стагоддзі, па сведчанні Уладзіслава Сыракомлі ў нарысе «Мінск», захоўваўся яго партрэт. На ім адлюстроўвалася постаць у багатым палевым жупане, зашпіленым на мноства гузікаў з каштоўнымі камянямі.

### Музей і ўніверсітэт

Місія расла і пачынала адыгрываць важнае значэнне ў жыцці горада. Набыла статус рэзідэнцыі, а ў 1714 годзе — калегіума, свайго роду гуманітарнага ўніверсітэта. У 1723 годзе былы дом Гегера рэканструявалі ў 2-павярховы мураваны будынак, а да 1750-га перад ім паўстала прыгожая трохярусная вежа з барокавым дахам і гадзіннікам. Побач з касцёлам з'явілася аптэка з лабараторыяй. У гэты час у калегіуме выкладалі рыторыку, паэзію, сінтаксіс, граматыку, тэалогію, старажытнагабрэйскую мову, этыку, матэматыку, фізіку, логіку, метафізіку. Дзейнічаў школьны тэатр і найлепшая ў горадзе бібліятэка.

А храм пераўтвараўся ў сховішча святынь і выдатных помнікаў мастацтва. Партрэт Бжастоўскага мы ўжо прыгадалі, а вось у капліцы праваруч ад галоўнага алтара, якую фундаваў старадубскі староста, а потым мінскі ваявода Крыштаф Завіша, знаходзілася ягоная выява — у зброі, з блакітнай ордэнскай стужкай. Памяць пра Завішу была асабліва ўдзячнай, таму што ён падараваў храму мошчы св. Феліцыяна — адну з самых знакамітых мінскіх хрысціянскіх рэліквій, вызначыўшы такім чынам і назву капліцы.

Дарэчы, уявіць сабе выгляд партрэта Завішы можна па выяве яго пляменніка, Крыштафа Тэабальда, якая прызначалася для суседняга касцёла св. Язэпа пры кляштары бернардынцаў, а зараз захоўваецца ў Гістарычным музеі. Сцены капліцы размалёўваў мастак Мацей Бейтнік, а на канчаткова завершаных вежах з'явіліся чатыры званы з чалавечымі імёнамі — Якуб, вагой 450 пудоў, Казімір, Тадэвуш і Феліцыян. У нішах вежаў у другім ярусе паўсталі скульптуры апосталаў Пятра і Паўла, а ў цэнтральнай нішы франтона — постаць Божай Маці з Дзіцяткам.

У мастацкім жыцці горада храм адзначыўся і як месца працы самага папулярнага жывапісца XIX стагоддзя Яна Дамеля (1780–1840). Пераехаўшы ў Мінск у 1822 годзе, мастак, па ўспамінах яго сучасніка Адама Шэмеша, у падзямеллях сабора, якія былі месцам пахавання прадстаўнікоў радавітай шляхты, рабіў натурныя пастаноўкі для сваіх карцін. Тых, дзе патрабаваўся эфект штучнага асвятлення ў цемры: «Затворніцтва св. Пятра» і «Палажэнне ў труну».

Прыгаданы Адам Шэмеш, які па замове Уладзіслава Сыракомлі рабіў апісанні мінскіх храмаў для яго нарыса «Мінск», занатаваў шмат дэталяў пра аздабленне інтэр'ераў катэдры. Чаму катэдры? Па скасаванні ордэна езуітаў у 1773 годзе касцёл робіцца прыходскім (а калегіум — 6-гадовай свецкай школай). А пасля таго, як Мінск падпаў пад расійскае панаванне, з утварэннем Мінскай каталіцкай дыяцэзіі, па ўказе Паўла I храм атрымаў статус катэдральнага. Адбылася яго рэкансэкрацыя пад тытулам св. Дзевы Марыі.

У катэдры да XIX стагоддзя сабраўся сапраўдны музей. У закрыстыі — партрэты дабрачынцаў езуітаў: віленскага біскупа Канстанты Бжастоўскага, Сымона Міхоўскага, канцлера Марцыяна Агінскага, Марціна-Казіміра Валадковіча… На сценах — стацыі Хрыстовай пакуты, копіі з палотнаў італьянца Дамінікіна, вывезеныя з Нясвіжа часоў Караля Станіслава Радзівіла, «Пане Каханку». Нарэшце, 4 арыгіналы і адна ўдалая копія твораў выдатнага польскага мастака, выхаванца Акадэміі св. Лукі ў Рыме Шымана Чаховіча (1689–1775). Гэта былі вобразы святых Юзафа, Барбары (пры бакавых алтарах, на месцы колішніх амбонаў, з якіх праводзілі дыспуты езуіты), Яна і Тадэвуша.

Паколькі ў часы савецкага варварства храм быў зачынены (1934), а яго інтэр'еры і начынне канчаткова знішчаны перабудовай 1951 года, якасць жывапісу Чаховіча раім уявіць па карціне «Палажэнне ў труну» (1731) з Краўскага нацыянальнага музея. Шмат новага ў храме з'явілася пры першым біскупе Мінскай дыяцэзіі Якубу Дадэрку, які аднаўляў будынак пасля моцнага пажару 1797 года. Усе скляпенні трох нефаў, сцены і калоны каркцыямі і сімваламі з Новага запавету, а таксама надпісамі і арнаментамі ўпрыгожыў лепшы мінскі мастак Казімір Анташэўскі.

Сёння роспісы часткова адрэстаўраваныя. У інтэр'ерах знаходзіліся творы слыннага майстра Іосіфа Аляшкевіча і работы менш вядомых мастакоў — Ігнацыя Дарэцці, Якуба Бразера. На высокіх хорах усталявалі арганы «на 24 галасы, выдатнай архітэктуры».

Калі горад па складзе насельніцтва ўсё болей рабіўся габрэйска-расійскім, катэдра заставалася сімвалам даўняга часу, архітэктурнай дамінантай і мастацкай візітоўкай Мінска. Яе велічнае аблічча адбілася на многіх творах — малюнках Іосіфа Пешкі, Напалеона Орды, літаграфіі Леона Жана Бапціста Сабацье па малюнку Б. Лаверня. На апошняй, датаванай 1840 годам, — панарама ўсёй плошчы Высокага рынку, з ратушай і пірамідальнымі таполямі. За 17 гадоў да таго, як «хамская ўлада» з Усходу ў асобе Аляксандра II Раманава загадае знішчыць ратушу — бо, па ўспамінах сучаснікаў, «яна сваім існаваннем нагадвала жыхарам пра звычаі мінулага часу, пра Магдэбургскае права». Сквер зруйнуюць таксама.

### Як фенікс…

Рыхтуючыся да 300-годдзя катэдры, мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч так сказаў пра храм: «Знішчаны, зняважаны і пакінуты на небыццё, ён адраджаецца, як фенікс з попелу. На гісторыі гэтай нашай галоўнай святыні вельмі добра бачна, як Хрыстос піша проста на крывых лінейках гісторыі і як Ён ставіць апошнюю кропку над «і».

Нашчадкі Аляксандра II з Ленінграду, «аднаўляючы» наш горад пасля другой сусветнай вайны, пераўтварылі касцёл у спартовую залу. А перад тым храм зачынілі. Паралельна зруйнаваўшы мноства іншых святыняў і амаль увесь стары горад. Ёсць унікальны здымак канца чэрвеня 1941 года — мінчукі моляцца ў катэдры.

Тое, што касцёл св. Дзевы Марыі аднавіўся толькі пасля знікнення савецкай імперыі, уключае яго ў шэраг вобразных сімвалаў беларускай свабоды і незалежнасці. 21 кастрычніка 1997 года касцёл нанова кансэкравалі.

10 снежня 2005 года адбыліся ўрачыстае асвячэнне ўзноўленага галоўнага алтара святыні і каранаванне абраза Імя Марыі Беззаганна Зачатай — дару Яна Паўла II. Таксама былі асвечаны новыя арганы, пабудаваныя аўстрыйскімі майстрамі.

Пакуль не ўсе сімвалы свабоды і незалежнасці вернутыя, але ўжо ёсць дзе памаліцца за вяртанне астатніх.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ШТО СЛУХАЮЦЬ БЕЛАРУСЫ ПОЛЬШЧЫ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Сродкі масавай інфармацыі і наша выданне паведамлялі, што ў канцы мінулага месяца ў сталічнай галерэі «Ў» адбылася прэзентацыя новай версіі сайта Беларускай інтэрнэт-бібіятэкі (Kamunicat.org), на якой прысутнічалі супрацоўнікі гэтага рэсурсу пад кіраўніцтвам Яраслава Яванюка. Сярод прыемных нечаканасцяў прэзентацыі было і знаёмства мінчукоў з навінкамі беластоцкай кніжнай і музычнай культуры.**







Сапраўды, новыя беларускія кнігі і дыскі з Беласточчыны сведчыць пра пашырэнне выдавецкай актыўнасці беларусаў Польшчы. А з'яўленне выдатных па якасці запісу і выкананых у форме дыгіпакаў дыскаў выканаўцаў Беласточчыны распавядаюць пра ўвагу і падтрымку ўладаў краіны музычнай творчасці беларусаў Польшчы.

## Абудзіць душу беларуса

Няма лепшага сродку для гэта, як паслухаць ці заспяваць песню «нашу не чужую, не з шырокіх вуліц ды эстрад...» (Л. Геніюш). Тым больш, што фальклор Падляшша вельмі багаты і разнастайны. З мэтай папулярызацыі беларускай песні і спеўнай культуры рэгіёну, твораў беларускіх кампазітараў-прафесіяналаў у 1990 годзе ў Бельску-Падляскім быў створаны аматарскі калектыў беларускай песні «Маланка», якім кіруе Сяргей Латышонак.

Менавіта праз беларускую мелодыку ўдзельнікі «Маланкі» імкнуцца паказаць слухачам прыгажосць роднага слова, давесці тое, што беларуская культура мае вялікі патэнцыял і перспектыву развіцця. А яшчэ, што народная спеўная творчасць можа стаць жыццёвай крыніцай натхнення для многіх пакаленняў беларусаў Беласточчыны.

Нягледзячы на модны сёння «рэвалюцыйны» падыход да фальклору, яшчэ шмат беларусаў у дыяспары аддаюць перавагу традыцыйнаму выкананню народнай песні. Такі метад быў запатрабаваны ў мінулым, дастаткова вынікова ён і цяпер. І гэта цікаўнасць да традыцыі падкрэслена зместам дыска «Родная хата» гурта «Маланка». Кожная песня дыска «Родная хата» — своеасаблівая споведзь беларуса, у якой ёсць падказка землякам наконт таго, што праз спеў і гукі роднай мовы можна абудзіць самыя прыціснутыя нацыянальныя пачуцці.

Менавіта такой кампазіцыяй у поп-фальклорнай стылістыцы адкрываецца дыск. Гэта спеў «Сустрэча з домам», якая належыць аўтарству кампазітара Івана Раманчука на верш Ніны Гарагляд. Простыя словы гэтай песні прымушаюць яшчэ раз агледзіцца на акалічнасці жыцця і знайсці згубленае пачуццё каранёў менавіта на той зямлі, якая завецца малой радзімай.

Цікава, што песня «Сустрэча з домам», створаная ў метраполіі, была заўважана і па-свойму пераасэнсавана выканаўцамі з дыяспары. Знаёмымі нам падаюцца і некаторыя іншыя творы дыска: «Заручыны», «А ў садзе рэчанька», «Гэй вы, коні»... Іх адрозніваюць інструментальныя апрацоўкі, да якіх маюць дачыненне акардыяністы Веслаў Далінскі і Андрэй Нікіцюк, басіст Кшыштаф Нявінскі, скрыпачка Багуміла Кісель, кіраўнік гурта, скрыпач Сяргей Лукашук, іншыя спевакі (а іх у «Маланцы» трынаццаць чалавек!) і музыкі. Своеасаблівы спеўны каларыт песням «Маланкі» надае моцны голас вакалісткі калектыву Святланы Кобус. Найбольш яскрава яе талент быў зафіксаваны ў кампазіцыі «Маладзіца», у якой спявачцы ўдалося перадаць шчырыя жаночыя пачуцці з найбольшай адпаведнасцю музычнаму матэрыялу песні.

Моцнымі чалавечымі пачуццямі, якія будуць зразумелыя і беларусам, і палякам, адрозніваецца песня ў выкананні «Маланкі», якая дала назву гэтаму незвычайнаму дыску — «Родная хата» на музыку Л. Захлеўнага, на верш А. Роўды. Думаю, гэты твор, так далікатна і вытанчана выкананы нашымі землякамі, распавядзе пра іх шчырыя пачуцці, звязаныя з Беларуссю.

## Барды розных краін, яднайцеся!

Менавіта для таго, каб пазнаёміць землякоў з суайчыннікамі з метраполіі, а заадно і скіраваць іх творчасць у нацыянальнае рэчышча, беларусы Беласточчыны ініцыявалі шэраг музычных фэстаў. Сярод іх нельга не ўспомніць грандыёзныя агульнапольскі фестываль «Беларуская Песня», які ў мінулым годзе адбыўся ажно ў саракавы раз! Маюць сваю даўнюю гісторыю і фэсты, скіраваныя на моладзевую аўдыторыю. Гэта і знакамітае «Басовішча», а таксама фестываль аўтарскай песні «Бардаўская восень», які праводзіць Звяз беларускай моладзі.

У адрозненне ад «Басовішча», якое апошнім часам неабгрунтавана змяніла свой беларускамоўны фармат, «Бардаўская восень» застаецца надзейнай трыбунай аўтараў і выканаўцаў, арыентаваных на роднае слова. І сведчаннем гэтай пазіцыі з'яўляецца дыск па старонках фестывалю — «Бардаўская восень».

**Нягледзячы на модны сёння «рэвалюцыйны» падыход да фальклору, яшчэ шмат беларусаў у дыяспары аддаюць перавагу традыцыйнаму выкананню народнай песні**

На яго трэках сабраны шэраг твораў беларускіх бардаў, выкананых імі падчас мінулагодніх канцэртаў «Бардаўскай восені». Гэтая акалічнасць некалькі зніжае вартасць запісаў для слухачоў з Беларусі. А вось для беластоцкіх аматараў спеваў пад гітару гэты дыск будзе сапраўдным падарункам. Бо тут пад адной вокладкай сабраны шмат папулярных выканаўцаў, у тым ліку і лаўрэатаў фэсту, што робіць выданне вельмі карысным для маладых беларусаў Падляшша. Тут можна пазнаёміцца з бардаўскім амплуа ў творчасці знанага Лявона Вольскага, гурта «Босае Сонца», Змітра Вайцюшкевіча і яго «WZ-Orkiestra». Іх песні запісаны непасрэдна з фестывальных канцэртаў «Бардаўскай восені».

Сваім песенным скарбам дзеляцца з беластоцкімі беларусамі і іншыя беларускія барды — Андрэй Мельнікаў, Віктар Шалкевіч і Кася Камоцкая, а таксама маладая, але перспектыўная спявачка Дар'я Кадамская. Не ўсе песні гэтага блока маюць аднолькавую мастацкую якасць (сэнсава выпадае з праграмы дыска «Аку-аку» Л. Вольскага), але, безумоўна, гэтыя творы стануць для беластоцкіх слухачоў крокам да адкрыцця цэлага напрамку ў сучаснай музычнай культуры Беларусі. Не будзе сорамна мясцовым беларусам і за творчасць сваёй знанай землячкі Ілоны Карпюк, якая запачаткавала новы музычны праект — гурт «ILO&Friends». У мяккім, ненавязлівым гучанні тут прадстаўлена вядомая ўжо ў Беларусі кампазіцыя «Сыну», а таксама варыянт апрацоўкі фальклорнай песні «Туман ярам». Але каб больш падрабязна пазнаёміцца з песнямі і гучаннем «ILO&Friends», трэба слухаць іншы дыск — дэбютны альбом «Па дарозе».

## Па дарозе ад «5set5» да «ILO&Friends»...

Бадай, адзін з самых цікавых заняткаў для крытыка — сачыць за шэрагам музычных падзей на Беласточчыне, за зменай тэматыкі лірыкі і стылістыкі гучання тамтэйшый выканаўцаў. Тут адбываюцца даволі цікавыя і неардынарныя трансфармацыі, якія сведчаць на карысць вартых перспектываў беларускамоўнага рок-руху па той бок Буга.

Адной з такіх падзей стала з'яўленне на беластоцкай рок-сцэне гурта «ILO&Friends», які можна з вялікай доляй упэўненасці назваць музычным працягам вядомай беларуска-польскай каманды «5set5». Альбом гурта «Х» быў прадстаўлены ў нашым выданні («Новы Час» №18 ад 6.06.2008 г.) Аб'ядноўвае гэтыя фармацыі асоба аднаго лідэра і вакалісткі — Ілоны Карпюк. Але ў адрозненне ад напружанага вакалу, які суправаджаецца «цяжкімі металічнымі» рытмамі «5set5», музыка «ILO&Friends» — светлая, акустычна-камерная, якая запрашае да суперажывання і эмацыйнага ўспрыняцця.

У гэтым сэнсе вельмі паказальнай на дыску можна назваць кампазіцыі «Па дарозе», «Сцяна», у якіх інструментальнае суправаджэнне (асабліва тут запамінаюцца шчымлівыя сола духавых інструментаў) дапамагае асэнсаваць пачуццёвасць песні Ілоны.

Зусім іншыя аранжыроўкі выкарыстаны ў «Танга». Нагадаю, што сярод удзельнікаў «ILO&Friends» заўважаны музыкі гурта «RIMA» Марцін Кахановіч і Андрэй Грэсь. Дзякуючы іх выканаўчай разнастайнасці ў песні дамінуе кабарэтовая хітовасць, любоўныя жарсці і спадзяванні жаночага сэрца...

Але ўдзельнікі «ILO&Friends» ствараюць кампазіцыі не толькі на свае вершы, але і на творы класікаў беларускай паэзіі. Напрыклад, Караткевіча ці Сыса. Адна з такіх кампазіцый — «26.10.2007» на верш Анатоля Сыса «Калі краты распілаваць...» Па сваёй рэалізацыі гэтая кампазіцыя нагадвае меладычную чытанку, чым песню ў поўным разуменні вызначэння. Але паэтыка сысоўскіх радкоў у ёй расквітае шчырай і неардынарнай кампазіцыяй — эмацыянальным пікам альбома «Па дарозе».

Неардынарны падыход гурта «ILO&Friends» да фальклорных апрацовак выявіўся падчас працы над трэкам «U vioscy», якая больш вядомая слухачам пад назвай «Вясна-вясна». Але гэта зусім аўтаномная версія народнай мелодыі (тое ж можна казаць і пра апрацоўку песні «Туман ярам»), якая можа прадставіць беластоцкі гурт, як з'яву беларускага фолк-мадэрну. Значыць, ёсць падстава для арганізатараў фолк-фэстаў у Беларусі запрасіць беластоцкіх музыкаў у госці. Гэта і будзе прыкладам творчай узаемадапамогі дыяспары і нацыянальнай метраполіі.

МОВА

# ФАТАЛЬНЫ ВЫНІК НЕ ПРАГНАЗУЕЦЦА

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Перапіс насельніцтва засведчыў істотнае скарачэнне прыхільнікаў беларускай мовы. Усяго за дзесяць гадоў колькасць тых, хто лічыць роднай мовай беларускую, скарацілася на 20,5 працэнта і склала 53,2 працэнта. Тым не менш, завітаўшы ў Таварыства беларускай мовы, там не давялося пачуць змрочных прагнозаў наконт яе знікнення.**

## З пасіву ў актыў

Філолаг і журналіст Аляксей Шэін ладзіць у ТБМ курсы беларускай мовы. Нядаўна распачала заняткі новая група. У самым прасторным памяшканні, дзе яны адбываюцца, ледзь можна знайсці свабоднае месца. Навучэнцы ў асноўным — моладзь. Ёсць і пенсіянеры, ёсць сярэдняга веку. «Амаль усе — гэта рускамоўныя людзі, якія хацелі б пачаць гаварыць па-беларуску», — адзначыў выкладчык. Таму і ўзніклі гэтыя курсы.

«Непасрэдна дзяржава для таго, каб такім людзям дапамагчы перайсці на беларускую мову, ніякіх паслуг не прапануе. Напрыклад, курсаў, якія ёсць ва Украіне, у Прыбалтыцы. Там дзяржава займаецца пытаннем распаўсюду мовы. У нас гэта больш справа грамадскіх арганізацый ці асобаў», — кажа Аляксей.

Практычна ва ўсіх, хто прыходзіць на курсы, беларуская мова ёсць у пасіве. Яны па-беларуску разумеюць, але не гавораць. «І задача курсаў — вывесці мову з пасіву ў актыў, — паведаміў выкладчык курсаў. — Даць неабходны базавы запас лексікі і пераадолець псіхалагічны бар'ер, каб чалавек пачаў гаварыць па-беларуску. Як паказвае досвед, двае-тры месяцы — гэта дастатковы тэрмін, каб рускамоўны беларус перайшоў на беларускую мову».

Не абыходзіцца і без перасцярогаў: як паглядзяць сябры і калегі, што ты пачнеш размаўляць з імі на беларускай мове? Напрыклад, адна з дзяўчат казала, што ў яе вялікая колькасць сяброў, і яны яе не зразумеюць. А праз некалькі тыдняў распавядала, якім для яе было нечаканым адкрыццём, што сябры сталі яе толькі больш паважаць за беларускую мову. І нават цікавяцца, задаюць ёй пытанні. А яна думала, што, наадварот, будуць праблемы.

Ні для каго не сакрэт, што сённяшні стан беларускай мовы — гэта наўпрост вынік дзяржаўнай палітыкі. Выправіць становішча магчыма, калі зменіцца палітычная сітуацыя і адпаведна стаўленне дзяржавы да беларускай мовы.

«Безумоўна, пераломным момантам будзе навучанне дзяцей па-беларуску ў школе, — падкрэсліў Аляксей Шэін. — І першае пакаленне, якое скончыць школу з першага да адзінаццатага класу па-беларуску, будзе пераломным у працэсе беларусізацыі. Вось гэта будзе першае пакаленне, якое загаворыць па-беларуску. І тады ўжо шлях будзе толькі адзін — на пашырэнне беларускай мовы».

## За словам — справа

Як распавялі ў ТБМ, да іх прыходзіць многа маладых людзей. Тэму «Беларуская мова і сучасная моладзь» абмяркоўвалі на днях на паседжанні дыскусійнага клуба ТБМ. «Нашы планы ў тым, каб моладзь пачувала сябе цікава, каб яна імкнулася сама сябе рэалізаваць менавіта з беларускай мовай. Трэба ў гульнях, значыць, рэалізаваць у гульнях — трэба ў нейкіх інтэрактыўных дыспутах — значыць, і гэта праводзіць», — адзначыла намеснік старшыні ТБМ Алена Анісім.

Так, нядаўна адбылася прэзентацыя беларуска-англійскага і англійска-беларускага размоўніка. Гэту ідэю здзейсніла менавіта моладзь. Падрыхтавана і яшчэ адна версія: для нямецкай мовы, а таксама распачата праца над шведскім размоўнікам. Вынашваецца ідэя правядзення беларускамоўных інтэлектуальных гульняў кшталту «Дзе? Што? Калі?». Многія маладыя людзі зараз уключыліся ў пераклады фільмаў. Яны робяцца не пад эгідай ТБМ, але сябрамі ТБМ. Паэтычныя слэм-батлы, падтрымка юных паэтаў, сацапытанні сярод маладых людзей і шмат іншае — такія прапановы паступаюць ад моладзі.

Тым не менш, у ТБМ не ідэалізуюць моўную сітуацыю. «Насамрэч вельмі важна, што абазначаны пагрозы, каб мы цвяроза ўсведамлялі ўсю небяспеку, — выказала сваё стаўленне да выніках перапісу Алена Анісім. — Бо менавіта са знікненнем мовы мы папросту адчынаем вароты сваёй краіны наросхрыст. А нейкага фатальнага выніку я не прагназую. Будзе так, як мы зробім».

**P.S.** Тыя, хто жадае наведваць курсы беларускай мовы ў мінскай сядзібе ТБМ, могуць звярнуцца за інфармацыяй на маб. тэл. 8 029 651 26 65 (Аляксей Шэін). Заняткі праходзяць кожную сераду ў 18.30 (вул. Румянцава, 13).

Курсы беларускай мовы распачне і мінскі Чырвоны касцёл (касцёл святых Сымона і Алены). Пачатак заняткаў а 17-й гадзіне ў нядзелю (другі паверх — уваход адразу з вуліцы з боку Дома ўрада ці праз канцылярыю касцёла на першым паверсе).




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1029

Падпісана да друку 15.10.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.